Л. У. ГАЎРЫЛАВЕЦ, М. М. МЯЗГА, Т. М. СЫМАНОВІЧ

# ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ
## (IX ст. — 1569 г.)



Л. У. Гаўрылавец, М. М. Мязга, Т. М. Сымановіч

# ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ

## (IX ст. — 1569 г.)

Дапаможнік для педагагічных работнікаў
устаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

*Рэкамендавана*
*навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск

Нацыянальны інстытут адукацыі
2023

УДК 373.5.016:39(476)
ББК 74.266.35(4Беи)
Г24

Р э ц э н з е н т ы:

лабараторыя гісторыка-грамадазнаўчай і сацыякультурнай адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (доктар гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі *С. М. Цемушаў*);

класны кіраўнік, настаўнік гісторыі кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 37 г. Мінска» *Н. В. Гошка*

**Гаўрылавец, Л. У.**

Г24 Духоўная спадчына Беларусі (IX ст. — 1569 г.) : дапам. для пед. раб. уст. адукац., якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукац., з беларус. і рус. мовамі навучання і выхавання / Л. У. Гаўрылавец, М. М. Мязга, Т. М. Сымановіч. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023. — 200 с. : іл.

ISBN 978-985-893-505-4.

Дапаможнік змяшчае звесткі пра духоўную спадчыну беларускіх зямель перыяду першых дзяржаўных утварэнняў і часоў ВКЛ. Тэарэтычны і ілюстрацыйны матэрыял дапаможніка дазволіць ахарактарызаваць духоўнае развіццё продкаў сучасных беларусаў, асэнсаваць ролю духоўнай спадчыны часоў Сярэдневякоўя і Ранняга Новага часу ў сучасным свеце. У дапаможніку змешчаны метадычныя рэкамендацыі, якія дазволяць арганізаваць эфектыўную працу вучняў на факультатыўных занятках.

Адрасуецца педагагічным работнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**УДК 373.5.016:39(476)**
**ББК 74.266.35(4Беи)**

**ISBN 978-985-893-505-4**

© Гаўрылавец Л. У., Мязга М. М., Сымановіч Т. М., 2023
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

# Слова да педагагічных работнікаў

Шаноўныя педагагічныя работнікі! Вы трымаеце ў руках дапаможнік, прысвечаны вывучэнню духоўнай спадчыны нашай Радзімы — Рэспублікі Беларусь. Яго мэта — стварэнне дыдактычных умоў для станаўлення творчай асобы, якой уласцівы крытычнае мысленне, здольнасць вызначаць кірункі сваёй самарэалізацыі на аснове ведаў пра духоўнае развіццё чалавека, грамадства і ўключацца ў прадукцыйную стваральную дзейнасць.

Метадалагічнай асновай зместу дапаможніка з'яўляецца сістэмна-дзейнасны падыход. У адпаведнасці з ім галоўнай развіваючай мэтай адукацыі прызнаецца развіццё актыўнасці вучня. Гэта значыць, што веды не перадаюцца яму ў гатовым выглядзе, іх давядзецца здабываць самастойна падчас пазнавальнай дзейнасці. У сувязі з гэтым змяняецца і характар узаемадзеяння вучня з педагогам і аднакласнікамі: яно прымае характар супрацоўніцтва.

У дапаможніку «Духоўная спадчына Беларусі (IX ст. — 1569 г.)» вучням прапануюцца розныя па форме заданні, якія прадугледжваюць параўнанне, ацэньванне, тлумачэнне, раскрыццё сутнасці гістарычных, культурных і прыродных падзей і з'яў; задачы для праектнай і творчай дзейнасці, у тым ліку з выкарыстаннем электронных аб'ектаў. Некаторыя з такіх заданняў разлічаны на працяглы час выканання і патрабуюць прыцягнення дадатковых крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, рэсурсаў сеткі інтэрнэт). Над імі мэтазгодна працаваць калектыўна з дапамогай метаду

праектаў. Па жаданні педагагічны работнік можа выкарыстоўваць іншыя заданні, у тым ліку ўласныя, замест прапанаваных у дапаможніку.

У параграфы дапаможніка ўваходзяць рубрыка «Матэрыялы да заняткаў», метадычныя рэкамендацыі для педагагічных работнікаў, матэрыялы для вучняў, пералічаны прыёмы і формы іх пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці.

Змест дапаможніка непарыўна звязаны з гісторыяй Беларусі, мастацтвам, беларускай літаратурай, інфарматыкай, таму падчас выканання заданняў вучняў неабходна арыентаваць на раней вывучаны ў межах гэтых прадметаў матэрыял.

## Метады і прыёмы арганізацыі факультатыўных заняткаў[1]

Пры ажыццяўленні адукацыйнага працэсу варта праводзіць факультатыўныя заняткі выхаваўчай скіраванасці. Заняткі — гэта дынамічная варыятыўная форма мэтанакіраванага ўзаемадзеяння педагога і вучняў, якая складаецца са зместу, формы, метадаў, сродкаў навучання і сістэматычна выкарыстоўваецца для вырашэння адукацыйных і выхаваўчых задач.

[1] Методический инструментарий классного руководителя / Н. К. Катович [ и др.]. — Минск : Национальный институт образования, 2021. — 192 с.; Воспитание младших подростков в современной школе : пособие для пед. учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / А. А. Глинский [и др.]. — Минск : Национальный институт образования, 2020. — 160 с.; Преподавание истории в школе. Теория и практика / Л. А. Козик, С. А. Кудрявцева. — Минск : Аверсэв, 2022. — 240 с.; Методика создания интерактивных презентаций в PowerPoint / Н. М. Шевченко-Савлакова. — Минск : РИПО, 2020. — 51 с.; Вывучэнне пытанняў культуры на ўроках гісторыі Беларусі ў 8 класе : дапам. для педагогаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. А. Кудраўцава. — Мінск : ВЦ БГУ, 2020. — 151 с.; Задачи по истории Беларуси (с древнейших времен до конца XV в.) : пособие для 6 кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Г. Э. Давидовская, З. Е. Вино-

## Метады арганізацыі факультатыўных заняткаў

Методыка правядзення факультатыўных заняткаў не павінна капіраваць методыку звычайнага ўрока. Спецыфіка першых выяўляецца перш за ўсё ў нетрадыцыйным спалучэнні адмысловага зместу вучэбнага матэрыялу, метадаў і форм навучання. Факультатыўныя заняткі дазваляюць больш эфектыўна карыстацца *эўрыстычным метадам*, які прадугледжвае самастойнае асваенне вучнямі новага матэрыялу.

**Праектны метад навучання.** Праект — гэта выкананне невялікімі калектывамі вучняў даследчых заданняў з абавязковым адборам звестак з розных крыніц. Гэты метад накіраваны на павышэнне цікавасці выканаўцаў да гісторыі, культуры, краязнаўства малой радзімы і Беларусі ў цэлым і фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі падрастаючага пакалення.

Вучні разам з педагогам складаюць інфармацыйную карту, якая ўключае назву, мэту і задачы праекта, тэрмін яго рэалізацыі, звесткі пра адрасата, колькасць удзельнікаў, узровень рэалізацыі, умовы паспяховасці, чаканыя вынікі.

**Міні-праекты.** На занятках можна выкарыстоўваць тэхналогію французскіх педагагічных майстэрняў (або яе асобныя элементы). Яна ўключае 7 асноўных этапаў.

---

градова. — Минск : Экоперспектива, 2019. — 64 с.; Методыка навучання гісторыі ў школе ў апісаннях, схемах і табліцах / І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк. — Мінск : БДПУ імя М. Танка, 2017. — 204 с.; Фарміраванне вобразных уяўленняў у вучняў 6—7 класаў пры вывучэнні гісторыі Беларусі : дапаможнік для педагогаў / Г. Э. Давідоўская, З. Я. Вінаградава. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2019. — 152 с.; Современный урок : подходы к моделированию, проведению и рефлексии : метод. пособие / З. Н. Булахова. — Минск : Зорны Верасок, 2016. — 94 с.; Игровые технологии на уроках / сост. : С. П. Жолондевская, С. А. Скарюкина, Л. В. Сошнева. — Минск : Красико-Принт, 2013. — 126 с.; Игра как метод интерактивного обучения : учеб. пособие для преподавателей / И. В. Нигматуллина. — М. : Прометей, 2018. — 60 с.

*Індукцыя.* Сутнасць этапу ў эмацыянальнай настройцы вучняў на цікавую працу, у матывацыі да творчасці. Галоўны рэсурс — індуктар, у ролі якога выступае любы інфармацыйны сігнал (малюнак, прадмет, слова, тэкст, гук). Яго задача — выклікаць у вучняў пэўныя асацыяцыі.

*Дэканструкцыя* — няздольнасць з дапамогай існуючых сродкаў выканаць заданне. На гэтым этапе з дапамогай прапанаванага матэрыялу фарміруецца інфармацыйнае поле.

*Рэканструкцыя.* Пасля дэканструкцыі трэба пераўтварыць інфармацыйнае поле ў праект вырашэння праблемы. Такім чынам, варта правесці абмеркаванне і вылучэнне гіпотэзы, прадстаўленай у творчых праектах: малюнках, тэкстах, вершах і г. д.

*Сацыялізацыя.* Вучні супастаўляюць матэрыял, які ў іх атрымаўся, з вынікамі працы іншых груп, робяць вывады, выяўляюць заканамернасці і сувязі. На гэтым этапе на ўсіх даецца адно заданне, адказы агучваюцца.

*Афішыраванне* — гэта прэзентацыя вынікаў працы ў тых жа схемах, праектах, малюнках. Свой матэрыял вучні павінны абараніць.

*Разрыў* з’яўляецца кульмінацыяй працэсу творчасці. Вучні шырэй глядзяць на свае веды і разумеюць, што ўсе разгадкі наперадзе, у іх абуджаецца цікавасць да далейшага пазнання.

*Рэфлексія.* На гэтым этапе вучні аналізуюць сваю дзейнасць на занятках, ступень задаволенасці працай, эмацыянальны стан.

Прыклад заняткаў з выкарыстаннем тэхналогіі французскіх педагагічных майстэрняў размешчаны ў тэме 22.

Для матывацыі ў пачатку заняткаў вучням можна прапанаваць разгадаць крыжаванку. Напрыклад:

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | $^{1}$**Г** | о | р | а | д |
| | | | $^{2}$М | **е** | н | к | а | |
| | | $^{3}$Т | у | **р** | а | ў | | |
| $^{4}$В | і | ц | е | **б** | с | к | | |

1. Месца, якое ў старажытныя часы ўмацоўвалася і мела сваё кіраванне.
2. Назва ракі, на якой быў пабудаваны горад Мінск.
3. Старажытны горад, цэнтр Тураўскага княства.
4. Назва горада, узнікненне якога звязваюць з рэчкай Віцьбай.

Падчас працы на этапе «Рэканструкцыя» вучням мэтазгодна задаваць пытанні: «Што такое герб?», «Якое значэнне меў герб для горада?».

На этапе «Афішыраванне» варта арганізаваць прэзентацыю праектаў, прысвечаных гербам гарадоў. Кожная група вучняў прадстаўляе герб пэўнага населенага пункта (напрыклад, Полацка, Віцебска, Брэста, Гродна).

На этапе «Сацыялізацыя» вучні павінны выканаць тэставае заданне і супаставіць матэрыял, які атрымаецца, з вынікамі працы іншых груп.

1. Як называецца знак, які акрэслівае пэўную прыналежнасць асобы, горада або дзяржавы?
   а) шчыт; б) сімвал; в) герб; г) знак.
2. Які горад мае на гербе выяву аленя, які бяжыць?
   а) Віцебск; б) Полацк; в) Гродна; г) Брэст.
3. Што азначае выява стралы на гербе горада Брэста?
   а) паляванне; б) гандаль; в) абарона краіны; г) занятак.
4. Герб якога горада мае абарончую і рэлігійную сімволіку?
   а) Віцебск; б) Полацк; в) Гродна; г) Брэст.
5. Дзе будаваліся гарады, на гербах якіх адлюстраваны пруснік?
   а) на ўзгорках; б) каля рэк; в) у акружэнні лясоў; г) на балоце.
6. Які рэлігійны вобраз паказаны на гербе горада Віцебска?
   а) Багародзіца; б) Спас Збавіцель; в) св. Георгій; г) ап. Пётр.

**Метады інтэрактыўнага навучання.** Сюды адносяцца метады, якія спрыяюць уцягванню вучняў у актыўны працэс атрымання і замацавання ведаў: мазгавы штурм, міні-лекцыя, распрацоўка праекта, інсцэніроўка, выступленне ў ролі педагога і інш. У аснове такіх падыходаў да зместу навучання — распрацоўка для вучняў інтэрактыўных заданняў. Іх асноўнае адрозненне ад звычайных задач — у накіраванасці на вывучэнне новага матэрыялу, а не на замацаванне ўжо вывучанага.

*Мазгавы штурм* — метад, падчас якога ўдзельнікі абмеркавання генерыруюць максімальную колькасць варыянтаў рашэння задач. Потым выбіраюць з іх лепшыя, прыдатныя для выкарыстання на практыцы. Гэты метад просты і даступны ва ўжыванні. Ён дазваляе знайсці альтэрнатыўныя спосабы рашэння задач за кароткі тэрмін, матывуе вучняў, спрые развіццю іх творчага мыслення, уплывае на згуртаванасць удзельнікаў каманды і эфектыўнасць іх працы.

*Міні-лекцыя* — метад апавядальнага выкладання новага матэрыялу. Каб падрыхтаваць вучняў да ўспрымання інфармацыі, перад міні-лекцыяй педагог праводзіць ролевыя гульні. Працягласць міні-лекцыі складае ў сярэднім 10—15 мінут і не павінна перавышаць 20 мінут. За гэты час педагог дае ўвесь неабходны матэрыял па выбранай тэме. Для яго ілюстравання можна выкарыстоўваць наглядныя сродкі: выпісваць на дошку ключавыя фразы, рабіць малюнкі — маркеры для запамінання, прапаноўваць метафары, у якасці якіх могуць быць прытчы, прымаўкі.

*Інсцэніроўка* — метад актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў, які заключаецца ў разыгрыванні эпізоду з жыцця або літаратурнага твора. Можна выкарыстоўваць загадзя падрыхтаванае інсцэніраванне заняткаў або імправізаванае, якое ўнікае нібыта выпадкова падчас абмеркавання вызначаных вучэбных праблем.

## Метадычныя прыёмы

Кожны з метадаў рэалізоўваецца на практыцы з дапамогай прыёмаў. Метадычныя прыёмы — гэта элементы таго ці іншага метаду, якія адлюстроўваюць асобныя дзеянні педагога і вучняў у працэсе навучання. Яны не маюць сваёй самастойнай задачы.

*Праца ў групах.* У яе аснове — тэкст, падзелены на сэнсавыя часткі, з якімі вучні будуць працаваць у групах на працягу 5—10 мінут. Кожная група атрымлівае заданні да пэўнай часткі. Кожны ўдзельнік групы абавязаны прапрацаваць адно з іх самастойна, пазнаёміць з вынікамі групу, а потым прыняць удзел у выніковай прэзентацыі.

*Сітуацыйная задача* — метадычны прыём, які ўключае ў сябе сукупнасць умоў, накіраваных на вырашэнне практычна значнай сітуацыі з мэтай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці. Ён разглядаецца таксама як форма кампетэнтнасна арыентаваных заданняў, якія мадэлiруюць пэўную жыццёвую сітуацыю і грунтуюцца на актуальным для вучняў матэрыяле.

*Завочная экскурсія* — метадычны прыём, які накіраваны на актыўнае эмацыянальнае знаёмства вучняў з умовамі жыцця, побытам, звычаямі, культурай мінулага і арганічна спалучае ў сабе расказ педагога, наглядны матэрыял і гукавое афармленне.

Правесці завочную экскурсію можна падчас знаёмства з тэмай 19. Педагог арганізоўвае вандроўку па маршруце Камянецкая вежа — Лідскі замак — Гродзенскі замак — Навагрудскі замак. У час экскурсіі звяртаецца ўвага на месца знаходжання замкаў, абарончы характар іх збудаванняў. Вучні знаёмяцца з умовамі жыцця гаспадароў палацаў, цікавымі паданнямі і інш. Пасля экскурсіі вучням прапаноўваецца напісаць водгук па плане:

1. Уступ: асабістае ўражанне ад экскурсіі.
2. Асноўная частка: што спадабалася і зацікавіла, пра якія факты пачулі ўпершыню.
3. Заключэнне: ці карыснай была экскурсія.

*Вуснае маляванне*, або вуснае слоўнае маляванне, прадугледжвае актывізацыю чытацкіх бачанняў вучняў. Перад дзецьмі ставіцца задача апісаць вобразы або карціны, якія ўзнікаюць у іх падчас чытання літаратурнага твора або яго часткі. У межах факультатыўных заняткаў можна прапанаваць ахарактарызаваць архітэктурныя помнікі.

Вучні рыхтуюць расказы па тэмах: «Замкі-кастэлі», «Гатычныя храмы». Заданне выконваецца ў групах. Кожная група атрымлівае картку з выявай замка (храма) і апорнымі словамі.

**Памятка вуснага слоўнага малявання па тэме «Замкі Беларусі»**

- Творча перакажыце гісторыю ўзнікнення замка (храма);
- успомніце легенды пра ўладальнікаў замкаў або цікавыя гісторыі, звязаныя з пэўным архітэктурным будынкам;
- пазнаёмцеся з сучаснай гісторыяй архітэктурнай пабудовы;
- выкарыстоўвайце апорныя словы і выразы;
- вызначыце спецыфічныя для кожнага віду мастацтва сродкі выразнасці;
- падзяліцеся агульным уражаннем ад знешняга выгляду помніка.

## Формы адукацыйнага працэсу на факультатыўных занятках

Да асноўных форм адукацыйнага працэсу адносяцца заняткі з элементамі лекцыі, гутаркі, віктарыны, гульні і інш.

У *гутарцы* можа ўдзельнічаць пераважная большасць вучняў. Падчас яе зносіны педагога і вучняў становяцца больш непасрэднымі. Гутарка на факультатыўных занятках мае

ўніверсальны характар, а ўжыванне эўрыстычнага метаду, праблемных заданняў, арганізацыя пошукавай дзейнасці павышае творчыя здольнасці вучняў і эфектыўнасць навучання.

Па жаданні педагога і з улікам падрыхтаванасці вучняў *віктарыну* можна праводзіць у поўным аб'ёме (некалькі тураў) і ў скарочаным, каманднага тыпу і індывідуальную (з раздачай жэтонаў за правільныя адказы). У выглядзе віктарыны могуць праходзіць заняткі па тэмах 7, 22, 24.

- *Медыяазбука* — віктарына ў форме камп'ютарнай прэзентацыі з выкарыстаннем малюнкаў і фатаграфій, якія служаць падказкай. Адказы на пытанні да такой віктарыны павінны адпавядаць кожнай літары алфавіта. Падчас яе правядзення пажадана растлумачваць вучням неабходную інфармацыю. Медыяазбука развівае вобразнае мысленне, інтэлектуальныя здольнасці вучняў па аналізе, абагульненні, пашырае агульны кругагляд.

*Гульня.* Адным з любімых відаў дзейнасці вучняў любога ўзросту з'яўляюцца гульні, асабліва клоны папулярных тэлеперадач: «Што? Дзе? Калі?», «Поле цудаў», «Слабае звяно», «Свая гульня» і г. д. Галоўным вынікам гульні можна назваць тое, што кожны яе ўдзельнік, нягледзячы на асабісты вынік, можа палепшыць свой настрой, павысіць цікавасць да матэрыялу, які вывучаецца. У выглядзе гульні могуць праходзіць заняткі па тэмах 4, 5, 6.

- *Сюжэтна-ролевая гульня* мае канкрэтны сюжэт — шэраг узаемазвязаных падзей, сітуацый і прадугледжвае ролі, якія размяркоўваюцца паміж удзельнікамі і з'яўляюцца стрыжнем гульні. Такая форма работы накіравана на развіццё асобы вучня ў цэлым, яго памяці, мыслення, уяўлення. Сутнасць сюжэтна-ролевай гульні зводзіцца да абавязковага выканання правіл, што, адпаведна, уплывае на фарміраванне ва ўдзельнікаў умення кантраляваць уласныя паводзіны. Падчас гульні вучань павінен увайсці ў ролю так, каб паказаць свайго героя знешне,

яго светаадчуванне, перажыванні. Ён вучыцца перадаваць свае думкі, пачуцці, жаданні, пашырае слоўнікавы запас, удасканальвае камунікацыйныя навыкі і актывізуе маўленне. На прыкладзе сюжэтна-ролевай гульні «Я захоўваў Бацькаўшчыну і праслаўляў яе…» можна правесці заняткі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці полацкіх князёў (тэма 12).

- *Гульня-падарожжа* — адметная форма навучання, накіраваная на знаёмства з пэўнымі аб'ектамі і ўсведамленне іх значэння для культуры. Праз выяўленне культурных сэнсаў, значэнняў, вобразаў гульня дазваляе пераўтвараць навакольны свет у асяроддзе развіцця асобы. Гэта інтэрактыўная форма навучання звычайна адпавядае наступным патрабаванням:
  - не дае звестак у гатовым выглядзе, а грунтуецца на актыўнай дзейнасці вучняў;
  - прадугледжвае спалучэнне розных відаў дзейнасці;
  - уключае ў сябе назіранне, тактыльнае і маторнае ўспрыманне, пошук і аналіз інфармацыі і г. д.

У выглядзе гульні-падарожжа «Я — дойлід» можна правесці заняткі па тэмах 19, 20, 23. Правадніком у гэтым падарожжы выступіць уяўны герой Алекса, які будзе даваць заданні вучням. Гульня складаецца з некалькіх этапаў: «Сімвал» (абавязковае заданне, у рамках якога трэба намаляваць малюнак-сімвал з адлюстраваннем выбранай тэмы — своеасаблівую візітную картку), «Помнікі архітэктуры» (камандзе даецца фотаздымак, па якім неабходна пазнаць помнік і расказаць пра яго), «Тлумачэнне слоў» (дойлід, царква, дэкор), «Складзі прыказку» (тром вучням даецца заданне сабраць з раскіданых слоў прыказку і растлумачыць яе сэнс; перамагае той, хто справіцца першым) і г. д.

У выглядзе падарожжа па краіне старабеларускай мовы можна правесці заняткі па тэме 15. У ролі спадарыні Мовы выступае педагог або вучань старшых класаў. Рыхтуецца карта падарожжа, на якой адзначаны станцыі: «Выказванні

пра мову», «Блеф-гульня» (адзначце правільныя выказванні), «Слова заблудзілася» (знайдзіце лішняе слова), «Складзі прыказку», «Фанетычная хвілінка», «Крыжаванка» і інш.

Вывучэнне тэмы 5 прадугледжвае правядзенне некалькіх *міні-гульняў*, якія працягваюцца некалькі хвілін і не маюць строгіх правіл.

Напрыклад, *гульня «Прадоўжы сказ»* прысвечана рамёствам.

*Рамеснік — гэта чалавек... З глінай працуе... Ткачыха робіць... Каваль дапаможа зрабіць... Бондар робіць... На беларускіх землях пражывалі...*

*Гульня «Улоў рыбака»* дапаможа ў вывучэнні гісторыі рыбалоўства на беларускіх землях. Вучням даецца «вуда» (гнуткая доўгая палка, да якой прымацаваны магніт), яны павінны «злавіць» рыбу (да кожнага віду папяровай рыбы таксама прымацаваны магніт) і назваць яе. Перамагае той, хто хутчэй успомніць назвы насельнікаў вадаёмаў. Віды рыб, якія вадзіліся на беларускіх землях, могуць быць прадстаўлены ў прэзентацыі і схаваны пад нумарамі. Калі ў вучняў узнікнуць цяжкасці з вызначэннем відаў рыб, можна разгадаць рэбус.

*Гульня «Майстар»*. Вучні выбіраюць вядучага — «майстра», які гаворыць наступныя словы:

Мы ўмелыя работнікі,
Аратыя і цесляры,
Сена косім, будуем дом.
Што мы робім тапаром?

Вымаўляючы апошнія словы, «майстар» паказвае на аднаго з вучняў, які павінен адказаць на пытанне. Пасля гэтага вядучы падыходзіць да другога ўдзельніка гульні і хутка называе іншы інструмент (напрыклад, сякера, саха, серп і г. д.). Той, хто адказаў няправільна, выбывае з гульні. Назвы інструментаў педагог рыхтуе загадзя і дае «майстру».

## Прыклады гульняў

**«Марскі бой».** У гэту гульню гуляюць тры каманды. На ўсіх даецца адно гульнявое поле — квадрат з 10 слупкоў і 10 радкоў. Слупкі звычайна нумаруюцца зверху ўніз, а радкі пазначаюцца літарамі злева направа. Камбінацыя лічбы і літары з'яўляецца сістэмай каардынат. Усе клеткі, занятыя караблямі, зафарбаваны. Клеткі, што стыкуюцца з «бартамі», пазначаны літарай, якая адпавядае тэме пытання.

Удзельнікам гульні неабходна захапіць усе караблі. Па чарзе яны робяць выстралы, называючы каардынаты. Вядучы адкрывае клетку. Калі там адна з палуб карабля, то камандзе адразу ж налічваецца 1 бал і даецца права наступнага ходу. Калі выстрал трапіў у літару, камандзе задаецца адпаведнае пытанне, на абдумванне якога даецца 30 секунд. Калі каманда не можа даць адказ, свае веды могуць прадэманстраваць сапернікі. За правільны адказ налічваецца 2 балы. У любым выпадку ход пераходзіць наступнай камандзе, якая ўжо ведае, што ў суседняй клетцы знаходзіцца палуба карабля. Калі выстрал трапляе ў пустую клетку, ход таксама пераходзіць. Перамагае каманда, якая набярэ больш балаў, астатнім прысуджаецца званне ўдзельнікаў.

**«Свая гульня».** Фарміруюцца дзве каманды па 4—5 чалавек (або ўдзельнічаюць 3—4 чалавекі). Гульня праходзіць у два туры. У першым каманды гуляюць у поўным складзе. Пытанні, на якія будуць адказваць удзельнікі, маюць розную ступень складанасці. Адпаведна за адказы на іх будуць налічвацца розныя балы — 10, 20, 30, 40, 50. Каманды па чарзе выбіраюць тэму і складанасць пытання, за правільны адказ на якое балы дабаўляюцца, за няправільны — аднімаюцца. Калі выпадае «Свая гульня», удзельнікі могуць павялічыць або паменшыць колькасць балаў у залежнасці ад сваёй упэўненасці ў правільным адказе.

У другім туры прымаюць удзел па адным прадстаўніку ад каманд. Спачатку яны ацэньваюць свой адказ па шкале ад

1 да 100 балаў, затым атрымліваюць пытанне, адказаць на якое трэба ў пісьмовай форме на працягу дзвюх мінут. Калі адказ правільны, балы дадаюцца, калі не — здымаюцца. Перамагае тая каманда, якая набярэ найбольш балаў.

**«Слабае звяно».** Шасцёра ўдзельнікаў гульні стаяць за крэсламі, да спінак якіх прымацаваны шыльдачкі з іх імёнамі, і па чарзе адказваюць на пытанні вядучага. З ліку гледачоў (астатніх вучняў) выбіраецца група статыстыкі. Час на адказы ў першых чатырох раўндах — 7 секунд, падчас двубою, дзе пытанні больш складаныя, даецца 20 секунд. Пасля кожнага раўнда група статыстыкі абвяшчае вынікі. Той удзельнік, які даў менш за ўсё правільных адказаў, выбывае. Галасаванне па вызначэнні «слабага звяна» з дапамогай шыльдачак праводзіцца, калі двое або больш вучняў маюць аднолькавыя вынікі. Калі галасы дзеляцца пароўну, таго, хто выбывае, вызначае самы дасведчаны ўдзельнік — «моцнае звяно». Пры роўных паказчыках у двубоі для канчатковага выяўлення пераможцы задаюцца дадатковыя пытанні.

**«Кветка пытанняў».** У гэту гульню гуляюць дзве каманды. Кожная атрымлівае кветку з паперы, на пялёстках якой удзельнікі запісваюць розныя пытанні па прапанаванай тэме. Перамагае каманда, якая дакладна сфармулюе свае пытанні і адкажа на пытанні каманды-саперніцы.

*Ролевая гульня* — мадэліраванне рэальных або выдуманых жыццёвых сітуацый, зносін, з'яў, заканамернасцей, супрацьлегласцей, дзе ўдзельнікам прапануецца сыграць нейкую ролю ў пэўных абставінах. Гульня прадугледжвае пераўвасабленне ў якую-небудзь асобу, перайманне яе рэальных паводзін. У ролевай гульні праяўляюцца калектыўны і творчы характар дзейнасці, сітуацыйнасць. Яе навучальныя магчымасці дапамагаюць зразумець навакольны свет, замацаваць жыццёвыя назіранні, сфарміраваць уменні і навыкі.

**Турнір краязнаўцаў.** У выглядзе турніру краязнаўцаў можна правесці заняткі па тэмах 19, 20. Удзельнікі падзяляюцца на каманды: «Дойліды», «Княжычы», «Духоўнікі»,

«Гараджане». У першым турніры (тэма 19) удзельнічаюць «Княжычы» і «Гараджане», у другім — «Дойліды» і «Духоўнікі».

Этапы турніру:

1. Прадстаўленне каманд.
2. Размінка: конкурс «Ты — мне, я — табе». У рамках тэмы, якая вывучаецца, кожная каманда задае па тры пытанні супернікам.
3. Бліцтурнір: вядучы (педагог) на працягу трох мінут задае пытанні кожнай камандзе.
4. Творчае заданне: камандам трэба было напісаць міні-сачыненне на тэмы «Мой горад у даўнія часы», «Вядомыя храмы горада», знайсці прыказкі пра Радзіму. За сачыненне налічваецца 9 балаў, за прыказкі — 7, за прыказкі з тлумачэннем — 8.
5. Конкурс капітанаў. Кожны капітан атрымлівае тэкст, у якім дапушчаны гістарычныя памылкі. Задача капітана — растлумачыць іх і выправіць. За кожную знойдзеную памылку налічваецца 1 бал.
6. Конкурс крыжаванак. Удзельнікам неабходна запоўніць пустыя клеткі — упісаць у іх назвы гарадоў (мястэчак, вёсак), дзе знаходзяцца вядомыя замкі (храмы). Перамагае тая каманда, якая хутчэй справіцца з заданнем.

*Словы для крыжаванкі:* Мір, Сынкавічы, Камянец, Мядзел, Геранёны, Мураванка, Навагрудак, Ліда, Ішкалдзь, Уселюб, Крэва, Гродна.

7. Конкурс «Пра што ідзе гаворка». Вучні атрымліваюць карткі, на якіх змешчаны факты з гісторыі замкаў (храмаў). Неабходна пазнаць замак (храм) і расказаць пра яго ўзнікненне і існаванне.

Падводзяцца вынікі турніру, пераможцы ўзнагароджваюцца.

**Дзелавая гульня «Аўкцыён ідэй».** Аўкцыён — продаж тавару з публічных таргоў. Яго правядзенне прадугледжвае

наяўнасць вядучага (педагог), аўкцыяніста і аўкцыянераў (вучні). Кожнаму ўдзельніку таргоў выдаецца па пяць купонаў — грашовых знакаў. Перад пачаткам аўкцыёну вядучы праводзіць размінку, дзе вучні могуць зарабіць дадатковыя грошы. Затым аб'яўляюцца таргі цікавымі ідэямі. Перад продажам кожнага лота іх удзельнікам прапануецца выканаць розныя заданні.

## Стварэнне адукацыйнага кантэнту ў сацыяльных сетках

**Работа ў сацыяльных сетках.** Па-першае, для вучняў, бацькоў і адміністрацыі ўстановы адукацыі неабходна стварыць афіцыйную публічную старонку, для кожнага класа — адкрытую або закрытую суполку (групу), для наведвальнікаў факультатыўных заняткаў — тэматычную (у апісанні варта пазначыць назву факультатыўных заняткаў і ўстанову адукацыі). Доступ да суполак можа ажыццяўляцца па спасылцы або індывідуальным запрашэнні. Удзельнікі групы будуць атрымліваць апавяшчэнні аб запусках відэатрансляцый і рассылкі важных паведамленняў. Неабходна напісаць і замацаваць пост, у якім будуць растлумачаны правілы карыстання сацыяльнай сеткай. Належыць публікаваць матэрыялы па парадку: адзін пост пасля кожных заняткаў. Размяшчаць інфармацыю варта наступным чынам: расказ педагога ў фармаце прэзентацыі (прымацаваць дакумент), відэа або артыкула; прыклад выкананага задання ў фармаце дакумента з магчымасцю каменціравання або відэазванка (пры неабходнасці).

Па-другое, педагог можа выкарыстоўваць на сваіх старонках адукацыйны кантэнт з іншых груп і ствараць свой уласны: размяшчаць розныя віктарыны па прадметах, кароткія відэаўрокі, цікавыя тэсты, карысныя артыкулы, займальныя заданні, розныя правілы, гульні, анкеты, віртуальныя квесты, спасылкі на разнастайныя школьныя групы і г. д. Галоўнае — праявіць сваю зацікаўленасць і крэатыўнасць.

Перад публікацыяй трэба цвяроза ацаніць кантэнт з пазіцыі бацькоў і вучня. Інфармацыя павінна быць пададзена без памылак, зразумелай мовай, без ужывання навуковых фраз і шаблонаў.

Яшчэ адной неад'емнай часткай публікацый у сацыяльных сетках сталі хэштэгі. Яны дапамагаюць прыцягнуць аўдыторыю, звярнуць яе ўвагу на матэрыял, даюць магчымасць пошуку пастоў, акрэсліваюць фірменны стыль, які таксама могуць пераняць вучні. У той жа час не рэкамендуецца злоўжываць хэштэгам.

Асноўныя патрабаванні да вядзення любога сайта, у тым ліку старонкі ў сацыяльнай сетцы, указаны ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 10.11.2008 № 455-З «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі». Так, напрыклад, у заканадаўчым акце замацавана забарона распаўсюджвання інфармацыі аб прыватным жыцці чалавека, размяшчэння фатаграфій без яго згоды. Калі ў педагога ёсць жаданне або неабходнасць апублікаваць фатаграфіі дзяцей, то спачатку трэба атрымаць пісьмовую згоду бацькоў. Пры гэтым іх дазвол не патрэбны, калі фота выкарыстоўваецца ў дзяржаўных або грамадскіх інтарэсах, фотаздымку праводзілі на публічных мерапрыемствах (напрыклад, школьным канцэрце) і вучань не з'яўляецца яе галоўным аб'ектам. Гэтыя ж правілы працуюць і пры відэаздымцы. Прынцыпаў маралі і павагі варта прытрымлівацца ва ўсіх публікацыях і пры напісанні каментарыяў.

Пяць пераваг выкарыстання сацыяльных сетак у навучанні:

1. Вучні могуць размяшчаць карысныя спасылкі, дзяліцца парадамі і працаваць разам над каманднымі праектамі.
2. Сацыяльныя сеткі дапамагаюць вучням вывучаць тэмы і рашаць вучэбныя задачы ў любы час і ў любым месцы.

3. У педагогаў ёсць магчымасць дзяліцца анлайн-рэсурсамі і спасылкамі для пашырэння разумення прадмета вучнямі.
4. Вучні могуць публікаваць свае ідэі або адукацыйныя праекты для экспертнай ацэнкі педагогамі і іншымі вучнямі.
5. Анлайн-падтрымка, парады і зваротная сувязь дапамагаюць павысіць матывацыю вучняў. У выніку яны з большай верагоднасцю будуць актыўна ўдзельнічаць у адукацыйным працэсе.

***Увага!*** Паважаныя педагагічныя работнікі, у дапаможніку размешчаны заданні, якія можна выканаць з дапамогай QR-кодаў. Усе дынамічныя спасылкі на іх сабраны ў адзіным электронным дакуменце (https://qr.adu.by/sl/j5z_bzjIY).

# Уводзіны

*Тэма 1*

## *Духоўная спадчына нашых продкаў — падмурак сучаснай Беларусі*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням выканаць заданне 1, тлумачыць значэнне паняцця «духоўная спадчына». Вучні выконваюць заданне 2 у групах. Кожная група атрымлівае набор фатаграфій і павінна вызначыць матэрыяльныя і нематэрыяльныя аб'екты спадчыны, але педагог спачатку тлумачыць значэнне паняццяў «матэрыяльная культура» і «нематэрыяльная культура». Далей вучні працуюць над заданнямі 4—9. Заданне 11 яны могуць выканаць у форме сачынення-мініяцюры.

Заданні 3 і 10 дзецям прапануецца выканаць у шосты школьны дзень або на канікулах. Так, напрыклад, гульня «Ката пячы» прадугледжвае выраб фігуры «ката» са спецыяльна выпечаных булак. Выраб прывязваюць да столі. Пасля паміж удзельнікамі пачынаецца жартоўнае спаборніцтва: па чарзе на вілках яны «пад'язджаюць» да «ката», падскокваюць і спрабуюць адкусіць ад яго частку. Пры гэтым неабходна пераадолець перашкоды, якія ствараюць іншыя гульцы, і выканаць пэўныя ўмовы (не ўсміхацца, не чапаць «ката» рукамі і інш.). Тыя, хто не справіўся, выконваюць розныя жартоўныя заданні. Пераможцам лічыцца той, хто

адкусіць хвост. Пасля гэтага «ката» дзеляць паміж усімі ўдзельнікамі гульні.

На канікулах праводзіцца тэматычны тыдзень «Жывая спадчына Беларусі». Кожны дзень прысвячаецца адпаведнаму святу, абраду, промыслу і г. д. Напрыклад, 1-ы дзень — «Традыцыйная ежа продкаў беларусаў», 2-і — «Традыцыйныя рамёствы», 3-і — «Абрады продкаў беларусаў», 4-ы — «Народныя гульні», 5-ы — «Народныя песні і танцы» і г. д.

**Прыклад: 1-ы дзень — гульня-квест «Ці ведаеш ты традыцыйныя беларускія стравы?».**

*1-ы этап: «Этнограф».*

Вучні ўяўляюць наступныя сітуацыі і адказваюць на пытанні:

- Вы знаходзіцеся ў 1385 г. у рэзідэнцыі вялікіх князёў літоўскіх у Крэве. Вялікі князь літоўскі Ягайла запрашае вас за стол на гутарку. На стале — безліч дзіўных страў і напояў: сала дзіка з бульбай, фаршыраваная гусь, грыбны суп, грэцкая каша, квас, мёд і таматны сок. Скажыце, якія з пералічаных прадуктаў не маглі знаходзіцца на вялікакняжацкім стале? *(Бульба, таматны сок.)*
- Вы апынуліся ў XIII ст. у доме знатнага гараджаніна. Зазірнулі ў трапезную, а там на гаспадарскім стале — хлеб, пернікі, цукар, малако, квас, гарбата, мёд, кісель. Ці ўсе пералічаныя стравы можна было пакаштаваць у той час? *(Цукар, гарбата.)*

*2-і этап: «Пытанне з капелюша».*

- У XIII ст. на беларускіх землях не было цукру. Першы цукровы завод быў пабудаваны ў 1830-я гады ў мястэчку Моладава (цяпер вёска ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці). Нягледзячы на адсутнасць цукру, продкі сучасных беларусаў гатавалі варэнне. Што выкарыстоўвалі замест цукру? *(Мёд.)*
- На Вялікдзень жыхары беларускіх зямель запякалі парася, адварвалі мяса і каўбасы, фарбавалі яйкі. А якая яшчэ

смачная страва павінна была знаходзіцца на святочным сталe? *(Пасха.)*

*3-і этап: «Вандроўка з камерай».*

Неабходна размясціць QR-коды, па якіх з дапамогай мабільнага тэлефона вучні знойдуць цікавыя факты пра беларускія стравы.

*4-ы этап: «Літаратурная гасцёўня».*

Вучням трэба знайсці ў прапанаваным тэксце словы, якія абазначаюць назвы страў.

А) ...Наперш дала яна капусту,
Тады са скваркамі кулеш,
На малацэ крупеню густу
Дае ўволю, толькі еж.
І з пастаялкай жур сьцюдзёны,
А з кашы сала аж цякло,
Ды і гусяціны смажонай
Уволю ўсім багом было.
Як унясла ж на стол каўбасы,
Бліны аўсяны ў рашаце... *(Урывак з паэмы «Тарас на Парнасе».)*

Б) ...Стаяў асобна ў місцы скорам
Сяго-таго для верашчакі.
Хоць невялікія прысмакі —
Цыбуля, перчык, ліст бабкоў
Ды сальца некалькі бруском,
Мука і квас — і ўся прыправа,
Але ўсё ж снеданне цікава. *(Я. Колас «Новая зямля».)*

*5-ы этап: «Стравы па-беларуску».*

Вучні суадносяць назвы страў з тлумачэннямі.

| **Назва стравы** | **Тлумачэнне** |
|---|---|
| Кулеш | Аўсяны кісель |
| Жур | Крупяная каша |

| Назва стравы | Тлумачэнне |
|---|---|
| Мачанка | Страва з мяса, прыгатаваная смажаннем |
| Смажаніна | Лапатачная частка тушы свінні |
| Шынка | Страва з сала, мяса і каўбасы, падкалочаная мукой |

*А д к а з ы:* кулеш — крупяная каша; жур — аўсяны кісель; смажаніна — страва з мяса, прыгатаваная смажаннем; шынка — лапатачная частка тушы свінні; мачанка — страва з сала, мяса і каўбасы, падкалочаная мукой.

*6-ы этап: медыяазбука «Стравы ад А да Я».*

*7-ы этап: гульня-лато «Рыхтуем традыцыйныя стравы беларусаў».*

Лато складаецца з некалькіх гульнявых палёў, у цэнтры якіх — выявы вядомых беларускіх страў. Вакол вучні павінны выкласці малюнкі прадуктаў — інгрэдыентаў, якія патрэбны для іх прыгатавання.

**2-і дзень — гульня «Запрашаем на кірмаш рамеснікаў»**

*1-ы этап: «Адгадай».*

Вучням зачытваюць загадкі, вершы пра народныя рамёствы. Яны павінны адказаць, пра што ідзе гаворка, і знайсці прадметы на дадзеную тэму.

А) Абутак, сплецены з лыка або бяросты (часам для трываласці ўпляталіся і скураныя рамяні), — лапці (саломапляценне).

Б) Прылада для ручнога прадзення, якая прыводзілася ў рух нажной педаллю, — калаўрот (ткацтва).

*2-і этап: «Знайдзі лішняе».*

Выстаўляюцца 4—5 прадметаў. Трэба знайсці лішні, растлумачыць, чаму ён не падыходзіць да дадзенага рада, вырабам якога рамяства ён з'яўляецца, што яму ўласціва. Выйграе той, хто хутка знойдзе лішні прадмет і зможа растлумачыць свой выбар.

*3-і этап: «Збяры пазл».*

Вучні збіраюць пазл з выявай рамеснага вырабу. Вызначаюць назву вырабу і рамяство, прадуктам якога ён з'яўляецца.

*4-ы этап: «Знайдзі цень».*

Вучні павінны падабраць да выяў рамесных вырабаў адпаведны цень. Расказаць, для чаго служаць гэтыя прадметы.

*5-ы этап: «Даміно».*

На цэнтр стала малюнкамі ўніз выкладваюцца карткі з выявамі элементаў рамесных вырабаў. Гэта «кірмаш». Да пачатку гульні ўдзельнікі дамаўляюцца, па колькі картак возьмуць. Першым робіць ход той, у каго ёсць картка-дуплет. Наступны ўдзельнік знаходзіць у сябе картку з такой жа выявай і кладзе яе да першай. Калі няма патрэбнай, ён карыстаецца «кірмашом». Калі «кірмаш» пусты, прапускае ход. Выйграе той, хто раней за іншых пазбавіцца картак.

**3-і дзень — гульня «Музычны рынг»**

*1-ы этап: «Музычны куфэрак».*

Вучням прапануецца здагадацца, пра якія музычныя інструменты ідзе гаворка.

- Гэты інструмент быў вельмі папулярны ў вандроўных музыкантаў. Ён кішэнны, з добрай акустычнай сістэмай. *(Пашэта.)*
- Смычковы інструмент, на якім можна іграць рукамі. Менавіта для яго ў 1600 г. у Вільні быў створаны «Віленскі сшытак». *(Лютня.)*
- Зборнік бытавой музыкі эпохі Рэнесанса і ранняга барока, які ў архівах Ягелонскай бібліятэкі ў 1962 г. знайшоў Адам Мальдзіс. *(«Полацкі сшытак».)*
- Гэтыя музычныя інструменты ў часы Сярэдневякоўя і Ранняга Новага часу прадстаўлялі ваенны інструментарый. *(Барабан, сурма.)*

*2-і этап: «Пытанне з саламянай скарбоначкі».*

Вучні адказваюць, пра што ідзе размова, і знаходзяць патрэбны фотаздымак (ілюстрацыю).

- У X ст. у беларускіх храмах гучаў распеў, які адрозніваўся ўрачыстым, крыху суровым характарам, што зблiжала яго з грыгарыянскім харалам. Што гэта за распеў? *(Знаменны.)*
- У буйных княжацкіх рэзідэнцыях былі папулярны невялікія музычныя інструменты, на якіх ігралі запрошаныя на працяглы час музыканты. Пра што ідзе размова? *(Арган.)*
- Першымі прадстаўнікамі прафесійнай музыкі на ўсходнеславянскіх землях былі вандроўныя акцёры, спевакі, танцоры, казачнікі. Як іх называлі? *(Скамарохі.)*
- У буйных гарадах магістрацкія музыканты служылі трубачамі ў ратушах. Галоўнымі інструментамі ў войсках княжацкіх дружын былі... *(трубы, бубны, тулумбасы)*.

*3-і этап: філфорд «Музычныя іскрынкі».*

Сярод літар вучні шукаюць прафесіі свецкіх музыкантаў.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Г | Л | Я | Р | У | Д | І |
| У | С | Р | А | Д | У | Ы |
| Л | І | Ы | Р | Ы | А | Р |
| Я | Р | Н | А | Б | З | Т |
| Д | У | І | К | І | Ы | С |
| І | Д | А | Ч | Н | Р | У |
| С | К | П | Ы | Ц | Ы | Д |
| Т | Р | Ы | М | Б | А | Н |
| Б | У | Т | С | І | Л | Я |
| У | Б | Н | І | С | Т | Ы |

*Адказы:* гусляр, лірнік, бандурыст, дудар, дудачнік, бубніст, скрыпач, кабзар, цымбаліст.

*4-ы этап: «Музычны алфавіт».*

Педагог пытаецца, ці ведаюць вучні музычныя тэрміны. Прапануе расшыфраваць іх.

**П 19 1 13 14 ы**

**К 1 15 20 ы**

**П 1 18 20 30 19 15 28 я р 1 19 17 6 3 ы**

**Т 1 2 21 13 1 20 21 18 а**

*А д к а з ы:* псалмы, канты, партэсныя распевы, табулатура.

*5-ы этап: «Вядомыя імёны».*

- Першыя згадкі пра клавікорд у Еўропе (1408 г.) звязаны з дваром вялікага князя літоўскага... *(Вітаўта).*
- Пры каралеўскім двары ў Рэчы Паспалітай была ўведзена пасада распарадчыка зводнай каралеўскай капэлы, якую займалі знатныя людзі. Сярод іх — вядомы канцлер ВКЛ... *(Леў Сапега).*
- У 1558 г. у берасцейскай друкарні буйнога магната і мецэната быў выдадзены першы беларускі нотны зборнік пратэстанцкіх гімнаў, які атрымаў назву «Берасцейскі канцыянал». Хто быў тым мецэнатам? *(Мікалай Радзівіл Чорны.)*
- Раннія ўзоры кантаў і псалмоў уваходзілі ў зборнікі, якія называліся багалоснікі. У XV ст. становіцца вядомым імя аўтара новага — беларуска-рускага — распеву. Пра каго ідзе размова? *(Рыгор Цамблак.)*

## Матэрыялы да заняткаў

Духоўная спадчына — асаблівы складальнік культуры, прызнаны пакаленнямі, які неабходна захаваць і перадаць ў будучыню. За стагоддзі нашы продкі стварылі і пакінулі нам багатую і самабытную гісторыю, увасобленую ў духоўных традыцыях, звычаях і абрадах, кніжнасці, летапісанні, абарончым і культавым дойлідстве, выяўленчым мастацтве, фальклоры, будаўніцтве жылля, стварэнні бытавых рэчаў, нацыянальнага адзення, разнастайных прамысловых вырабаў і інш.

У розных формах духоўная спадчына дае магчымасць чалавеку адчуць эпоху Сярэдневякоўя і Ранняга Новага часу, усвядоміць яе сувязь з сучаснасцю, рэканструяваць светапогляд нашых продкаў. Знаёмства з ёй — гэта прэзентацыя этычных, эстэтычных каштоўнасцей старажытных беларусаў. Сёння мы павінны адчуваць сябе носьбітамі аўтэнтычнай культуры родных зямель, папулярызаваць яе ў свеце.

Беларусь — маладая дзяржава, і ёй неабходна працягваць фарміраванне сваёй духоўнай спадчыны. Менавіта яна — наша каштоўнасць і найвялікшы здабытак.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні тлумачаць, як яны разумеюць наступны выраз: *«Мова, звычаі, традыцыі, веды і тэхналогіі, якія перададзены нам продкамі з рук у рукі, з вуснаў у вусны, ад сэрца да сэрца, скрозь вякі як каштоўныя знакі памяці»*[2].

**Заданне 2.** З дапамогай прадстаўленых фатаграфій вучні вызначаюць матэрыяльныя і нематэрыяльныя аб'екты духоўнай спадчыны, даюць сціслую характарыстыку аб'ектаў (прадметаў), якія адлюстраваны на кожнай фатаграфіі.



*Мал. 1.* Сынкавіцкая царква



*Мал. 2.* Лідскі замак

[2] Спецыялізаваны інтэрнэт-рэсурс Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Жывая спадчына Беларусі».





*Мал. 3.* Гліняны посуд *Мал. 4.* Пояс Вітаўта

**Заданне 3.** З дапамогай QR-кода вучні пераходзяць на сайт «Жывая спадчына Беларусі». Там яны даведваюцца пра традыцыі продкаў і абрады, што дагэтуль праводзяцца на тэрыторыі Беларусі. Рыхтуюць пост для сацыяльнай сеткі (ствараюць агульны акаўнт для ўдзельнікаў факультатыўных заняткаў), выкарыстоўваючы матэрыялы рэсурсу. Публікацыя павінна змяшчаць не больш за 2000 слоў. Падбіраюць да яе візуальны матэрыял і хэштэгі. Размяшчаюць пост у сацыяльнай сетцы, дзеляцца спасылкай з аднакласнікамі і педагогам.

**Заданне 4.** Вучні знаходзяць лішняе слова ў лагічным ланцужку і тлумачаць, чаму (па якой прымеце) яно адрозніваецца ад астатніх:

- Лідскі, Крэўскі, Навагрудскі, Мірскі, Мінскі, гродзенскі Стары замкі;
- Сынкавіцкая, Маламажэйкаўская, Каложская, Супрасльская цэрквы;
- хрысціянства, праваслаўе, іслам, каталіцтва, пратэстантызм.

**Заданне 5.** Вучні вызначаюць, пра што ідзе размова ва ўрыўку. Разважаюць, ці можна аднесці гэты твор да народнай песні.

Едзе Вітаўт па вуліцы,
За ім нясуць дзве шабліцы...

Шаблі літы, злотам біты,
У яшчар-скуру апавіты...
Адна шабля для спадара,
Друга шабля на татара...
Стануў Вітаўт прад кашовым,
Блiснуў у сонцы шабляй новай...
Стукнуў-грукнуў у падковы,
Гэй, шыхтуйся, пан кашовы!..
Крыкнуў: «Слава, слаўны княжа!
Вораг ў полі косцю ляжа...»

**Заданне 6.** Вучням прапануецца разгадаць SMS-крыжаванку.

- Галоўны музычны інструмент нашых продкаў.
- Якія магнаты ВКЛ выкарыстоўвалі гэты інструмент на сваіх святах?
- Якога вялікага князя літоўскага народ сустракаў з ваенных паходаў пад гучанне гэтага музычнага інструмента?

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2 | 7 | 2 | 1 |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | 1 | 2 | 3 | 3 | 1 | 3 | 4 | 9 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 4 | 9 | 2 | 2 | 6 | 2 |




*Мал. 5.* SMS-крыжаванка

**Заданне 7.** Дзецям неабходна вырашыць гістарычную задачу — даведацца, калі на беларускіх землях з'явілася першая скрыпка.

Вядома, што праз 98 гадоў пасля прыняцця «Судзебніка Казіміра» — зборніка норм права XV ст. вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт Аўгуст напісаў ліст свайму маршалку, у якім загадаў браць падатак з музыкаў-скамарохаў: дудароў, скрыпачоў і інш. Гэта першае дакументальнае сведчанне існавання скрыпкі на беларускіх землях.

**Заданне 8.** Педагог гаворыць: «Першае згадванне гэтага музычнага інструмента датуецца XII ст. і сустракаецца ў творах Кірылы Тураўскага. Пра што ідзе гаворка?» Вучні знойдуць адказ, калі заменяць лічбы ў шыфроўцы на літары беларускага алфавіта (кожнай лічбе адпавядае парадкавы нумар літары).

**4 21 19 13 10**

**12 18 28 13 1 17 1 5 16 2 15 28 32**

**Заданне 9.** З дапамогай вершаваных радкоў вучні вызначаюць, пра які танец ідзе гаворка:

...Без дуды, без дуды
Ходзяць ножкі не туды,
А як дуду пачуюць,
Самі ногі танцуюць.

**Заданне 10.** З дапамогай QR-кода дзеці пераходзяць на сайт «Жывая спадчына Беларусі». Знаходзяць інфармацыю пра гульню «Ката пячы». Абапіраючыся на прачытаны матэрыял, ствараюць для сацыяльных сетак пост пра народныя гульні беларусаў. Варта зрабіць гэта ў выглядзе тэксту, відэа- і аўдыяфайлаў.

**Заданне 11.** Вучні разважаюць над пытаннямі: «Калі ў свеце адзначаюць Дзень роднай мовы? Растлумачце, чаму трэба ведаць беларускую мову. Што адрознівае беларусаў ад іншых народаў? Якая мова існавала на беларускіх землях да з'яўлення сучаснай беларускай мовы? Як вы растлумачыце той факт, што вучоныя-філолагі лічаць беларускую мову адной з найпрыгажэйшых у Еўропе? Як вы разумееце выраз "Родная мова — гэта спадчына і карані народа. Абсячыце карані — дрэва загіне..."?».

*Тэма 2*

# *Чалавек – творца і носьбіт духоўнасці*

## Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням выканаць заданне 1. Далей тлумачыць сутнасць паняцця «духоўнасць». Вучні знаёмяцца з прытчай (№ 2), выконваюць заданне на разважанне (№ 3). Падчас гульні «Адгадай!» педагог дэманструе адпаведныя ілюстрацыі і дае дадатковыя звесткі пра названыя помнікі культуры і дзеячаў. Заданні на распазнаванне помнікаў дойлідства прыводзяцца апошнімі. Педагог адзначае, што продкі беларусаў стварылі розныя музычныя творы, і прапануе скласці словы сярэдневяковай песні (№ 5). Паслядоўнасць слоў адзначана лічбамі. Потым вучні слухаюць знаменны распеў, выконваюць заданні (№ 6), разгадваюць SMS-крыжаванку, знаходзяць старажытныя рэчы (№ 8) або займаюцца творчай работай (№ 9).

## Матэрыялы да заняткаў

У свядомасці чалавека духоўнасць непарыўна звязана з верай. Вядома, што першай формай адлюстравання духоўнага свету чалавека стаў міф, у якім спалучыліся асновы ведаў, вераванняў, розных відаў мастацтва. Вера займае вядучае месца — яна фарміруе маральныя арыенціры, нормы паводзін людзей у рэальным жыцці. Аднак паняцце «духоўнасць» аб’ядноўвае ў сабе і вышэйшыя каштоўнасці — дабро, ісціну і прыгажосць.

Вылучаюць свецкую і рэлігійную духоўнасць. У свецкім разуменні яна ўключае ў сябе элементы культуры, маральнасць, эрудзіраванасць, эстэтыку і этыкет. Рэлігійная духоўнасць звязана з любоўю да Бога і бліжняга, ачышчэннем ад

дрэнных звычак і благіх учынкаў. Свецкая духоўнасць прыраўноўваецца да культуры, якая складаецца са створаных народам каштоўнасцей, ідэй, сімвалаў, вераванняў, звычаяў, норм і правіл паводзін, з'яўляецца яе асновай.

За сваю шматвяковую гісторыю беларускі народ сфарміраваў багатую і самабытную культурную спадчыну. Наша краіна мае значны гісторыка-культурны патэнцыял, прадстаўлены аб'ектамі архітэктуры, мастацтва, музейнымі калекцыямі. Найбольш значныя з іх уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

З пакалення ў пакаленне нашы продкі перадавалі найбагацейшыя духоўныя здабыткі, якія праслаўляюць маральную сутнасць чалавека, ідэалы дабра і справядлівасці. На працягу стагоддзяў на беларускіх землях развіваўся манументальны жывапіс. Напрыклад, буйным цэнтрам культуры і мастацтва лічыўся г. Полацк. Да нашых дзён там захаваліся ўнікальныя помнікі старажытнабеларускага царкоўнага мастацтва і архітэктуры: на сценах Спаса-Праабражэнскай царквы захаваліся фрэскі XII ст., нацыянальнай рэліквіяй лічыцца Крыж Еўфрасінні Полацкай, створаны майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. Крыж быў страчаны ў час Вялікай Айчыннай вайны, але адноўлены ў канцы XX ст. беларускім мастаком-ювелірам Мікалаем Кузьмічом. Цяпер ён захоўваецца ў Спаса-Праабражэнскай царкве.

З традыцыямі літаратурна-паэтычнага багаслужэння ў часы Сярэдневякоўя быў непарыўна звязаны царкоўны спеў. Ідэя панавання слова рэалізавалася ў меладыйным мастацтве знаменнага (крукавага) распеву. Гэты стыль царкоўнага пеўчага мастацтва развіваўся на працягу XII—XVII стст. Характэрнай асаблівасцю набажэнства было выкарыстанне толькі багаслужэбных спеваў (пераважна аднагалосых) без музычнага суправаджэння. Чытанне нараспеў асвойвалася часцей за ўсё вусна, на слых, а пазней — на аснове пісьмовай традыцыі. Кожнаму музычнаму стылю багаслужэбных

спеваў адпавядала асобая разнавіднасць безлінейнай натацыі. Праслухаць распеў «З намі Бог» можна з дапамогай QR-кода.

Сярод аб'ектаў спадчыны, якія маюць сусветнае значэнне, — Барысаглебская (Каложская) царква (XII ст.) у г. Гродне, цэрквы абарончага тыпу (канец XV — пачатак XVI ст.) у в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна і в. Мураванка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, Сафійскі сабор (1044—1066 гг.) і Спаса-Праабражэнская царква ў г. Полацку (XII ст.) Віцебскай вобласці, Камянецкая вежа (XIII ст.) у г. Камянцы Брэсцкай вобласці.

Кожны чалавек абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і шанаваць свае духоўныя традыцыі.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні тлумачаць наступны выраз. Высвятляюць, пра што ідзе гаворка. *«Яны могуць знікнуць назаўсёды, калі мы не захаваем іх, каб перадаць сваім дзецям і ўнукам, ад пакалення да пакалення, з рук у рукі, з вуснаў у вусны, ад сэрца да сэрца, праз час і прастору...»*[3]

**Заданне 2.** Вучні тлумачаць евангельскую прытчу.

Адзін строгі гаспадар раздаў сваім рабам грошы — таланты. Першы атрымаў пяць талантаў, пайшоў і памножыў іх; другі атрымаў два і таксама іх памножыў. Трэці атрымаў адзін і, спалохаўшыся строгага гаспадара, закапаў, каб не згубіць.

Праз некаторы час нявольнікі прынеслі свае таланты: першы і другі — памножаныя, трэці — толькі адзін, чым выклікаў вялікі гнеў гаспадара. І загадаў ён, каб трэці аддаў гэты свой скарб першаму, бо «кожнаму, хто мае, дадзена будзе, а ў таго, хто не мае, адымецца і тое, што было».

[3] Сайт «Жывая спадчына Беларусі».

**Заданне 3.** Вучні разважаюць над пытаннем «Ці правільна сцвярджаць, што клопат пра росквіт роднага краю — маральны абавязак кожнага чалавека?». Свой адказ абгрунтоўваюць.

**Заданне 4.** Гульня «Адгадай!». З дапамогай прыведзенай характарыстыкі дзеці вызначаюць назву каштоўнай рэчы, імя дзеяча або назву помніка дойлідства.

- Шэдэўр мастацтва часоў Сярэдневякоўя, выраблены ў г. Полацку для царквы Святога Спаса. Мае шасціканцовую форму, вышыню 51,8 см. Згублены ў час Другой сусветнай вайны і да гэтага часу не знойдзены.
- Помнік раманскага стылю з элементамі ранняй готыкі. Знаходзіцца ў г. Камянцы.
- Гэты артэфакт быў знойдзены ў 1971 г. мясцовым школьнікам Віктарам Пятручыкам падчас раскопак на тэрыторыі г. Брэста (ранейшая назва — Бярэсце). Зроблены з самшыту і датуецца канцом XIII ст. На ім кірылічным шрыфтам выразана 13 літар. Захоўваецца ў археалагічным музеі «Бярэсце».
- Гэты помнік стваралі візантыйскія майстры ў 1044—1066 гг. У старажытнай яго частцы да нашых дзён захаваліся фрэскі XI ст. З'яўляўся пахавальняй полацкіх князёў (раскапана 16 саркафагаў). У яго памяшканні размешчана канцэртная зала з арганам.
- Старажытны будынак сярэдзіны XII ст. Будаваўся 30 тыдняў. Тут знаходзяцца мошчы Еўфрасінні Полацкай, дакладная копія яе знакамітага Крыжа і вялікая колькасць іншых царкоўных святынь. На сценах раскрыта 12 частак фрэсак XII ст.
- Прырода ў яго словах мае сімвалічнае значэнне: сонца — Хрыстос; месяц — сімвал усяго, што цямнее; зіма — сімвал грэшнага; лёд — сімвал бязвер'я. Сусветную вядомасць атрымала яго «Прытча пра чалавечую душу і цела». Сучаснікі назвалі яго другім Златавустам.

- Першая жанчына, што заснавала манастыр, збудавала храм, для якога замовіла сусветна вядомы Узвіжальны Крыж, атрымала цудатворны абраз Божай Маці, напісаны евангелістам Лукой.
- Гэта каштоўнасць з’яўляецца яркім сведчаннем існавання пісьменнасці ў старажытным Віцебску. На глыбіні 3—4 м ад паверхні зямлі яе выпадкова знайшоў рабочы Я. Фралоў падчас работ на плошчы Свабоды ў 1959 г.
- Адзін з найбольш ранніх помнікаў славянскай кніжнай пісьменнасці, створаны ў XI ст. і напісаны кірыліцай, які захаваўся да нашага часу.
- Пабудавана ў другой палове XII ст. з цэглы. Помнік гродзенскай школы дойлідства. Адметнасцю інтэр’ера з’яўляецца мноства керамічных збаноў-галаснікоў.

**Заданне 5.** Гульня «Збяры словы песні “Багародзіца”».

1 Багародзіца-дзявіца
Богам славёна Марыя [7]

3 Маці звалёна Марыя
Зычы нам і адпусці нам

2 Твайго сына-гаспадзіна
Маці звалёна Марыя

5 І малітву табе ўзносім
І даць рады цябе ж просім

4 І дзеля хрысціцеля Божыца
Звыш галасы чалавечы мыслі пой

6 Дай на свеце збожны пабыт
Па жывоце дай райскі быт

**Заданне 6.** Вучні слухаюць знаменны распеў («Благослови душе моя Господа»). Адказваюць на пытанне «Як называецца музыка, якая гучыць у храмах?». Разгадваюць рэбус, каб даведацца, як па-іншаму называецца знаменны распеў.




Разгадваюць рэбус, каб высветліць, што такое крук у музыцы.




Вучням прапануецца падумаць, як гучыць знаменны распеў, якую музыку называюць рэлігійнай.

**Заданне 7.** Дзеці разгадваюць SMS-крыжаванку (гл. мал. 5). Вызначаюць музычныя інструменты, якімі карысталіся продкі беларусаў.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 7 | 2 | 1 | | | |
| 2 | 7 | 6 | 4 | 3 | | |
| 1 | 1 | 6 | 2 | 1 | 5 | |
| 1 | 7 | 1 | 2 | 5 | | |
| 6 | 5 | 2 | | | | |
| 3 | 1 | 4 | 2 | 3 | 4 | 1 |

**Заданне 8.** Гульня «Знайдзі старажытную рэч». Камандам раздаюцца канверты, у якіх — выявы старажытных і сучасных рэчаў. Вучні павінны выбраць старажытную рэч і назваць прыметы, па якіх яны гэта вызначылі. Напрыклад,

шахматныя фігуры XII ст. і сучасныя шахматы, самшытавы грэбень і сучасны, прывескі-амулеты і амулеты, плінфа XI ст. і сучасная і г. д.

**Заданне 9.** Творчая работа. Выстава «Артэфакты[4] на беларускіх землях», прысвечаная каштоўным рэчам, якія сталі духоўнымі святынямі, і рарытэтам[5], што сведчылі пра неверагодную магутнасць іх уладальнікаў.

*I варыянт.* Вучні рыхтуюць раздрукаваныя ілюстрацыі артэфактаў з эксплікацыяй да іх.

Схема складання эксплікацыі:

- кароткая даведка пра ўладальнікаў;
- характарыстыка каштоўнага прадмета;
- апісанне асаблівасцей стылістычных і мастацкіх прыёмаў (для кніг, ікон, архітэктурных помнікаў і інш.);
- месца знаходжання або захоўвання артэфакта;
- цікавыя звесткі з гісторыі ўзнікнення каштоўнасці.

*II варыянт.* Вучні рыхтуюць лэпбук пра адзін з артэфактаў. Лэпбук — гэта міні-кніжка, у якой сістэматызаваны веды па якой-небудзь тэме. Напрыклад, лэпбук «Крыж Еўфрасінні Полацкай».

План лэпбука (яго змест):

- выявы Крыжа;
- выявы святых на Крыжы;
- надпісы над вобразамі святых;
- рэліквіі;
- месца знаходжання Крыжа;
- звесткі пра матэрыялы, якія выкарыстоўваліся пры стварэнні каштоўнасці;
- звесткі пра майстра, які адрадзіў святыню.

Матэрыялы для лэпбука: кардонная папка-аснова, каляровая папера для друку, нажніцы, клей-аловак для паперы, стэплер, скотч.

---

[4] Артэфакт — з’ява, працэс, прадмет, уласцівасць прадмета, які мае знакавы або сімвалічны змест.

[5] Рарытэт — каштоўная, рэдкая рэч, якая ўяўляе музейную, антыкварную каштоўнасць.

# *Раздзел I*
# Духоўная спадчына беларускіх зямель у IX — сярэдзіне XIII ст.

## *Тэма 3*
## *Гістарычныя крыніцы аб духоўным жыцці насельніцтва Беларусі ў IX – сярэдзіне XIII ст.*

### Метадычныя рэкамендацыі

З дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў» педагог расказвае пра гістарычныя крыніцы; прапануе адпаведныя расказы, пакуль вучні выконваюць заданне 1. Дзеці пераходзяць да задання 3. Педагог падрабязна расказвае пра Тураўскае, Полацкае і Аршанскае Евангеллі. Пасля таго як вучні выканаюць заданне 4, настаўнік тлумачыць, што такое сфрагістыка, прыводзіць прыклады; дае падрабязныя звесткі ў рамках выканання заданняў 5, 6. Вучні выконваюць заданні на разважанне (№ 2) і практычнае (№ 7) або творчае заданне (№ 8).

### Матэрыялы да заняткаў

Гістарычныя крыніцы — гэта дакументы і матэрыялы, якія ўзніклі ў той час, калі адбываліся пэўныя падзеі, і могуць даць іх аб’ектыўнае тлумачэнне. Выдзяляецца сем асноўных тыпаў крыніц: пісьмовыя, этнаграфічныя, фальклорныя, моўныя, рэчавыя, фонадакументы, кінафотадакументы.

Шэраг важнейшых звестак па гісторыі беларускіх зямель X — пачатку XII ст. змяшчае «Аповесць мінулых часоў». Гэты пісьмовы помнік з'яўляецца гістарычна-мастацкім творам усходняга славянства. У летапісе знайшлі адлюстраванне падзеі, звязаныя з распаўсюджваннем хрысціянства і гісторыяй гарадоў Мінск, Тураў, Друцк, Брэст. Арыгінальным творам усходнеславянскага летапісання з'яўляецца Радзівілаўскі летапіс. У ім змешчана 617 рознакаляровых мініяцюр, шэраг з якіх прысвечаны гістарычнаму мінуламу беларускіх зямель. Надзвычай важны дакумент — Смаленская праўда (дагавор) 1229 г. Ён дае ўяўленне пра арганізацыю гандлю Полацка і Віцебска з Рыгай, нормы права, якія тады існавалі. Тэкст граматы мае прыметы беларускай мовы.

Сярод рыс беларускага летапісання можна адзначыць строгі адбор фактаў і персанажаў, лаканічнасць апавядання, цыклічнасць кампазіцый. Летапісы збіраліся ў зводы. Таму выдзяляюць іх арыгінальныя і кампелятыўныя часткі. Летапісы падаваліся ў пагадовай форме і спалучалі сціслую дакументальна-дзелавую фіксацыю адзінкавых гістарычных фактаў і падзей. Для іх характэрна жывое, эмацыянальна-вобразнае асэнсаванне мінулага. Летапісы складаліся свецкімі і духоўнымі асобамі ў розным асяроддзі і таму з'яўляюцца вельмі разнастайнымі. Пісьмовыя помнікі XII—XIV стст. мелі, як правіла, мясцовы, фрагментарны характар.

Незаменная крыніца па вывучэнні духоўнай спадчыны Беларусі эпохі Ранняга сярэдневякоўя — археалагічныя матэрыялы. Шматлікія знаходкі з раскопак даюць магчымасць вывучыць эканамічнае жыццё гарадоў, рамесную вытворчасць, гандаль, рэлігійныя вераванні. Беларускія даследчыкі знайшлі выдатныя рэчы дробнай пластыкі (абразкі і крыжы, шахматныя фігуры), рэшткі манументальнага дойлідства, помнікі эпіграфікі (навука, якая вывучае надпісы на цвёрдых матэрыялах), сфрагістыкі (дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае пячаткі і іх адбіткі на розных

матэрыялах), нумізматыкі і інш. Варта адзначыць, што кожны год круг рэчавых крыніц пашыраецца.

Самым старажытным помнікам усходнеславянскай пісьменнасці лічыцца надпіс на полацкай пячатцы канца X ст. Вывучае пячаткі і іх гісторыю сфрагістыка (ад грэчаскага слова «сфрагіс» — *пячатка*). У Тураве, Брэсце, Ваўкавыску былі знойдзены пячаткі з надпісамі тураўскага князя Ізяслава Яраславіча (пасля хрышчэння Дзмітрыя). На іх змешчаны імя і выява святога Дзмітрыя Салунскага, які лічыўся заступнікам князя. Свінцовыя вíслыя пячаткі з надпісамі знойдзены ў Гомелі, Гродне, Віцебску, Пінску. На пячатцы Мінскага замчышча можна разгледзець выяву св. Глеба ў высокай княжацкай шапцы.

Зборнік евангельскіх чытанняў — Тураўскае Евангелле — створаны ў XI ст., відавочна, у Тураве. У захаваным фрагменце старажытнага рукапісу знаходзяцца адзінаццаць ініцыялаў — упрыгожаных вялікіх літар, якія размаляваны ў тры колеры: сіні, зялёны, чырвоны. Твор напісаны царкоўнаславянскай мовай. Тураўскае Евангелле — адна з рэдкіх і дасканалых па сваім мастацкім узроўні кніг усходняга славянства.

Рукапіс Полацкага Евангелля створаны ў канцы XII ст. Ён належаў Траецкаму манастыру ў Полацку. Евангелле перапісана на 172 лістах двума почыркамі ўставам у два слупкі, упрыгожана рознакаляровымі застаўкамі і кінаварнымі ініцыяламі. Адна з дзвюх заставак, якія захаваліся, мае арнамент старавізантыйскага тыпу.

Аршанскае Евангелле з'яўляецца поўным зборнікам евангельскіх чытанняў канца XII — пачатку XIII ст. Надзвычай прыгожы рукапіс аздабляюць больш за 300 ініцыялаў у звярыным стылі, некалькі заставак і мініяцюр.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі даследчыкам трапляліся пломбы — невялікія кавалачкі свінцу, якімі апламбіроўваліся прадметы з адбіткам пячаткі. Так, у Полацку знойдзена пломба, з аднаго боку якой — выява святога (дакладна незразумела: Барыса або Глеба), а з другога — крыжа. На плом-

бе з Віцебска захавалася імя Пётр. Надпіс XI ст. выяўлены ў полацкім Сафійскім саборы. На вялікім камені ў падмурку выбіты імёны людзей, якія будавалі храм: «Давыдь, Тоума, Микуола, Петьрь, Воришь». Надпісы XII ст. ёсць на праслачках, амфарах. Яны даюць звесткі пра імёны, асаблівасці тагачаснай лексікі: «Бабино праслень» (Віцебск), «Ярополче вино», «Настасино праслен» (Пінск).

Добра вядомы Барысавы камяні — помнікі XII ст. Па загадзе полацкага князя Барыса на вялікіх валунах былі выбіты крыжы і надпісы з яго імем. Яго сын Рагвалод (у хрышчэнні Васіль) у 1171 г. загадаў высечы крыж і надпіс на камені вышынёй 3 м. У Брэсце знойдзены грэбень з самшыту, на якім размешчаны славянскія літары ад А да Л. Грэбень выконваў ролю буквара для навучання грамаце.

Выключным помнікам эпіграфікі з'яўляецца надпіс на Крыжы Еўфрасінні Полацкай. У яго першай частцы гаворыцца, што ў 1161 г. асветніца назаўсёды падарыла крыж царкве Спаса, а ў другой — словы праклёну таму, хто знясе крыж з храма. На ніжняй пласціне адваротнага боку Крыжа — надпіс з імем майстра Богшы (у хрышчэнні Лазара).

Каштоўнымі эпіграфічнымі помнікамі з'яўляюцца графіці Спаскай царквы Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку. Найбольш цікавы запіс на сцяне паблізу алтара дае падставу меркаваць аб працы там мастака-багамаза Кузьмы.

У XI—XV стст. прыватныя лісты з паведамленнямі, даручэннямі, просьбамі адных асоб да другіх пісалі на бяросце. Касцяной або жалезнай палачкай-пісалам надрапвалі літары на тым баку, які прылягаў да дрэва. Берасцяныя граматы знойдзены падчас археалагічных раскопак у гарадах.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** «Складзіце слова». Вучням трэба скласці з літар слова і растлумачыць яго значэнне.

- л п е с а т і
- е п р г м н т а е

- ф і к і п і э г р а
- г а р а г і я ф і я
- б р с т я о а

**Заданне 2.** Вучні разважаюць над пытаннем «Чаму помнікі пісьменнасці і эпіграфікі з’яўляюцца здабыткамі духоўнай культуры?». Абгрунтоўваюць свой адказ.

**Заданне 3.** Вучні расшыфроўваюць назвы вядомых пісьмовых помнікаў. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць адпаведнымі літарамі беларускага алфавіта. Знаходзяць у спляценні літар дакладныя назвы пісьмовых помнікаў.

**6 3 1 15 4 6 13 13 6**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| У | Т | А | Р | П | Е |
| Р | А | А | Ш | О | А |
| С | Ў | Н | С | Л | К |
| К | А | Е | К | А | Ц |
| Д | Р | К | А | Е | К |
| Т | У | Ц | У | Л | С |

**Заданне 4.** Вучні разгадваюць SMS-крыжаванку (гл. мал. 5).

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 0 | 8 | 1 | 6 | 4 | 1 | | | | |
| 2 | 6 | 1 | 7 | 3 | 7 | 3 | | | | |
| 0 | 5 | 3 | 2 | 6 | 1 | 7 | 3 | 4 | 1 | |
| 5 | 5 | 4 | 5 | 3 | 4 | | | | | |
| 6 | 7 | 6 | 1 | 2 | 3 | 6 | 6 | 9 | 4 | 1 |

**Заданне 5.** Вучні разгадваюць рэбус. Расказваюць, што ведаюць пра гэтыя помнікі эпіграфікі.



**Заданне 6.** Вучні разгадваюць рэбус. Адказваюць на пытанні: «Што вам вядома пра гэты помнік эпіграфікі?», «Якую ролю ён выконвае?», «Па загадзе якой святой быў зроблены?», «Хто з'яўляецца майстрам каштоўнасці?».




**Заданне 7.** Выраб берасцяной граматы. Загадзя вучні атрымліваюць заданне: пад кіраўніцтвам настаўніка біялогіі, прытрымліваючыся правіл бяспекі, зняць 3—4 кавалачкі кары са спілаваных дрэў або тых, якія паваліліся. Адначасова вучням тлумачыцца, як рыхтавалі бяросту для пісьма: спачатку для надання эластычнасці яе кіпяцілі, потым, саскробшы верхні слой, абразалі па краях. Берасцяныя граматы згортвалі так, каб тэкст размяшчаўся на знешнім баку. Іх выявы дэманструюцца на экране з дапамогай праектара.

Вучням таксама неабходна апусціць сабраныя загатоўкі ў металічную ёмістасць, заліць гарачай вадой, потым дастаць іх і абрэзаць нажніцамі. Звяртаецца ўвага на тое, што шарыкавых ручак раней не было — іх замянялі няхітрыя прылады. Імі не пісалі, а прадрапвалі літары. *(Вучням прапануецца прадрапаць на кавалачках кары некалькі літар. У якасці пісала можна выкарыстоўваць цвік або металічную шпільку.)*

Пакуль вучні спрабуюць пісаць на бяросце, педагог тлумачыць, што кожны радок слоў акуратна загладжваўся, каб не было шурпатасці і бяроста не тапырылася.

Тэкст берасцяной граматы: «Паслухайце, братове, і ўразумейце, дзеці, як належыць нам вераваць у адзінага Бога, павучацца, схіліўшыся да святых кніг — Евангелля, Апостала, Псалтыра». (К. Тураўскі «Слова святога Кірыла аб кніжным чытанні і навуцы».)

**Заданне 8.** Творчая работа «Сведкі мінуўшчыны на беларускіх землях». Вучням неабходна апісаць помнікі эпіграфікі і царкоўна-рэлігійнага пісьменства, скласці спіс летапісаў з каментарыямі — пазначыць дату ўзнікнення, вылучыць галоўных персанажаў, падзеі, якія апісваюцца.

Схема апісання помнікаў эпіграфікі і царкоўна-рэлігійнага пісьменства:

- назваць помнік, месца яго знаходжання;
- вызначыць колер, структуру аб'екта;
- прывесці прыклады розных здымкаў аб'ектаў (лічбавы здымак, відэаздымак, малюнак);
- вызначыць спосаб нанясення надпісу: спантанна нанесены, часцей бытавога характару — графіту, зроблены пэндзлем па тынкоўцы, гравіраваны або выразаны на цвёрдым матэрыяле — «намаляваны»; тып пісьма для царкоўна-рэлігійных помнікаў;
- чытанне і разуменне сэнсу надпісу (можна прывесці прыклад яго перакладу на сучасную мову).

## *Тэма 4*
## *Чалавек і прырода ў духоўнай культуры насельніцтва беларускіх зямель*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням выканаць заданні 1, 2, расказвае пра прыродныя аб'екты, якія ўшаноўвалі продкі беларусаў. Вучні выконваюць заданні 3, 8—10. Педагог расказвае пра народны каляндар. Затым дзеці працуюць над заданнем 4, удзельнічаюць у гульні «Народны каляндар» (№ 6), выконваюць заданне 7 і прымаюць удзел у гульні «Складзі лекавы лячэбнік» (№ 5) або выконваюць творчую работу (№ 11).

Можна прапанаваць вучням паўдзельнічаць у праекце на тэму «Народны каляндар усходніх славян». Плануецца, што

ён будзе ўключаць чатыры асноўныя раздзелы, прысвечаныя порам года. Для кожнага раздзела варта прадугледзець рубрыкі: «Народныя прыметы», «Народные святы», «Прыказкі і прымаўкі», «Змены ў прыродзе», «Прамысловыя, гаспадарчыя, сельскагаспадарчыя віды работ». Вынікам праекта можа быць прэзентацыя або перакідны каляндар.

## Матэрыялы да заняткаў

Добра вядома, што да прыняцця хрысціянства славяне пакланяліся абагаўлёнай імі прыродзе — камяням, крыніцам, азёрам, рэкам, кустам, дрэвам, гаям, а таксама звярам і птушкам, агню, зоркам, месяцу і сонцу. Месцы, дзе язычнікі (язычніцтва тут — умоўны тэрмін, які абазначае старажытныя вераванні і культы) ушаноўвалі сваіх багоў, прыносілі ім ахвяры, называліся свяцілішчамі, або капішчамі. Размяшчаліся яны на ўзвышшах, астравах, берагах рэк і азёр, сярод балот. Існаванне свяцілішчаў на тэрыторыі Беларусі ў Раннім сярэдневякоўі пацвярджаюць шматлікія археалагічныя даследаванні.

Значнае месца ў паданнях і вераваннях беларусаў займаў камень. Напрыклад, яны прыносілі ахвяру камяням у рэчышчах рэк, якія ўяўлялі небяспеку для лодак. Праязджаючы міма, людзі кідалі ў ваду хлеб з соллю і выкрыквалі: «Вітаю цябе хлебам-соллю! Хлеб-соль прымі і мяне прапусці». Так, група камянёў, якую называюць «Прывітальня», ёсць на р. Віліі. Такі звычай вядомы і на Заходняй Дзвіне.

Адбіткі найстаражытнейшых культаў, звязаных з шанаваннем сонца, расліннасці, продкаў, захоўваліся ў шэрагу ўсходнеславянскіх абрадаў ажно да XX ст.

Святы і абрады звычайна прымяркоўваліся да пэўных каляндарных дат і мелі аграрна-магічны характар. Іх асноўнай функцыяй было забеспячэнне дабрабыту сям'і, які ў першую чаргу залежаў ад ураджаю. Пакаленні беларусаў перадавалі праз гэты каляндар веды, мудрасць, вопыт жыццёвых назіранняў. Абапіраючыся на бацькоўскія традыцыі і веру, яны трымалі ў памяці шматлікія парады і забароны. Людзі

ведалі, калі можна было брацца за працу, а калі, наадварот, адкласці яе, калі можна было весяліцца, а калі ўстрымлівацца ад забаў.

У беларускім народным календары паказаны светапогляд жыхароў нашых зямель, іх глыбокае веданне прыроды і любоў да яе, цягавітасць да працы. Гэта прасочваецца нават у назвах месяцаў года: кожная адлюстроўвае характэрныя рысы сезонаў. Так, студзень — месяц сцюдзёны, зямлю не пакідаюць халады. Але дзень павялічваецца ўжо на паўтары гадзіны. Для абазначэння гэтага месяца ў старабеларускай мове выкарыстоўвалася слова *стычень*. Люты — месяц, калі зіма мае самую вялікую сілу. Сакавік — час збірання соку, свята заканчэння зімы і сустрэчы вясны. У красавіку з'яўляліся першыя кветкі, спраўлялася свята Камаедзіца, калі гатавалі і елі гарохавую кашу — так званыя камы. Адсюль і назва свята. Яго вытокі звязаны з татэмізмам — старажытнай формай рэлігіі. Назве месяца *май* адпавядае старабеларуская форма *травень*. У гэтым месяцы зямля пакрываецца зелянінай. Чэрвень — пачатак лета. Назва гэтага месяца тлумачыцца з'яўленнем чарвякоў, а таксама чырвоным колерам, які набываюць некаторыя ягады.

Назва месяца *ліпень* паходзіць ад слова *ліпа* — дрэва цвіце менавіта ў гэту пару. Ліпень дорыць чалавеку спелыя лясныя і садовыя ягады, першыя грыбы. Сучасная беларуская назва месяца *жнівень*, як і старабеларуская *серпень*, таксама адлюстроўвае яго асаблівасці: заканчвалася ўборка азімых, затым пшаніцы, ячменю, аўса і інш., спраўлялася адно з хлебных свят — Трэці Спас. Назва месяца *верасень* паходзіць ад расліны верасу, якая цвіце ў канцы лета і пачатку восені. Кастрычнік мае сувязь са словам *кастрыца* (кастра). У гэты час часалі, трапалі лён і каноплі, з якіх ападала шмат кастрыцы. Назва месяца *лістапад* тлумачыцца проста: канец ападання лісця з дрэў. Снежань меў старабеларускую назву *грудзень* (ад слова *груды* — замёрзлая зямля). Апошні

месяц каляндарнага года называецца *снежань* — ад слова *снег*, а па-старабеларуску — *прасінець* (прасвет у аблоках).

Залежнасць жыцця нашых продкаў ад прыродных стыхій вымушала іх выконваць разнастайныя абрады, строга рэгламентаваныя часам. Чатыром порам года адпавядалі чатыры вялікія святы, вакол якіх групаваліся іншыя: зімой — Каляды, вясной — Вялікдзень, летам — Купалле, восенню — Дзяды, Пакровы. Такім чынам, беларускі народны каляндар з'яўляецца адной з форм духоўнага жыцця беларусаў.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць рэбусы, каб вызначыць, пра што пойдзе размова на занятках.







**Заданне 2.** Вучні разгадваюць філворд: знаходзяць назвы прыродных аб'ектаў, якія абагаўлялі продкі беларусаў.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| К | А | Ц | Н | О | С |
| Я | М | Я | І | А | Р |
| Н | Е | С | А | Г | А |
| І | К | Э | Р | Ё | З |
| К | Р | Ы | Ц | Р | Ы |
| З | О | Н | І | Ц | А |

**Заданне 3.** Вучні разважаюць, пра што сведчыць звычай, калі гаварылі: «Вітаю цябе хлебам-соллю, хлеб-соль прымі і мяне прапусці».

**Заданне 4.** Дзеці вызначаюць, пра што ідзе размова ў народных прыказках: «Пытаецца люты, ці добра ногі абуты», «Кожная хата ў жніўні багата», «Узвіжанне лета замыкае, ключык шызая галачка за мора панесла», «Пакрова прайшла — дзеўка замуж не пайшла», «Мароз у снежні і снег вышэй хаты — будзе год тады багаты».

**Заданне 5.** Гульня «Складзі лекавы лячэбнік». Вучні працуюць у камандах. Кожная атрымлівае канверты, у якіх знаходяцца назвы або ілюстрацыі раслін, карткі з іх лекавымі ўласцівасцямі. Удзельнікі гульні павінны суаднесці назвы зёлак з іх характарыстыкамі.

*Назвы або ілюстрацыі раслін:* дубовая кара, семя лёну, хрэн, сок алоэ, грэчка.

*Лекавыя ўласцівасці:* лячылі страўнікава-кішачныя хваробы, малакроўе, цынгу; слабіцельны сродак, сродак для прыпарак.

**Заданне 6.** Гульня «Народны каляндар». Вучні працуюць у камандах. Кожная атрымлівае канверты з назвамі месяцаў на сучаснай беларускай і старабеларускай мовах. Удзельнікі гульні павінны суаднесці назвы месяцаў, назваць іх характэрныя рысы.

*Сучасныя назвы месяцаў:* студзень, люты, сакавік, красавік, май, чэрвень, ліпень, жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад, снежань.

*Старабеларускія назвы месяцаў:* сечэнь, просинец, сьнежын, сухий, кветень, беразоль, травень, чирвець (червец), липец, серпень, вресень, руин, риень, зарев, листапад, паздерник, брудень, грудзень, прасінець, студеный.

**Заданне 7.** Вучні разважаюць над пытаннем «Як вы лічыце, ці адпавядалі назвы месяцаў у календары нашых продкаў прыродным з'явам?». Прыводзяць прыклады.

**Заданне 8.** З дапамогай QR-кода вучні пераходзяць на анлайн-рэсурс «Валуны Беларусі». Высвятляюць, якія культавыя камяні захаваліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Складаюць карту іх месцазнаходжання.

**Заданне 9.** Вучням прапануецца паразважаць і адказаць на пытанне.

Вядома, што на беларускіх землях вылучаліся асобныя культавыя дрэвы, здольныя, як лічылі нашы продкі, пазбаўляць ад хвароб. Да XX ст. захавалася абрадавае кармленне паклонных дрэў. Як вы разумееце выраз «абрадавае кармленне дрэў»?

**Заданне 10.** Вучням прапануецца паразважаць і адказаць на пытанне.

Вядома, што ў Раннім сярэдневякоўі хрысціянская царква выступала супраць ушанавання крыніц. Але так і не здолела перамагчы гэту народную традыцыю. Тады святары пачалі ставіць каля «святых ключоў» капліцы, крыжы, праводзіць малебны. Растлумачце, чаму такім было стаўленне хрысціянскай царквы да культу крыніц?

**Заданне 11.** Творчая работа.

*I варыянт.* Вучням даецца заданне падрыхтаваць фотакалаж або сачыненне-мініяцюру на адну з прапанаваных тэм: «Родная зямліца — зямля-карміцелька», «Маці — сырая зямля», «Зямля святая, яна — наша маці», «Зямля на зіму зварухнулася».

Сачыненне-мініяцюра — гэта тэзіс (асноўная думка, выкладзеная ў адным выразным сцвярджэнні) і адказ на яго. Аб'ём — 0,5 старонкі.

**Алгарытм напісання сачынення-мініяцюры:**

- вызначэнне праблемы, асноўнай тэмы;
- вызначэнне сродкаў выразнасці для выказвання думкі;
- вызначэнне сярэдняй даўжыні сказаў (варта ўстрымацца ад залішняй колькасці слоў);
- распісванне плана сачынення-мініяцюры;
- аналіз сачынення-мініяцюры пасля напісання (пры неабходнасці можна скараціць).

**Памятка для работы над сачыненнем-мініяцюрай**

- Аналізаваць — гэта тлумачыць, а не пераказваць.
- Дзе няма галоўнай думкі, там няма і не можа быць правільнага адбору матэрыялу.
- Мастацтва пісаць — гэта своечасова паставіць кропку.
- Будзь простым, але не прымітыўным.
- Пісаць — не значыць спісваць.

*II варыянт*. Вучням прапануецца зняць відэаролік на тэму «Свет прыроды і чалавека ў народным календары беларусаў» («Гуканне вясны», «Грамніцы», «Саракі», «Камаедзіца», «Юр’я», «Сёмуха»).

**Алгарытм работы:**

- вучні павінны пазнаёміцца з гісторыяй свята;
- ролі вядучага і асноўных удзельнікаў размяркоўваюцца;
- рыхтуецца неабходны рэквізіт;
- на відэа здымаюцца асноўныя сцэны свята, пры гэтым можна выкарыстоўваць ілюстрацыйны матэрыял, фатаграфіі з іх агучваннем;
- працягласць роліка — да 15 мінут;
- зняць відэа можна на смартфон, фотаапарат, відэакамеру; далей ролік неабходна зманціраваць.

*III варыянт*. Выкарыстоўваючы QR-код, вучні рыхтуюць паведамленне «Таямніца паходжання назваў месяцаў» накшталт паста для сацыяльнай сеткі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, падбіраюць ілюстрацыю. Важна ўлічваць правілы названага рэсурсу (колькасць знакаў).

# *Тэма 5*
# *Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва беларускіх зямель скрозь прызму духоўных традыцый*

## Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням выканаць заданне 1, каб вызначыць тэму заняткаў. Далей, выкарыстоўваючы інфармацыю з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў», расказвае пра развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. Вучні разгадваюць SMS-крыжаванку (№ 2), педагог дапаўняе іх адказы. Далей дзеці пераходзяць да галаваломкі, каб вызначыць, якія агародныя і садовыя культуры вырошчвалі продкі беларусаў. Педагог адзначае, што яны займаліся жывёла- і птушкагадоўляй. Каб вызначыць, каго разгадоўвалі, а на каго палявалі тагачасныя жыхары нашых зямель, вучні ўдзельнічаюць у віктарыне (№ 5). Потым педагог адзначае, што продкі сучасных беларусаў займаліся промысламі, самым распаўсюджаным з якіх было рыбалоўства. Калі вучням цікава, якая рыба вадзілася ў рэках і азёрах, трэба адгадаць загадкі (№ 6). Тэкст загадак можна суправаджаць ілюстрацыйным матэрыялам. Затым прапануецца адказаць на пытанні задання 4. Далей вучні ўдзельнічаюць у гульні «Знайдзі пару» (№ 7).

Завяршыць заняткі можна віртуальнай экскурсіяй у музейны комплекс старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі». Зрабіць гэта дазволяць даведнік па музеі і QR-код. Вучні працуюць у камандах. Кожнай ставіцца задача наведаць адну з майстэрняў і падрыхтаваць кароткае паведамленне пра яе дзейнасць. Для выканання задання патрабуецца некалькі камп’ютараў з доступам у інтэрнэт. Альтэрнатыўным варыянтам можа стаць стварэнне лэпбука «Промыслы беларусаў» (адзін на выбар).

## Матэрыялы да заняткаў

Сельскагаспадарчая вытворчасць у Сярэднія вякі з'яўлялася асноўным відам дзейнасці ўсходніх славян. Тады галоўнай галіной сельскай гаспадаркі было земляробства. Ворныя прылады рабілі з дрэва. Металічнымі былі толькі асобныя іх часткі. У XI—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўвалі два тыпы рал: бесполазныя і з полазам, двухзубую драўляную саху з двума металічнымі сашнікамі. Саха не толькі добра рыхліла зямлю, але і падразала пустазелле. У Высокім сярэдневякоўі выкарыстоўваліся прылады ручной апрацоўкі глебы: драўляныя рыдлёўкі з металічнымі акоўкамі і металічныя матыкі.

Ураджай збіралі металічнымі сярпамі. Зерне малацілі драўлянымі цапамі. Лён і каноплі апрацоўвалі на льнамялках, часалі вялікімі драўлянымі грабянямі. На муку зерне малолі пры дапамозе каменных жорнаў. Крупы выраблялiся ў ручных і нажных ступах. У X—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі вырошчвалі амаль усе вядомыя ў наш час збожжавыя культуры. Шырокае распаўсюджванне мела азімае жыта, вырошчвалі і яравое. З XI ст. жыта становіцца галоўнай збожжавай культурай. Шырока вядомы быў ячмень. Па колькасці засеяных плошчаў ячмень займаў трэцяе месца пасля азімага жыта і пшаніцы. Радзей за іншыя культуры сустракаўся авёс. Паўсюдна вырошчвалі проса, увага надавалася бабовым культурам: сачавіцы, радзей — бобу. Грэчка вядома на нашай тэрыторыі з XI ст.

З агародніны ў гэтыя часы вядомы капуста, рэпа, цыбуля, буракі. Пра развіццё садаводства сведчаць знойдзеныя ў Полацку, Мінску, Гродне костачкі вішні і слівы.

Пераважала папаравая сістэма земляробства з прымяненнем двухполля або трохполля. Пры павелічэнні ворных плошчаў ужывалася лядная сістэма.

Падчас археалагічных раскопак на былых паселішчах было знойдзена многа касцей дзікіх жывёл. Продкі беларусаў палявалі на дзіка, казулю, мядзведзя, лася, зубра. Таксама

даследчыкі высветлілі, якой свойскай жывёле аддавалася перавага. Гэта буйная рагатая жывёла, коні, свінні.

У X—XIII стст. насельніцтва беларускіх зямель займалася таксама птушкагадоўляй. У Навагрудку, напрыклад, знойдзены косці курэй, качак, гусей. Нашы продкі палявалі на жураўля, глушца, белую курапатку, цецерука, гусей, качак, чорнага бусла. Ёсць звесткі пра тое, што ў якасці лоўчых птушак выкарыстоўвалі беркутаў і ястрабаў.

Апрача сельскай гаспадаркі, насельніцтва беларускіх зямель займалася промысламі. Самым распаўсюджаным было рыбалоўства (у тым ліку зімовая лоўля рыбы). Вялікая колькасць рыбы ў рэках і азёрах дазваляла жыхарам X—XIII стст. зрабіць харчаванне больш разнастайным. Тагачасныя людзі займаліся таксама зборам грыбоў, ягад, дзікарослых пладоў.

Самымі распаўсюджанымі хатнімі промысламі былі прадзенне і ткацтва. Усюды пралі лён і воўну, з атрыманых нітак выраблялі тканіны. Доказам гэтага з'яўляюцца знаходкі драўляных верацён і шыферных праслачкаў, дэталей ткацкіх станкоў, кавалкаў тканін.

Значнае месца сярод промыслаў займала бортніцтва. Яно давала не толькі мёд, але і воск. Мёд, воск і футра з'яўляліся асноўнымі прадметамі гандлю ў Раннім сярэдневякоўі.

Самым распаўсюджаным рамяством у сельскай мясцовасці было ганчарства. Выраблялі пераважна пячныя гаршкі, міскі, латкі. Гліняны посуд аздабляўся арнаментам у выглядзе хваль, палос, насечак, зрэдку на днах ставілі клеймы. Тагачасныя ювеліры выраблялі шырока распаўсюджаныя ўпрыгажэнні з танных каляровых металаў: медзі, бронзы, латуні, волава, білону — нізкапробнага серабра (скроневыя кольцы, бранзалеты, пярсцёнкі).

У гарадскім рамястве вядучая роля належала кавальству. Сыравінай для майстроў служыла крычнае жалеза. Старажытныя кавалі ведалі сакрэты здабывання сталі. Шырока ўжываліся коўка, насечка, рэзка зубілам, шліфаванне і паліроўка.

Да слясарнай вытворчасці ў старажытнай Беларусі адносіўся выраб замкоў і ключоў да іх. Археалагічныя матэрыялы сведчаць, што нашы продкі ўмелі апрацоўваць золата, бурштын. Вядома пра знаходкі бурштынавых пацерак, падвесак, пярсцёнкаў, нацельных крыжыкаў.

Добра была наладжана вытворчасць плінфы — тонкай абпаленай цэглы, якой часта вымошчвалі падлогі мураваных храмаў. Гэта былі пліткі разнастайнай канфігурацыі, пакрытыя палівай жоўтага, зялёнага і карычневага колераў. Сустракаецца і непаліваная цэгла.

Шырокае распаўсюджванне ў гарадах сярэдневяковай Беларусі мела апрацоўка каменю. З каменных блокаў — квадратаў — узводзіліся храмы. Старажытныя каменячосы высякалі з валуноў мукамольныя жорны. З мяккага каменю выразалі ювелірныя крыжыкі і абразкі.

Вялікая патрэба існавала і ў кушнярах. У якасці сыравіны гэтыя майстры выкарыстоўвалі шкуры буйной і дробнай рагатай жывёлы.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні расшыфроўваюць назву заняткаў. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць на адпаведныя літары беларускага алфавіта.

**Г 1 19 17 1 5 1 18 12 а**

**Заданне 2.** Вучні разгадваюць SMS-крыжаванку (гл. мал. 5). Спрабуюць аднавіць веды па дадзенай тэме і вызначыць, якія збожжавыя культуры вырошчвалі продкі беларусаў.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | 9 | 6 | 1 | | | |
| 0 | 8 | 4 | 2 | 5 | 9 | |
| 5 | 8 | 1 | 5 | 3 | 7 | 1 |
| 1 | 1 | 2 | 6 | | | |
| 5 | 6 | 5 | 6 | 1 | | |

**Заданне 3.** Галаваломка. Вучні знаходзяць у сетцы словы, выгнутыя ў форме бумеранга. Яны дапамогуць вызначыць, якую агародніну і садавіну вырошчвалі продкі беларусаў.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Б | Ж | Ы | Т | К | А | Я |
| Я | У | С | А | Т | В | Б |
| Г | Л | Р | С | І | Б | Р |
| І | Э | У | Ш | О | Ы | О |
| В | П | Б | П | Н | Б | С |
| С | Ы | А | Р | А | Я | О |
| Ц | Л | Ё | В | У | К | Р |
| А | С | І | Л | А | С | П |

**Заданне 4.** Вучні разважаюць над пытаннямі: «Якія промыслы вы аднеслі б да здабываючых?», «Без якіх хатніх промыслаў нельга ўявіць жыццё сярэдневяковага грамадства?», «Што служыла сыравінай для гэтых промыслаў?», «Які від промыслу даваў патрэбны і каштоўны прадукт — асноўны прадмет гандлю ў Раннім сярэдневякоўі?», «Якое месца ў рацыёне жыхароў X—XIII стст. адводзілася рыбе?».

**Заданне 5.** Віктарына «Так або не». Педагог прапануе сцвярджэнне, а вучні адказваюць «так» ці «не». За правільныя адказы налічаюцца зоркі, а за няправільныя — спісваюцца.

- Продкі беларусаў палявалі на дзіка, казулю, мядзведзя, лася, зубра.
- Віды дзікіх паляўнічых птушак — качкі, куры, гусі.
- Нашы продкі палявалі на жураўлёў.
- У гарадзішчах і паселішчах людзі разгадоўвалі казулю, дзіка, лася, зубра.
- Глушэц, белая курапатка, цецярук, журавель, чорны бусел — гэта віды паляўнічых птушак.
- Насельніцтва беларускіх зямель займалася птушкагадоўляй — разводзіла арлоў і ястрабаў.
- У якасці лоўчых птушак нашы продкі выкарыстоўвалі беркутаў і ястрабаў.

**Заданне 6.** Вучні адгадваюць загадкі, каб вызначыць, якія віды рыб лавілі продкі беларусаў.

- Не чалавек, не звер, а з вусамі.
- Хвастом віляе, зубасты, а не брэша.
- Рыба паласатая, драпежная, небяспечная. Ловіць маленькіх малявак, чырвоны колер у плаўнікоў.
- Калючы, ды не вожык.
- З мора ў раўчук шлях цяжкі і далёкі. Рыба гэты шлях пройдзе і родны раўчук знойдзе.
- Ён вясёлы, малады, з залатой луской.
- Гэта рыба сямейства карпавых — драпежная, са светлай луской, шырокім ротам і магутным хвастом.
- Усе рэкі Беларусі – яго родны дом. Асцярожны ён і хітры, з чорным плаўнікам.
- Ад хваста да галавы срэбрам свецяцца бакі, а як вочы крывёй наліваюцца, то адразу малькі разбягаюцца.
- У доўгім, тонкім целе можна шчупака разгледзець. Але з ім ён не сябруе, а вось разам з асятром бывае за царскім сталом.

**Заданне 7.** Гульня «Знайдзі пару». Вучні працуюць у камандах. Кожная атрымлівае канверт з назвамі промыслаў і рамёстваў, а таксама ілюстрацыі пэўных вырабаў, сыравіны, прылад.

*Назвы:* бортніцтва, сталярства, кавальства, ткацтва, ганчарства.

*Ілюстрацыі:* лён, кросны, воўна, гаршкі, гліна, печ, дуб, мэбля, варштат, горн, кузня, жалеза, борць, воск, мёд.

**Заданне 8.** З дапамогай QR-кода вучні пераходзяць на сайт музейнага комплексу старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі». Націскаюць кнопку «бел» і пераходзяць да беларускамоўнай версіі рэсурсу. Здзяйсняюць віртуальную экскурсію па музейным комплексе.

Па выніках віртуальнай экскурсіі вучням можна прапанаваць творчую работу.

*I варыянт:* падрыхтаваць кароткі расказ «Мае продкі займаліся...».

*II варыянт:* стварыць лэпбук «Промыслы беларусаў» (адзін на выбар).

## *Тэма 6*
## *Правілы жыцця ў побыце беларусаў як адлюстраванне іх духоўных традыцый*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог можа растлумачыць тэму заняткаў падчас гульні, у якой удзельнічаюць дзве каманды. Кожная выбірае капітана і прыдумвае сабе назву. Педагог тлумачыць правілы. Поле для гульні мае выгляд прэзентацыі, дзе балы з'яўляюцца гіперспасылкамі. Да галоўнага поля прадугледжаны хуткі пераход. Кожнае пытанне можа суправаджацца ілюстрацыйным матэрыялам або рэбусам. Педагог дапаўняе адказы вучняў дадатковай інфармацыяй.

Вучням таксама прапануецца выканаць творчую работу: падрыхтаваць уласны сцэнарый абраду «Гуканне вясны» або выкарыстаць прыведзены ў дапаможніку і правесці свята.

### Сцэнарый свята «Гуканне вясны»

Гучыць музыка. На палянку, вакол якой растуць бярозы, выходзіць вядучы. Дрэвы — сімвал вясны і жыцця — упрыгожаны.

*Вядучы.* Мы вясну гукаем, мы вясну сустракаем! Добры дзень, шаноўныя госці!

Хутчэй на забаву спяшайцеся,
Ды не вельмі штурхайцеся!
Паглядзіце, што будзе:
Усе збіраюцца,
Свята пачынаецца!

*Вядучы.* Здаўна на нашых землях існавалі абрады сустрэчы і закліку вясны. Звонкія і радасныя песні гучалі па ўсім краі. Дзяўчаты збіраліся на самым высокім месцы і спявалі вяснянкі да глыбокай ночы. А вось і яны.

*Уваходзяць дзяўчаты і спяваюць песню:*

Жавароначкі, прыляціце!
Вясну красную прынясіце,
каб сонейка засвяціла,
каб снег белы растапіла,
каб садзікі расквяціла.
Жавароначкі, прыляціце!
Цёпла лецейка прынясіце,
а зімачку прыбярыце,
бо зімачка надаела,
нам хлебушка пераела.
Жавароначкі, прыляціце!
Зямлю-матухну абудзіце
і дождзыкам напаіце,
каб травачкі нарасціла
і волікаў накарміла.
Жавароначкі, прыляціце!
Вясну красную прынясіце,
ночку цёмную прагапіце,
ночку цёмную прагапіце,
светлым сонечкам засвяціце.

*Вядучы.* З даўняга часу ад дзядоў да ўнукаў перадаецца адно паданне:

Як брала вясна ў сонца ключы,
Адчыняла сырую зямельку,
Пускала на свет траву-мураву,
Адзявала ў лісце бярозы.
Ці будзем мы гукаць вясну? Дзе нашы хлопцы?

*(Уваходзяць хлопцы з бубнамі і спечанымі «жаўрукамі».)*
*Дзяўчына.*

Хлопцы, ці трэба нам вясна-красна?

*Хлопцы.*

Трэба!

*Дзяўчына.*

Ці будзем мы яе гукаць?

*Хлопцы.*

Будзем!

*Хлопцы спяваюць вясновую заклічку:*

Прыйдзі да нас, вясна,
З радасцю,
З літасцю,
З жытам крупчастым,
З пшанічкай залацістаю,
З аўсом кучаравым,
З ячменем вусатым,
З просам, з грэчкай,
З калінай-малінай,
З грушамі, з яблычкамі,
З усялякай садовай,
З кветкамі блакітнымі,
З травушкай-муравушкай.

*Вядучы.* Давайце падрыхтуемся да прыходу вясны. Раней за ўсіх вясной прачынаецца пастушок. *(Хлопчык-пастушок у саламяным капелюшы іграе на дудцы.)* Дзяўчаты сустракалі вясну па-свойму: выпякалі з цеста фігуркі птушак, бо лічылася, што тады яны хутка прыляцяць (раздача спечаных «жаўрукоў»).

*Дзяўчаты спяваюць. Пачынаецца інсцэніроўка пацешкі «Ладачкі-ладушкі».*

Ладачкі-ладушкі,
Прыляцелі птушкі.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Боты паскідалі,
Кругам паляталі.

Сталі сакатаці,
Каб ім есці даці.
Прынясу ім жыта,
Будуць птушкі сыты.
Ды насыплю грэчкі,
Хай нясуць яечкі.

*З'яўляецца дзяўчынка з сітам. Яна бярэ зярняткі і садзіць на далоні «птушак».*

*Вядучы.* Малайцы! Сапраўды, з даўніх часоў людзі праслаўляюць птушак — вестуноў вясны. Дзяўчаты збіраліся гуртам, ішлі ў канец вёскі — адтуль пачынаўся абход усіх двароў. Паспрабуем і мы, як у даўнія часы, паклікаць вясну. Давайце спяваць, вясну гукаць!

*Дзяўчаты.*

Свяці, свяці, сонейка,
Каб нам было цёпленька.
Ай, люлі, ай, люлі,
Люленькі, люлі.
Сонца, сонца, выглянi ў аконца,
Пасвяці нам трошку, дам табе гарошку.
Свяці, свяці, сонейка,
Каб нам было цёпленька.
Ай, люлі, ай, люлі,
Люленькі, люлі.

*(У гэты момант убягае Зіма і хоча ўсіх замарозіць, за ёй уваходзіць Вясна.)*

*Зіма.*

Ой, чалом, чалом ды цёплае лецечка!

*Вясна.*

Ой, здарова была ды халодная зімачка!

*Зіма.*

Чаму цябе велічаюць, а мяне, зімачку,
праклінаюць?

*Вясна.*

Бо ты, Зімачка, халодная,
Лугі, балоты памарозіла,
А я, Вясна, ды вясёлая.

*(Чутны крыкі.)*

Згары, Зіма, ты нядобрай была!
Адыдзі, Зіма, ты мокрай была!
Згінь, Зіма!
Пусці Вясну на зямлю!

*(Зіма адыходзіць.)*

*Вядучы.*

Вясна-красна, на чым прыйшла?

*Вясна.*

На сахе-баране,
На жэрдачцы,
На баразёнцы,
На жытнім каласку,
На пшанічным піражку.

*Вядучы.*

Вясна-красна, што ты нам прынесла?

*Вясна.*

Дзяўчатам — па шаўковай хустачцы,
Маленькім дзеткам — па яечку.
Старычкам, мужычкам —
Грыбоў, ягад па барах.
Маладым жонкам — па сыночку,
Маладым хлопцам — па канёчку,
Міру ўсім ды здароўечка.

*Вядучы.*

Ну вось, справе — час, на пацеху — гадзіна.
Заўтра чакае дзень клапот,
На развітанне — карагод.

## Матэрыялы да заняткаў

Са старажытных часоў у жыцці чалавека вылучаліся тры галоўныя падзеі: нараджэнне, шлюб і смерць. Кожнай сям'і заўсёды хацелася, каб у іх нарадзіўся здаровы, моцны, прыгожы, добры, разумны і сумленны нашчадак. Імкнучыся запраграміраваць гэтыя якасці ў дзіцяці, у старажытнасці звярталіся да магіі. Па народных павер'ях, на нараджэнне дзіцяці шмат у чым уплывала павітуха. Яна давала жанчыне парады, якіх правіл паводзін прытрымлівацца ў час цяжарнасці. На ролю павітухі звычайна выбіралі дасведчаную знахарку, якая валодала прыёмамі аблягчэння родаў і ведала замовы. Лічыцца, што ў перыяд родаплемяннога ладу гэта была старэйшая прадстаўніца сям'і.

Павітуха прымала роды, рабіла магічныя засцерагальныя дзеянні, каб абараніць дзіця і маці ад злых сіл. Яна праводзіла рытуальнае купанне дзіцяці, першай прымала яго пасля хрышчэння з рук хросных бацькоў.

Хросных трэба было выбраць праз некалькі дзён пасля нараджэння дзіцяці. Пры радавым ладзе, калі сваяцтва вялося па жаночай лініі, абавязкі хроснага бацькі выконваў брат маці. Ён быў таксама сватам жаніха і вёў перамовы з сям'ёй нявесты. Хросная маці выконвала тыя ж функцыі.

У старадаўнія часы нованароджанага да хрышчэння ніколі не спавівалі — яго захіналі ношанай кашуляй бацькі або маці. Існаваў яшчэ адзін цікавы звычай. Дзіця клалі на парог, бацька павінен быў яго падняць, пацалаваць і такім чынам прызнаць сваім. На хрысцінах пад канец абеду падавалі рытуальную «бабіну» кашу. Да таго, як пачыналі частаваць гасцей, бацьку нованароджанага прымушалі з'есці лыжку гэтай стравы, змешанай напалову з соллю. Паколькі роднасць вялася па жаночай лініі і, адпаведна, дзіця належала роду маці, бацька павінен быў пацвердзіць сваю сувязь з ім. Для гэтага і выконваліся пэўныя сімвалічныя рытуалы.

У першы дзень жыцця немаўляці праводзіўся абрад састрыжэння валасоў, які ўспрымаўся як ахвярапрынашэнне. Але часцей гэтыя дзеянні рабілі, калі дзіцяці спаўняўся год.

Шлюб з'яўляўся важнай падзеяй у жыцці маладых людзей. У старадаўнія часы зарадзіліся такія яго віды, як выкраданне і купля-продаж нявесты. Потым гэтыя звычаі замяніў шлюб па дамоўленасці, калі за нявесту плаціўся выкуп. Пра яго памеры дамаўляліся з бацькамі нявесты пасланцы жаніха. Калі дасягалася згода, то праз нейкі час адбывалася вяселле. Браць шлюб родзічам забаранялася.

На вяселлі было прынята ўсаджваць нявесту на звярыную шкуру. Гасцям раздавалі вясельны каравай, які з'яўляўся абавязковым атрыбутам свята і сімвалізаваў дабрабыт будучай сям'і, яе шчаслівую долю. Спачатку ў гатаванні каравая ўдзельнічалі ўсе члены радавой абшчыны, пазней — усе члены сельскай абшчыны. Вяселле суправаджалася карагодам. Карагод — від мастацкай творчасці, які спалучае танец, песню, гульнёвае дзеянне і суправаджаецца музыкай.

Пахаванне, або хаўтуры, звязана з праводзінамі ў апошні шлях нябожчыка. У гэтым абрадзе доўга захоўваліся язычніцкія элементы. Гэта выпальванне глебы перад насыпкай кургана, гатаванне рытуальнай ежы, трызна, выпрастаныя ўздоўж цела рукі памерлага (у хрысціянскай традыцыі рукі нябожчыка складваюцца на жываце). Пахаванне суправаджалася галашэннем. Продкі беларусаў верылі ў бессмяротнасць душы і тое, што чалавек пасля смерці можа дапамагаць або шкодзіць жывым.

Царква не пазбаўляла пахавальны абрад язычніцкіх праяўленняў, а прыстасоўвала іх да новага рытуалу.

Культ продкаў — адзін з самых галоўных для беларусаў. Культ — гэта пашана і памяць, традыцыі і карані. Продкі ўспрымаліся як нябачна прысутныя ў кожным моманце жыцця, як заступнікі і абаронцы. Беларусы лічылі, што брацца за важную справу без іх дазволу нельга. Пад культам продкаў

разумеюць не толькі веру, але і абрады ўшаноўвання роду, сістэму паводзін і народнай этыкі.

Ушаноўванне продкаў звязана са святкаваннем Дзядоў (роданачальнікаў) і правядзеннем памінальнага дня пасля Вялікадня — Радаўніцы. Памерлы станавіўся «прашчурам», які клапаціўся пра дабрабыт сваёй сям'і. З прыняццем хрысціянства абрад ушаноўвання продкаў ускладніўся хрысціянскімі элементамі і пачаў праводзіцца некалькі разоў на год. Глыбокая пашана памерлых родзічаў фарміравала пэўныя маральна-этычныя нормы ў грамадстве. Код роду — гэта я — сям'я — духі продкаў — дом — зямля — Радзіма.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

*Інтэлектуальны турнір «Звычаі і абрады беларусаў».*

Удзельнічаюць 2—4 каманды. Гульцам прапануецца табло з рубрыкамі і схаванымі пытаннямі. Кожнае пытанне ацэньваецца ад 10 да 50 балаў. Матэрыял гульні афармлены ў выглядзе прэзентацыі.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Нараджэнне дзіцяці | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Шлюб | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Пахавальны абрад | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |

Каманда, якая пачынае гульню, выбірае любое пытанне з любой рубрыкі (напрыклад, пытанне на 40 балаў у рубрыцы «Шлюб»). Першай адказвае тая, якая хутчэй падала сігнал (напрыклад, падняла сігнальную картку або сцяжок). Калі адказ правільны, камандзе налічаюцца балы і даецца права выбару наступнага пытання. У выпадку няправільнага адказу свае веды дэманструе другая каманда. На разважанне адводзіцца адна мінута. Калі па завяршэнні гэтага часу адказу не будзе, балы згараюць, ход пераходзіць. Перамагае тая каманда, якая набярэ больш ачкоў. У якасці балаў можна раздаваць папяровыя зоркі, сонейкі і інш.

*НАРАДЖЭННЕ ДЗІЦЯЦІ*

**10** Як называлі жанчыну, якая дапамагала прымаць роды? *(Павітуха.)*

**20** Хто першапачаткова выконваў абавязкі хроснага бацькі? *(Брат маці.)*

**30** Які абрад суправаджаўся гатаваннем рытуальнай ежы пад назвай «бабіна» каша? *(Хрышчэнне дзіцяці.)*

**40** Чаму бацька не меў праў на сваё дзіця? *(Роднасць вялася па мацярынскай лініі.)*

**50** Вядома, што ў кульце язычніцкага бога жывёлагадоўлі Вялеса важнае значэнне мелі шэрсць і валасы. Як гэта было звязана з нараджэннем дзіцяці? *(Абрад астрыжэння валасоў у немаўляці.)*

*ШЛЮБ*

**10** Якія віды шлюбу існавалі ў даўнія часы? *(Выкраданне і купля-продаж нявесты.)*

**20** Хто гатаваў каравай на вяселле? *(Усе члены абшчыны.)*

**30** Чаму забараняўся шлюб паміж родзічамі? *(Гэта магло справакаваць нараджэнне хворых дзяцей.)*

**40** Што сімвалізаваў вясельны каравай? *(Дабрабыт, шчасце.)*

**50** Абавязковым атрыбутам вяселля з'яўляліся каравай і ... *(карагод)*.

*ПАХАВАЛЬНЫ АБРАД*

**10** Продкі беларусаў верылі ў... *(бессмяротнасць душы)*.

**20** Другая назва пахавальнага абрада. *(Хаўтуры.)*

**30** Пахаванне заўсёды суправаджалася ... родзічаў. *(Галашэннем.)*

**40** Да язычніцкіх элементаў пахавання можна аднесці... *(выпальванне глебы, рытуальную ежу, трызну па нябожчыку)*.

**50** Чым адрознівалася хрысціянскае пахаванне ад язычніцкага? *(У хрысціянскай традыцыі рукі нябожчыка складваюць на жываце, у язычніцкай — яны выпрастаны ўздоўж цела.)*

*Тэма 7*

# *Загадкі геаграфічных назваў Беларусі. Тапанімічная спадчына*

## Метадычныя рэкамендацыі

Вучні выконваюць заданне 1. Педагог тлумачыць ключавыя словы заняткаў. Затым дзеці пераходзяць да задання 2. Настаўнік агучвае інфармацыю па тэме з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Вучні выконваюць заданні 3—6, 8. Падчас працы над заданнямі 3, 8 можна выкарыстоўваць мясцовы краязнаўчы матэрыял.

Заданне 7 прапаноўваецца вучням як папераджальнае. Яго можна выконваць і ў выглядзе гульні «Цікавыя легенды і паданні». Кожная каманда рыхтуе прэзентацыю, дзе змяшчае ўрыўкі з легенд і паданняў пра паходжанне назваў вёсак і гарадоў, адпаведныя фатаграфіі, ілюстрацыі. Гульцы-сапернікі павінны здагадацца, пра якія мясціны ідзе гаворка. Каманда, якая знайшла больш цікавых легенд і паданняў і пры гэтым правільна адказала на пытанні сапернікаў, лічыцца пераможніцай. Вучням можна прапанаваць загадзя выканаць творчую работу (№ 9), у рамках яе правесці конкурс артыкулаў, а затым аб’яднаць іх у часопісе «Займальная геаграфія» або насценгазеце.

## Матэрыялы да заняткаў

Словы, якія абазначаюць геаграфічныя назвы, называюцца тапонімамі. Іх паходжанне, значэнне, развіццё, сучасны стан вывучае навука тапаніміка. Тапонімы адлюстроўваюць духоўную і матэрыяльную культуру народа, асаблівасці яго гісторыі, прыродна-кліматычных умоў пражывання. Назвы — неад’емная частка нашай спадчыны, своеасаблівы сімвал, у якім спалучаюцца здабыткі і светапогляд народа.

Часта бывае, што геаграфічныя назвы звязаны з гістарычнымі падзеямі або мясцовым дыялектам. Напрыклад, назва в. Завідаўка паходзіць ад рускага слова *завидовать*. Менавіта яго ўжываюць мясцовыя жыхары, нягледзячы на існаванне беларускамоўнага адпаведніка *зайдросціць*. Нашы продкі многа займаліся будаўніцтвам. Таму заканамерна ўжыванне назваў, утвораных ад асновы *буда*: Высокая Буда, Буда-Кашалёва, Баравая Буда і інш. У XI—XVIII стст. незалежнасць паселішчаў абазначалі словамі *слабада* або *слабодка*. Амаль усе яны знаходзяцца ва Усходняй і Цэнтральнай Беларусі. Напрыклад, Красная Слабада, Глінная Слабада, Новая Слабада.

Назву аднаго з відаў паселішч нашых продкаў — гарадзішча — таксама можна знайсці на сучаснай геаграфічнай карце: напрыклад, гарады Гарадок, Давыд-Гарадок, вёска Сёмкаў Гарадок.

Жыццё чалавека было заўсёды цесна звязана з вадой, людзі імкнуліся будаваць свае паселішчы каля рэк і азёр. Таму давалі сваім вёскам і гарадам іх назвы. Напрыклад, Жадунька (р. Жадунька), Зэльва (р. Зэльвянка), г. Вілейка (р. Вілія).

Неабжытыя землі заўсёды вабілі шукальнікаў лепшай долі, а таксама збеглых людзей. Выбраўшы месца даспадобы, яны рубілі хаты, заводзілі гаспадарку. Праз некаторы час падцягваліся да іх іншыя перасяленцы. Разам яны стваралі вёсачкі. Гэтыя паселішчы звычайна называліся ў гонар таго, хто пасяліўся там першы. Так з’явіліся ў нас вёскі Аляксандраўка, Сямёнаўка, Васілёўка, Мікалаеўка, Барысавічы, Тарасавічы, Юравічы, Раманаўка, Раманава, Васькаўка і інш. Назвы многіх вёсак пайшлі ад асаблівасцей рэльефу мясцовасці, форм пабудоў: напрыклад, Залессе, Ясная Паляна, Высокае. Шмат тапонімаў утворана ад назваў дрэў: Бярозаўка, Бяроза, Альхоўка, Альшаны, Альховае, Хвойнікі, Дуброва, Дуброўна, Дубніцкае, Ракітнае,

Грабаў і інш. Указваюць назвы вёсак на звяроў і птушак, што вадзіліся ў наваколлі: Барсукі, Сакалоўка, Сабалёўка, Рысін, Кукуеўка, Мядзвёдаўка.

На беларускіх землях можна сустрэць тапонімы Гута, Гутка, Рудня. Гута — металургічная або шкляная вытворчасць, якая атрымала распаўсюджванне ў XIV—XVI стст. Назва Рудня можа быць звязана з дзейнасцю ў гэтых мясцінах невялічкіх прадпрыемстваў па выплаўцы жалеза з балотнай руды.

Сярод распаўсюджаных назваў населеных пунктаў тыя, што сведчылі пра занятак жыхароў або нагадвалі пра вырабы, якімі славіліся мясцовыя майстры: Кавалёўка, Свірэль, Уздзевічы, Брылі, Промыслы, Качэргі і інш.

Тыповая з'ява для тапаніміі — каляровыя абазначэнні. Шырока распаўсюджаны тапонімы, у складзе якіх ёсць прыметнікі *белы* (Белы Мох, Белыя Лужы) або *чорны* (Чорны Ручай, Чорны Засценак). Сустракаюцца геаграфічныя назвы з прыметнікамі *зялёны* (Зялёны Востраў, Зялёны Прудок), *чырвоны* (Чырвоныя Нівы, Чырвонае Поле), *сіні* (Сіні Востраў, Сіняк, Сіняе Балота, Сіні Ручай, Сіняўшчына).

Да прыходу і рассялення славян значную частку тэрыторыі сучаснай Беларусі займалі балты. Можна ўзгадаць цэлы шэраг балцкіх па паходжанні назваў: Бакшты, Балойкі, Кімяны, Кемяны, Домуці, Жвірблі. Сустракаюцца таксама тапонімы цюркскага (Канашы, Карацк, Кобызі, Мурза) і фіна-ўгорскага (Еўлашы, Іжа, Іканы, Іса, Койры) паходжання.

Да аднаго з падраздзелаў тапанімікі адносіцца гідраніміка, якая вывучае гідронімы (ад грэч. *hudor* — вада, *onyma* — імя), шляхі і заканамернасці іх узнікнення, функцыянаванне, тэрытарыяльнае і моўнае распаўсюджванне. Гідранімія — найбольш старажытны пласт тапанімічнай лексікі, які ўяўляе вялікую каштоўнасць не толькі для мовазнаўства, але і гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, геаграфіі, геалогіі. Пераважная большасць назваў рэк (Верхіта, Волча, Гайна, Грыўда, Друць,

Клёва, Лучоса, Мытва, Нача, Палата, Ула, Усяжа, Эса і інш.) захавалі карані і канчаткі, характэрныя для балцкіх моў — літоўскай і латышскай. Можна прывесці і іншыя назвы з балцкай гідраніміі: Асвея, Дрысвяты, Лосвіда, Муйса, Нарач, Усвяча і інш. Найбольш часта сустракаюцца гідронімы, звязаныя з балтамі, у басейнах рэк Бярэзіны (Мена, Ольса, Серуч, Уса) і Сожа (Рэхта, Рэста, Сноў, Туросна).

Вядома, што тэрыторыю Беларусі на поўдні ад Прыпяці славяне засялілі ўжо ў VII—VI стст. да н. э. Пра гэта сведчаць старажытныя славянскія гідронімы: Стыр, Стубла, Стубель, Сваратоўка, Родча, Рубча і інш. Некаторыя ўральскія, фіна-ўгорскія гідронімы на поўначы Беларусі (Дзвіна, Свір, Мардва і інш.) былі запазычаны балцкай групай індаеўрапейцаў. Утварыліся гібрыдныя балта-фінскія гідронімы: Лынтупка, Дрыса. На левабярэжжы Дняпра, у басейнах Дзясны і Іпуці, вылучаюць індаіранскія гідронімы, распаўсюджанне якіх звязана са скіфамі і іх папярэднікамі: Сейм, Серабоўт, Харопуць, Эсмань, Бася, Вець, Вейна, Карма, Стомець. Кельцкія гідронімы сустракаюцца ў басейне р. Лясная: Лютка і Точыя.

Часцей за ўсё назву рацэ або возеру давалі па найбольш характэрнай прымеце: колеры, празрыстасці, смаку вады (Белая, Святліца, Гаркаватка), асаблівасцях плыні (Змейка), характары дна і берагоў (Каменка), відах жывых істот — насельнікаў вадаёмаў (Бобрык, Ласосна) і расліннасці па берагах і ў пойме (Бярэзіна, Альшанка).

### Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў

**Заданне 1.** Вучні расшыфроўваюць ключавыя словы да тэмы заняткаў. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць на адпаведныя літары беларускага алфавіта.

**Т 1 17 1 15 10 14 10 12 а**

**Т 1 17 16 15 10 м**

**Заданне 2.** Вучні высвятляюць, пра што ідзе размова ў тэксце. Тэкст зачытваецца без апошняга сказа.

Там, дзе цяпер стаіць Гомель, пасярэдзіне ракі Сож некалі было намыта шмат пяску. Каб плыты і баркі, што плылі па рацэ, не ўзбіліся на мель, на беразе каля гэтага месца заўсёды стаяў чалавек і крыкам папярэджваў:

— Го! Мель! Го! Мель!

Вось і пайшло — Гомель.

**Заданне 3.** Гульня «Паходжанне назваў». Удзельнічаюць некалькі каманд. Кожная атрымлівае канверт з назвамі гарадоў і вёсак, малюнкі, якія адлюстроўваюць версіі іх паходжання. Удзельнікі гульні павінны суаднесці назвы з адпаведнай ілюстрацыяй. Ілюстрацыі павінны згадваць гістарычныя падзеі, славутых дзеячаў, рэкі і азёры, асаблівасці ландшафту, жывёл і птушак, расліны і аб'екты матэрыяльнай культуры, промыслаў. Перамагае каманда, якая правільна выканае заданне.

*Назвы:* Барысаў, Тураў, Заслаўе, Брэст, Навагрудак, Ліда, Пінск, Нарва, Залессе, Замошша, Забор'е, Высачаны, Вілейка, Бесядзь, Бортнікі, Ганчары, Муляры, Плёсы, Балотная, Свіраны, Бобр, Дразды, Казейкі, Жораўка, Рэпкі, Рэпнікі, Дуброўна, Жорнаўка, Шклоў, Друцк, Іўе, Полацк, Слуцк, Ядловічы.

**Заданне 4.** Вучні разважаюць, адкуль пайшлі назвы *Дубава, Дубінкі, Дубовы Лог, Дубоўцы, Дубяні, Дуброва, Дубрава, Дуброўка*.

**Заданне 5.** З дапамогай адміністратыўнай карты Беларусі (можна выкарыстоўваць карту свайго рэгіёна) вучні прыводзяць прыклады геаграфічных назваў, звязаных з дзейнасцю насельніцтва беларускіх зямель. Напрыклад, *Бортнавічы, Кавалі, Карасі, Ткачы*.

**Заданне 6.** Вучні разгадваюць крыжаванку. Вызначаюць паходжанне назваў беларускіх гарадоў — абласных цэнтраў.




1. Назва гэтага горада паходзіць ад назвы рыбы *мень*, якая вадзілася ў рацэ Менцы.
2. Лічыцца, што назва гэтага горада ўтварылася ад славянскага слова *град*. Яно абазначала абгароджанае месца, у цэнтры якого пасяляліся людзі, будавалі замкі, крапасныя вежы.
3. Назва горада паходзіць ад слова *бяроста*.
4. Назва гэтага горада ўтварылася ад слова *вити* — нізіна, багністая мясціна, балота.
5. Назва горада паходзіць ад слова *гоміла*.
6. Назву горада звязваюць з уласным імем Магіла.

**Заданне 7.** Вучні знаёмяцца з легендамі і паданнямі[6] пра паходжанне назваў беларускіх гарадоў, выкарыстоўваючы QR-код. Пераказваюць іх змест аднакласнікам.

**Заданне 8.** Конкурс «Адгадай». Удзельнічаюць дзве каманды. З дапамогай легенд і паданняў гульцам неабходна вызначыць паходжанне назваў гарадоў і вёсак.

Як сведчыць легенда, гэта назва пайшла з далёкай даўніны. Сярод дрымучых лясоў і балот, праз якія нельга было прайсці ні

[6] Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэд. А. С. Фядосік. — 2-е выд., дап. і дапрац. — Мінск : Беларуская навука, 2005. — 552 с.

чалавеку, ні зверу, знаходзілася мястэчка. Вакол яго вадзіліся невялікія звяркі — барсукі.

Людзі расказваюць, што жыў некалі ў сваім маёнтку за Сожам пан. Была ў яго дачка-прыгажуня Ганначка. Пакахала яна хлопца Ігната. Але пан не прызнаваў гэтага кахання. Ён разлучыў сваю любімую дачку з хлопцам: адсяліў яе на другі бераг Сожа. З цягам часу тое паселішча стала называцца ... . А недалёка пабудаваў сабе жытло Ігнат. Пазней на тым месцы ўтварылася вёска ... .

**Заданне 9.** Творчая работа.

*І варыянт.* Вучням трэба падрыхтаваць артыкул у часопіс, адрасаваны чацвёртакласнікам, пра ўзнікненне назвы населенага пункта, у якім яны пражываюць.

*Патрабаванні да творчай работы:*

1) артыкул павінен раскрываць змест заяўленай тэмы;
2) неабходна падабраць фатаграфіі, малюнкі, карты, інфаграфіку або крыжаванку, віктарыну, апісанне гульні, галаваломку, размалёўку, коміксы і г. д. па тэме;
3) артыкул павінен улічваць патрэбы чытацкай аўдыторыі;
4) пры падрыхтоўцы артыкула можа быць выкарыстана не больш за 3—4 шрыфты:
   а) для загалоўкаў;
   б) асноўнага тэксту;
   в) падзагалоўкаў, каментарыяў, урэзак і г. д;
5) аб'ём артыкула — 2—4 старонкі фармату А4, размяшчэнне тэксту — двухбаковае;
6) форма прадстаўлення работы:
   а) размяшчэнне ў сетцы інтэрнэт пры дапамозе вэб-сэрвісаў;
   б) прэзентацыя ў друкаваным выглядзе.

Крытэрыі ацэнкі артыкулаў:

1. Артыкул складаецца з трох асноўных частак: уводзіны (выразна абазначана тэма), галоўная частка (падрабязна апісаны меркаванні вучня па тэме), заключэнне (ёсць вывад, які злучае тэкст у адно цэлае).

2. Выкарыстана 700 слоў і болей.
3. Артыкул напісаны без памылак.

*II варыянт.* Вучням прапануецца падрыхтаваць і правесці з аднакласнікамі, чацвёртакласнікамі віктарыну «Займальная геаграфія Беларусі».

Пытанні (заданні) для віктарыны могуць быць наступныя.

- Успомніце назвы населеных пунктаў Беларусі, якія складаюцца з двух слоў.
- Назвы якіх населеных пунктаў і рэк Беларусі заканчваюцца на мяккі знак?
- Якія населеныя пункты Беларусі маюць у сваёй назве суфікс «ск»?
- Разгадайце галаваломку «Геаграфічныя назвы Беларусі, якія канчаюцца на “ічы”».

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **У** | **Х** | | | | | | | | |
| **К** | **А** | | | | | | | | | |
| | | **І** | **М** | **А** | | | | | | |
| **С** | **М** | | | | **В** | | | | | |
| | **А** | | **О** | **П** | | | | | | |
| **Б** | | **Ш** | | | | | **В** | | | |

- Гульня «Незаконачаныя сказы». Завяршыце прыведзеныя ніжэй сцвярджэнні або ўстаўце прапушчаныя словы:
  а) Пінск, Тураў, Мазыр размешчаны на берагах ... .
  б) ... — самы старажытны горад Беларусі.
  в) Згодна з паданнем, слова Гомель паходзіць ад спалучэння слоў «...! ...!».
  г) Назва Рудня азначала месца здабычы жалезнай ... .
- Гульня «Геаграфічны слоўнік». На кожную літару алфавіта прапануецца па некалькі геаграфічных назваў населеных пунктаў, рэк, азёр. Вядомы толькі першая і апошняя літары. Вучням трэба назваць слова.

*Тэма 8*

# *Хрысціянства — аснова духоўнай спадчыны Беларусі*

## Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапаноўвае вучням разгадаць крыжаванку (№ 1), каб вызначыць ключавое слова тэмы заняткаў. Далей, выкарыстоўваючы інфармацыю з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў», расказвае пра хрысціянства. Вучні выконваюць заданні 2—4. Да кожнага з іх педагог можа прывесці дадатковыя звесткі па тэме. Далей дзеці пераходзяць да задання 8. Настаўнік адзначае, што да з'яўлення хрысціянства на беларускіх землях панавала іншая рэлігія. Вучні разгадваюць рэбус і вызначаюць, пра якую рэлігію ідзе размова (№ 5). Далей яны выконваюць заданні 6, 7. Завяршыць вывучэнне тэмы можна інсцэніроўкай свята «Юр'еў дзень» (№ 9), якая рыхтуецца загадзя. Вучням таксама можна прапанаваць загадзя падрыхтаваць творчую работу (№ 10).

## Матэрыялы да заняткаў

Прыняцце хрысціянства на землях усходніх славян мела важнае гістарычнае значэнне. Яно супала па часе з усталяваннем дзяржаўнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі і, безумоўна, станоўча паўплывала на ход гэтага працэсу. Хрысціянская вера ў адзінага Бога Ісуса Хрыста адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве. Духавенства падтрымлівала княжацкае кіраванне, асвячала яго, было апорай. Хрысціянскае веравучэнне сцвярджала, што ўсякая ўлада ад Бога, а ўсё, што ад Бога, з'яўляецца свяшчэнным і нязменным.

Распаўсюджванне хрысціянства мела значныя сацыяльна-эканамічныя і культурныя вынікі для беларускіх зямель. Сувязі з хрысціянскімі краінамі, асабліва з Візантыяй, садзейнічалі развіццю рамяства і гандлю. Шырокі размах атры-

мала царкоўнае будаўніцтва. У сувязі з гэтым сталі з'яўляцца рамеснікі, якія валодалі новымі відамі работ: вырабам цэглы, абчэсваннем каменю. Паступова фарміравалася саслоўе духавенства. Гэта былі самыя адукаваныя і ўплывовыя людзі, якія аказвалі ўплыў на ўсе сферы жыцця грамадства.

Знаёмства з візантыйскай культурай стала стымулам для развіцця на беларускіх землях адукацыі і літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Пры цэрквах і манастырах адкрываліся школы, перапісваліся кнігі. Новыя храмы ўяўлялі сабой прыгожыя і велічныя будынкі. Іх убранне далучала веруючых людзей да высокага мастацтва.

Паляпшаўся маральны стан грамадства. Хрысціянскія запаведзі садзейнічалі наладжванню добрых адносін паміж людзьмі. Такія язычніцкія традыцыі, як ахвярапрынашэнне, мнагажэнства, кроўная помста, паступова знікалі. Аднак хрысціянства распаўсюджвалася павольна, таму язычніцкія вешчуны яшчэ доўга былі ў пашане сярод прадстаўнікоў княжацкай дынастыі, доўгі час выбіралі ідалапаклонства простыя людзі. Функцыянавалі язычніцкія свяцілішчы. Гісторыкі называюць гэту з'яву двухвер'ем.

Царква не магла выцесніць з народнай самасвядомасці старажытныя вераванні. Таму вымушана была сумяшчаць свае святы з абрадамі язычніцкага календара. Напрыклад, у хрысціянскім царкоўным календары трывала замацаваліся элементы жывёлагадоўчага культу. Яскрава сведчыць пра гэта традыцыя святкавання Юр'ева дня. Юр'я ў хрысціянскі перыяд замяніў Ярылу і лічыўся апекуном жывёлы і земляробства. Таму гэта свята было адным з найбольш адметных для сялянства, з ім звязваўся першы выпас жывёлы. Праводзіўся абрад выезду на белым кані ў поле Ярылы. У яго ролі выступаў малады прыгожы хлопец у белым адзенні. Дзяўчаты вадзілі вакол яго карагоды і спявалі. Але ў абрадавых песнях, заклінаннях пад уплывам хрысціянства пачалі ўжо згадвацца імёны Хрыста, Багародзіцы і святых.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць крыжаванку. Вызначаюць, пра што пойдзе размова на занятках.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | | | | | | | | | | | |
| **2** | | | | | | | | | | | |
| **3** | | | | | | | | | | | |
| **4** | | | | | | | | | | | |
| **5** | | | | | | | | | | | |
| **6** | | | | | | | | | | | |
| **7** | | | | | | | | | | | |
| **8** | | | | | | | | | | | |
| **9** | | | | | | | | | | | |
| **10** | | | | | | | | | | | |
| **11** | | | | | | | | | | | |
| **12** | | | | | | | | | | | |

1. Культавы будынак, прызначаны для правядзення набажэнстваў і рэлігійных абрадаў.
2. Адступленне ад традыцый пануючай рэлігіі, веравучэнне, заснаванае на гэтых адхіленнях.
3. Традыцыйнае каталіцкае богаслужэнне, якое ўзнаўляе ў памяці хрысціян асноўныя моманты пакут Ісуса Хрыста на шляху да Галгофы.
4. Імя Госпада, памазаннік.
5. Дзень, у які нарыхтоўваюць бярозавыя венікі для лазні. Іншыя назвы свята — Сёмуха, Зялёныя Святкі, Тройца.
6. Ступень (чын) анёла, другая пасля серафімаў.
7. Як называецца царкоўная акруга, на чале якой стаіць епіскап?
8. Рэлігійны абрад, адно з найважнейшых хрысціянскіх таінстваў, галоўны атрыбут якога — вада.
9. Алтарная перагародка, якая складаецца з аднаго або некалькіх радоў абразоў (ікон).

10. Форма рэлігійнага кіравання з патрыярхам на чале. Вядомы Маскоўскі, Сафійскі, Кіеўскі, Белградскі ... .
11. Пераход чалавека, хрышчонага ў праваслаўі, у іншую веру.
12. Старабеларуская назва заканадаўства, якое рэгулюе рэлігійныя адносіны.

**Заданне 2.** З дапамогай рэбуса і тэкставага ўрыўка вучні вызначаюць, пра што ідзе гаворка.

Вядомы Тураў, Пагост, Хлупін, Перароў, Верасніца, Аздамічы і інш. Яны ахоўваюць ад розных хвароб. Вышыня іх вагаецца ад 1 да 2 м, шырыня — ад 0,6 да 1 м. Адзін з іх зараз захоўваецца ў Тураўскай царкве.




**Заданне 3.** Вучні расшыфроўваюць формулу, выкарыстоўваючы тэзіс: «Хрысціянская вера ў адзінага Бога Ісуса Хрыста адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве».

**ХВ = АБ + АК**

**Заданне 4.** Вучні тлумачаць сэнс наступных прыказак: «Як трывога, тады да Бога», «Двум багам не служыць», «Хто ў Бога верыць, той не ашуканы», «Нічога мы не павінны рабіць супраць Бога і нічога — без Бога».

**Заданне 5.** Вучні разгадваюць рэбус. Вызначаюць, якая рэлігія была распаўсюджана на беларускіх землях да з'яўлення хрысціянства.



**Заданне 6.** Вучні разважаюць над пытаннем «Як вы лічыце, хто такія вешчуны?».

**Заданне 7.** Вучні чытаюць евангельскую прычту. Вызначаюць яе сэнс. Прыдумваюць сваю развязку (фінал) прытчы. Параўноўваюць яе з заключнай часткай.

Ня адзін чалавек багаты быў,
Каторы ў раскошы піваў і ядаў,
У дарагом сядзенні заўжды прахаджаў,
На Госпада Бога ён ніц ня ўпаваў,
На святыя царквя Божыя ня саздаваў,
Нішчых, калек ён ня падараваў,
Брата свайго Лазара за брата ня меў.
Прыходзіць святы Лазар да багатага.
— Ой, браця, мой браця, сільны, багаты,
Адна нас матка з табою радзіла,
Ды ня адну долю нам дала:
Табе, браця, Бог даў сільне багацтво,
А мне Бог даў, браце, калецтво, убоство.
Ня прашу, браця, срэбра і злата,
Толькі прашу трое рачэй зямлі,
Першай зямлі — хлеба і солі,
Альбо хаця, браця, зімнае вады.
— А ні ёсьць жа то ты мой брат,
Ёсьць ты гнілы пёс,
Ёсьць у маім дварэ псы — то твае браты.

*Развязка прытчы.* Бедны Лазар і яго багаты брат памерлі. Першы трапіў у рай, другі — у пекла. Пакутуючы ў пякельным агні, багач просіць Бога паслаць Лазара, каб той асвяжыў яго «арданскай вадой» (з ракі Іардан). Але пачуў адказ: паміж багатым і бедным узнікла прорва, якую нельга перайсці.

**Заданне 8.** Вучні складаюць воблака слоў на тэму «Хрысціянства» або выкарыстоўваюць урывак тэксту з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў».

**Заданне 9.** Дзеці знаёмяцца з каляндарнымі абрадамі продкаў беларусаў (інсцэніроўка свята «Юр'еў дзень»).

*Удзельнікі:* Юрый (1 вучань), конь (2 вучні), дзяўчаты (5 вучаніц).

*Дзяўчаты спяваюць песню:*

Юр'я, устань рана, Юр'я,
Юр'я, умыйся бела.
Юр'я, ідзі ў стайню, Юр'я,
Юр'я, сядлай каня.
Юр'я, едзь у поле, Юр'я,
Юр'я, адамкай зямлю.
Юр'я, выпусць росу, Юр'я,
Юр'я, на цёплу зямлю.

*З'яўляецца Юр'я на кані. Дзяўчаты становяцца ў карагод, вымаўляюць заклінанне на добры ўраджай:*

Дай у рай, маці, ключы,
Да подай, маці, ключы,
Шоб небо отворыці
Да росіцу пусціці.
Ведом-ведом корогод,
Сам Бог наперод,
А у корогода сын воевода,
А у коромыслі добрые мыслі.
Дзе корогод ходзіць,
Там Бог жыто родзіць,
А дзе не бывае,
То там улягае.
Ведом-ведом корогод,
Сам Бог наперод,
Дзе корогод уецца,
Там жыто ўдаецца,
А дзе не бывае,
Там жыто ўлегае.
Зродзі, Божэ, жыто
Да на новое лето,
Да на жыто на пшэніцу,
На усяку пашніцу.

**Заданне 10.** Творчая работа.

*I варыянт.* Вучням прапаноўваецца падрыхтаваць фотавыставу «Унікальныя хрысціянскія святыні беларускіх зямель». Фотаздымкі неабходна падпісаць, указаць стагоддзе пабудовы, месца знаходжання, матэрыял, з якога пабудавана архітэктурная каштоўнасць, і г. д.

*II варыянт.* Вучні ствараюць у Google-форме і праводзяць анлайн-віктарыну па тэме «Духоўная музыка».

**Інструкцыя па стварэнні анлайн-віктарыны**

1. Адкрыйце файл у Google-формах.
2. Націсніце «Настройкі» ў верхняй частцы формы.
3. Уключыце параметр «Тэст», увядзіце неабходную інфармацыю.

Пытанні (заданні) для анлайн-віктарыны могуць быць наступныя.

- Гэта самы вялікі інструмент у свеце. Ён часта гучыць у каталіцкім храме.
- Праваслаўнае богаслужэнне заўсёды суправаджае ... .
- У 989 г. у Полацку, Тураве і Віцебску склаліся школы ... распеву.
- Знаменны распеў, заснаваны на сістэме з ... ладоў.
- Асаблівасцю знаменнага распеву з'яўляецца выкарыстанне ... складу.
- З X ст. у каталіцкае богаслужэнне пачалі ўстаўляць гімнаграфічныя тэксты, якія называюць ... .
- Які сабор забараніў выкарыстоўваць у каталіцкім богаслужэнні тропы і секвенцыі[7] (выключэнні — «Велікодная ахвяра», «Прыйдзі, Дух Святы», «Хвалі Сіён», «Дзень гневу»)?
- Вакальнымі жанрамі праваслаўнага богаслужэння, акрамя псалмоў, з'яўляюцца ... .

[7] Прыём, які зводзіцца да паслядоўнага паўтарэння дадзенай меладычнай фразы.

- Якія новыя жанры з’явіліся ў царкоўнай музычнай культуры XV ст.?
- Пачынаючы з XV ст. псалмы і канты ўваходзілі ў склад зборнікаў, якія на беларускіх землях атрымалі назву ... .

## *Тэма 9*
## *Чалавек і свет у хрысціянскай духоўнай спадчыне насельніцтва беларускіх зямель*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог выкарыстоўвае інфармацыю з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Згодна з ёй выконваюцца заданні 1—5. Заданне 6 можна прапанаваць вучням выканаць на канікулах.

*Прыклад інструкцыі па стварэнні папяровага календара.*

Для праекта спатрэбіцца 6 лістоў акварэльнай паперы фармату А4 або любога шчыльнага кардону для старонак з назвамі месяцаў; атласная ці любая іншая дэкаратыўная стужка або 2 невялікія кольцы для альбома; 1 ліст паперы для вокладкі 30,5 × 30,5 см; кардон 23 × 42 см; клей ПВА або клей-аловак; канцылярскі дзіркакол пад дзве круглыя адтуліны; лінейка і просты аловак. Гатовы макет з рубрыкамі неабходна раздрукаваць.

Алгарытм работы:

1. Падрыхтаваць шаблоны старонак.
2. Стварыць аснову для календара з кардону.
3. Сабраць усе элементы ў адзінае цэлае.

Шэсць лістоў разрэзаць пасярэдзіне, каб атрымалася 12 старонак. З дапамогай дзіркакола зрабіць на іх адтуліны. Выразаць з паперы два прамавугольнікі памерам 22 × 15 см — будучыя форзацы календара. З ватману выразаць ліст памерам 23 × 42 см. Да яго прыклеіць прамавугольнік. Затым скласці трохвугольнік. У яго верхняй частцы зрабіць дзве

адтуліны. 20 см стужкі разрэзаць на роўныя адрэзкі. Кожны працягнуць з-пад трохвугольнай асновы праз старонкі, завязаць унутры асновы календара.

Каляндар можна падрыхтаваць іншымі спосабамі: намаляваць; стварыць у электронным выглядзе або праз фотастудыю.

### Матэрыялы да заняткаў

Старажытныя славяне карысталіся язычніцкімі мерамі часу, у тым ліку і сонечна-месяцавым календаром. Так, святкаванне новага года на беларускіх землях адбывалася вясной, летам, восенню і зімой у адпаведнасці са становішчам на небе свяцілаў — сонца, месяца, асобных зорак. Гэты дзень вызначалі ў першы маладзік пасля вясенняга раўнадзенства (20—21 сакавіка), летняга сонцастаяння (21—22 чэрвеня), асенняга раўнадзенства (22—23 верасня) і зімовага сонцастаяння (21—22 снежня).

З пашырэннем хрысціянства славяне перайшлі на юліянскі каляндар. Новы год яны сталі сустракаць 1 сакавіка. Менавіта гэта дата лічылася днём зараджэння свету. Тады ж год падзялілі на 12 месяцаў і кожнаму з іх далі назву, якая была звязана з пэўнымі прыроднымі з'явамі. У Візантыі новы год пачыналі 1 верасня, а ў Рыме — 1 студзеня. Юліянскі каляндар выкарыстоўвалі, каб даведацца пра даты царкоўных свят, а народны, заснаваны на месячных фазах і сонечным цыкле, змене пор года, — для правядзення палявых работ.

У духоўным жыцці сярэдневяковага грамадства хрысціянства адыгрывала галоўную ролю. Яго светапоглядной асновай з'яўляецца адзінства веры, надзеі і любові. Надзея ўвасабляе ідэю выратавання ад граху з дапамогай Бога праз прытрымліванне паводзін, асвечаных царквой, любоў разумеецца як любоў да Бога, імкненне чалавека наблізіцца да яго, любоў да бліжняга.

Царкоўныя святы былі абавязковыя ў гадавым цыкле жыццядзейнасці сярэдневяковага грамадства, язычніцкія традыцыі пакрысе выцясняліся з самасвядомасці людзей.

Адным з найважнейшых свят у беларусаў заўсёды былі Каляды. Яны адзначаліся з 24 снежня па 6 студзеня. На святкаванне Божага Нараджэння абавязкова ладзілася тры куцці (абрадавыя вячэры). На Вялікую куццю частаваліся рыбай, аладкамі з макам, супам з крупамі або грыбамі, аўсяным кісялём, гарохам і ячнай кашай (куццёй). Неад'емным элементам свята была варажба.

Вялікаму посту перад Пасхай (Вялікаднем) папярэднічала святкаванне Масленіцы, або провады зімы. Народныя гулянні працягваліся цэлы тыдзень. Асноўнай стравай у гэты час былі бліны. Свята суправаджалася рознымі абрадавымі і магічнымі дзеяннямі, у якіх прымалі ўдзел толькі жанчыны. Завяршэннем святкавання Масленіцы быў старадаўні язычніцкі абрад гукання вясны. Звычайна ён прыпадаў на Благавешчанне.

Вялікдзень — свята ў гонар сонца, абуджэння прыроды і пачатку «вялікіх дзён» у сельскай гаспадарцы. Хрысціянская царква ўзгадвала адну з самых важных падзей — Уваскрэсенне Хрыста. Напярэдадні Вялікадня чыста прыбіралі ў хаце. Пяклі кулічы, выраблялі пісанкі — наносілі на яйкі васковы ўзор і фарбавалі іх у розныя колеры. Абавязковым лічылася асвячэнне прадуктаў на ўсяночным богаслужэнні ў храме.

Купалле адзначалася ў час летняга сонцастаяння. На свята распальвалі агонь, які атаясамліваўся з сонцам. Лічылася, што ён мог спрыяць добраму ўраджаю і праганяць смерць. Праз агонь было прынята скакаць для ачышчэння, вакол яго вадзілі карагоды. На Купалле шукалі папараць-кветку, пускалі вянкі па плыні і здзяйснялі рытуальнае купанне.

Асобныя рытуалы існавалі для Дзядоў і Радаўніцы. Памінальныя абрады спраўляліся некалькі разоў на год — вясной і восенню. Абавязкова ў гэтыя дні гатавалі рытуальную

вячэру. На стале павінны былі быць гарох, поліўка з рыбы і мяса, аладкі, каша і малако. Лічылася, што ўсе гэтыя стравы пакаштуюць дзяды-продкі. У час вячэры іх успаміналі ў малітвах.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучням прапануецца паразважаць і адказаць на пытанне.

Усходнія славяне карысталіся драўлянымі брускамі даўжынёй 30—50 сантыметраў з трыма, чатырма або шасцю гранямі. На іх умоўнымі знакамі пазначалі дні свят і ігрышч, земляробчых работ. Пра што ідзе размова?

**Заданне 2.** Вучні рашаюць астранамічныя задачы.

- Сярэдняя даўжыня месяца ў месячным календары роўна 29,5 сутак. Месячны год складае 354 сутак. Вядома, што ён карацейшы за сонечны год на 11 сутак. Колькі сутак складае сонечны год?
- Вылічыце, колькі сутак у 2022 годзе. Вядома, што было 8 месяцаў па 30 сутак, 3 месяцы — па 31 суткам і 1 месяц — 28 сутак.
- Колькі дзён уваходзіла ў цотныя і няцотныя месяцы юліянскага календара?

**Заданне 3.** З дапамогай рэбуса вучні вызначаюць, як называецца раздзел калекцыяніравання, звязаны з вывучэннем кішэнных календароў, быту і жыццёвых гісторый намаляваных на іх людзей.



**Заданне 4.** Вучні высвятляюць, што ўяўляе сабой прадстаўленая ілюстрацыя.




*Мал. 6.* Каляндар

**Заданне 5.** Гульня «Хрысціянская сімволіка». Вучні працуюць у камандах. Кожная атрымлівае канверт з выявамі сімвалаў і рэбусы. Вучні павінны разгадаць рэбус, каб зразумець значэнне сімвала.

*Ілюстрацыі:* сонца, зоркі, камень, пясок, золата, дрэва, вада, голуб, цярновы вянок, трохвугольнік, арол, вока.

*Адказы на рэбусы:* Бог, анёл, Дух, Троіца, вера, слабасць, храбрасць, мудрасць, ісціна, душа, пакуты Хрыста.







Х


І


ВЕ
3, 5


Х→Л
Т→Б
С
6


6


Д
М
6


Ц
3, 4, 5


Ш
4


П
4, 3, 2
ТЫХ
100’А

**Заданне 6.** Творчая работа.

*I варыянт.* Вучням прапануецца падрыхтаваць праект на тэму «Каляндар свят». У каляндар варта ўключыць назву свята, яго сціслую характарыстыку, сімволіку, апісанне страў, традыцыйных для гэтага дня. Праект можна стварыць у выглядзе лэпбука або перакіднога календара.

*II варыянт.* Вучням прапануецца стварыць даведнік «Каляндар і святы праваслаўнай (каталіцкай) культуры», у які можна ўключыць наступныя рубрыкі: «Рухомыя і нерухомыя святы» (дата, назва свята), «Сімволіка або атрыбуты свята» (напрыклад, яблык, куліч, яйка), «Звычаі і абрады свята».

*III варыянт.* Стварэнне лэпбука «Звычаі і абрады Вялікадня ў праваслаўных і католікаў».

План стварэння лэпбука:

1) дата правядзення свята;
2) атрыбуты (сімволіка) Вялікадня;
3) біблейскае паданне пра падарунак Марыі Магдалены;
4) біблейскі сказ пра ўваскрэсенне Ісуса Хрыста;
5) валачобніцтва;
6) велікодныя стравы.

*Тэма 10*

# *Духоўны подзвіг першых беларускіх асветнікаў*

## Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапаноўвае вучням разгадаць галаваломку (№ 1) і з дапамогай яе вызначыць тэму заняткаў. Далей дзеці працуюць з воблакам слоў (№ 2). Каб падрыхтаваць воблака слоў, можна скарыстацца спецыяльным сэрвісам (пераход ажыццяўляецца з дапамогай QR-кода) або каляровымі алоўкамі, ручкамі, белай паперай. Педагог дае

сціслыя звесткі пра дзейнасць полацкай асветніцы Еўфрасінні Полацкай (можна выкарыстоўваць інфармацыю з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў»). Вучні выконваюць заданні 9, 10, потым разгадваюць рэбус (№ 3) і вызначаюць імя вядомага беларускага асветніка XII ст. Падрыхтаваць рэбус можна самастойна або зноў жа выкарыстаць адпаведны сэрвіс (пераход ажыццяўляецца з дапамогай QR-кода). Педагог дае сціслыя звесткі пра дзейнасць Кірылы Тураўскага і прапануе вучням выканаць заданні 4—8, далей называе імёны іншых царкоўных дзеячаў і асветнікаў. Імя аднаго з іх вучні вызначаюць самастойна, працуючы з воблакам слоў (№ 11). Педагог расказвае пра дзейнасць Аўраамія Смаленскага і прапануе расшыфраваць прозвішча асветніка (№ 12). Загадзя вучні могуць падрыхтаваць творчую работу (№ 13).

## Матэрыялы да заняткаў

З прыняццем хрысціянства пачалася эпоха Асветніцтва. Сярод жанчын-асветніц самай яркай фігурай з’яўляецца Еўфрасіння Полацкая. Яе лічаць падзвіжніцай кніжнай справы на беларускіх землях. Пры бібліятэцы Сафійскага сабора Еўфрасіння перапісвала кнігі, а грошы ад іх продажу аддавала бедным людзям. У канцы 20-х гг. XII ст. яна заснавала жаночы манастыр пры Спаскай царкве ў мястэчку Сяльцо недалёка ад Полацка. Пазней, клапоцячыся пра добраўпарадкаванне манастыра, прападобная Еўфрасіння пажадала ўзвесці на месцы старога драўлянага храма каменны. Новую Спаскую царкву ўпрыгожылі ўнікальныя фрэскавыя роспісы, а ў 1161 г. на «вечнае захоўванне» туды прынеслі крыжкаўчэг, выраблены па замове ігуменні майстрам-ювелірам Лазарам Богшам.

Каля 1155 г. недалёка ад Спаскага манастыра Еўфрасіння ўзвяла царкву Прасвятой Багародзіцы і ўладкавала пры ёй мужчынскі манастыр. Туды па просьбе святой была прывезена Эфеская ікона Божай Маці, напісаная, паводле падання,

святым апосталам і евангелістам Лукой. Аднак з Канстанцінопаля ў Полацк усё ж быў перададзены не арыгінальны абраз, а яго копія.

Вялікую ўвагу асветніца надавала духоўнаму самаўдасканаленню, вучыла сваіх слухачоў і вучняў добраму, вечнаму. Кожны дзень яна навучала манашак цярплівасці, павазе, любові да тых, хто побач, выступала з міратворчымі пропаведзямі.

На схіле дзён Еўфрасіння адважылася на духоўны подзвіг — накіравалася на Святую зямлю (у Палесціну). Там яна цяжка захварэла і памерла. Цела асветніцы пакінулі ў Феадосіевым манастыры недалёка ад Іерусаліма. Затым мошчы вывезлі і змясцілі ў дальніх пячорах Кіева-Пячэрскай лаўры, а ў 1910 г. вярнулі ў Полацк.

Дзякуючы дзейнасці Еўфрасінні Сафійскі сабор стаў важным цэнтрам духоўнай культуры Беларусі, а сабраная ёю бібліятэка дала магчымасць многім пакаленням продкаў беларусаў атрымаць выдатную адукацыю, далучыцца да духоўных скарбаў чалавецтва.

Кірыла Тураўскі вылучаўся сярод асветнікаў-мужчын. Сваёй літаратурнай дзейнасцю ён заваяваў высокі аўтарытэт у сучаснікаў: яны называлі яго «другім Залатавустам». Асабліва імкнуўся асветнік да глыбокага пазнання біблейскіх кніг. З вялікай ахвотай ён вывучаў сусветную гісторыю, рыторыку, грэчаскую мову. У XII ст. прысвяціць навуцы ўвесь час можна было толькі ў манастырскіх сценах. Але Кірыла Тураўскі пакідае нават манастыр, каб, зачыніўшыся ў вежы (стаўпе), працягваць вывучэнне Свяшчэннага Пісання і займацца самаўдасканаленнем.

Знаходжанне ў стаўпе не было самаізаляцыяй. Асветнік дзяліўся вышэйшай мудрасцю, заклікаў людзей слухаць пропаведзі, знаходзіць час для малітвы. На пасадзе епіскапа г. Турава ён умела кіраваў епархіяй, клапаціўся пра царкоўнае добраўпарадкаванне, наглядаў за гарадскімі

манастырамі, змагаўся з язычніцкімі перажыткамі і забабонамі. Епіскап заклікаў прыхаджан чытаць у храме і дома Евангеллі, Дзеі Апостальскія, Кнігу псалмоў і іншыя святыя кнігі.

Кірыла Тураўскі прапаведаваў аскетызм, папярэджваў, што хрысціяне нават святкаваць павінны без п’янства, абжорства, ігрышч. Вучыў дапамагаць слабым і хворым, сіротам і бедным, заклікаў рэгулярна наведваць храм. Ёсць меркаванне, што асветнік надаваў вялікую ўвагу будаўніцтву храмаў у сваёй епархіі. Звычайна сан епіскапа надаваўся пажыццёва, але Кірыла Тураўскі пакінуў гэту пасаду задоўга да смерці. Верагодна, ён адасобіўся ў Барысаглебскім манастыры, дзе працягваў літаратурную і асветніцкую дзейнасць.

Кірыла Тураўскі напісаў больш за 60 літаратурных твораў у розных жанрах (малітвы, словы, павучэнні). Усе яны адносяцца да выдатных помнікаў літаратуры XII ст. Творы чыталіся і неаднаразова перапісваліся, са з’яўленнем кнігадрукавання безліч разоў выдаваліся. Самае адметнае месца займаюць малітвы — іх вядома не менш за 30. Аўтэнтычнымі прызнаюцца 20 слоў-пропаведзяў, прачытаных асветнікам у храме перад народам.

На творчасць Кірылы Тураўскага вялікі ўплыў аказалі Біблія і візантыйская культура. Яго творам уласцівы сімвалізм і алегорыя, павучэнні складаюцца з простага пераказу евангельскіх тэкстаў з некаторымі дапаўненнямі і тлумачэннямі. Большасць малітваў асветніка звернута да Святой Тройцы, некаторыя — да святых угоднікаў і біблейскіх персанажаў. Пропаведзі Кірылы Тураўскага падзяляюць на ўрачыстыя і павучальныя. Першыя звычайна прамаўляліся на вялікія святы.

Кірыла Тураўскі заклікаў сучаснікаў адкінуць гордасць, непакорнасць, гнеў, паклёп, варожасць, п’янства і ўсялякую злосць. Лічыў, што лагоднасць, пакорлівасць, гатоўнасць да добрых спраў павінны быць у пашане ў кожнага хрысціяніна.

Асветніцкая дзейнасць Аўраамія Смаленскага знаходзіла вялікі водгук сярод простых людзей: ён тлумачыў незразумелыя месцы Пісання проста і ясна. Людзі прыходзілі да асветніка, каб паслухаць яго павучальныя словы і атрымаць суцяшэнне ад скрухі. Праціўнікі выклікалі Аўраамія на дыспуты, каб выставіць недасведчаным у багаслоўі, але той заўсёды выходзіў з іх пераможцам. Асветнік 5 гадоў зневажаўся як ерэтык за так званае памылковае тлумачэнне Біблії. Нядобразычліўцы патрабавалі суда над ім. Аўраамію забаранілі размаўляць з людзьмі і адправілі ў ссылку ў Селішчанскі манастыр. Якраз у той час Смаленшчыну спасцігла страшэнная засуха. Маленні святароў не прынеслі поспехаў. А вось пасля звароту Аўраамія да Усявышняга прайшоў доўгачаканы дождж. Пасля гэтага выпадку асветніка рэабілітавалі і прызначылі ігуменам Багародзіцкага манастыра.

Да вядомых асветнікаў можна аднесці царкоўных дзеячаў Міну і Сімяона, Клімента Смаляціча. Стараннямі першага добраўпарадкоўваліся храмы і манастыры, выхоўваліся ў дабрачыннасці вернікі. Клопаты аб простых людзях, заступніцтва за пакрыўджаных, міласэрнасць да бедных, сірот і ўдоў прынеслі другому асветніку павагу народа і сан епіскапа. Трэці з'яўляўся прыхільнікам незалежнасці ўсходнеславянскай праваслаўнай царквы ад Візантыі.

Дзейнасць выбітных царкоўных дзеячаў, асветнікаў рабіла жыццё людзей больш узнёслым і мэтанакіраваным.

***Цікавыя звесткі.*** Крыж Еўфрасінні Полацкай спачатку захоўваўся ў царкве ігуменні. У XIII ст. смаленскія князі, якія захапілі Полацк, перавезлі яго ў Смаленск. У 1841 г. пасля вандровак па Маскве і Пецярбургу ювелірная каштоўнасць была дастаўлена ў Полацк і знаходзілася ў саборы Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. У 1929 г. Крыж трапіў у сейф Магілёўскага абкама і гаркама партыі. Калі ў 1941 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна, у першую чаргу эвакуіравалася абсталяванне заводаў, а ўжо потым музейныя каштоўнасці. У гэты час Крыж бясследна знік. Усе намаганні адшукаць яго не мелі поспеху.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць галаваломку. Вызначаюць, пра што пойдзе размова на занятках. Для гэтага чытаюць слова, якое атрымаецца па вертыкалі пасля ўпісвання адказаў на пытанні.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | | | | | | | | | | |
| **2** | | | | | | | | | | |
| **3** | | | | | | | | | | |
| **4** | | | | | | | | | | |
| **5** | | | | | | | | | | |
| **6** | | | | | | | | | | |
| **7** | | | | | | | | | | |
| **8** | | | | | | | | | | |
| **9** | | | | | | | | | | |

1. Духоўная, бесцялесная істота, якая паведамляе волю Бога і валодае звышнатуральнымі магчымасцямі.
2. Званне служыцеля культу.
3. Канчатковая мэта розных рэлігій, вызваленне ад зла і пакут.
4. Назва першых чатырох кніг Новага Запавету Бібліі.
5. Будынак у манастыры, дзе манахі збіраюцца для прыняцця ежы — на трапезу.
6. Удары ў званы, якія ў выпадку трывогі, пажару або іншага бедства служылі сігналам для збору людзей.
7. Выява святых або падзей з біблейскай, царкоўнай гісторыі.
8. Хрысціянскі культавы будынак, прызначаны для рэлігійных набажэнстваў і малітваў.
9. Пісанне абразоў, від сярэдневяковага жывапісу.

**Заданне 2.** Вучні вызначаюць галоўную думку, якая аб'ядноўвае словы ў воблаку. Складаюць з дапамогай гэтых слоў апавяданне. Даюць назву тэксту.




*Мал. 7.* Воблака слоў

**Заданне 3.** Вучні разгадваюць рэбус, каб вызначыць імя вядомага беларускага асветніка XII ст.




**Заданне 4.** Педагог расказвае, што Кірыла Тураўскі стварыў больш за 60 літаратурных твораў розных жанраў. Прапануе вучням разгадаць SMS-крыжаванку (гл. мал. 5) і даведацца, што гэта за жанры.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | 1 | 4 | 3 | 6 | 1 | 9 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6 | 4 | 5 | 1 | 9 |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 1 | 1 | 7 | 8 | 0 | 5 | 5 | 3 |

**Заданне 5.** З дапамогай воблака слоў вучні складаюць тэкст. Вызначаюць, як сучаснікі называлі Кірылу Тураўскага.




*Мал. 8.* Воблака слоў

**Заданне 6.** Дзеці высвятляюць, пра што ідзе гаворка ў наступным урыўку.

Аснова кампазіцыі манумента — крыж незвычайнай візантыйскай формы. З крыжом злучана постаць асветніка: ён выступае наперад, падняўшы галаву. Рукі сагнуты на ўзроўні грудзей: у левай — кніга з крыжом на вокладцы, жэст правай накіраваны на кнігу. Вакол галавы — німб. Справа, побач з кнігай, — надпіс: «Святы ... біскуп Тураўскі».

**Заданне 7.** З дапамогай рэбуса вучні вызначаюць цікавы факт з жыцця Кірылы Тураўскага. Разважаюць, што гэта значыць.



**Заданне 8.** Выкарыстоўваючы «Азбуку розуму», дзеці зашыфроўваюць наступную характарыстыку царкоўнага дзеяча: «Ты — нашы анёльскія вусны на небе!».




*Мал. 9.* Азбука розуму

**Заданне 9.** Настаўнік кажа, што па ініцыятыве Еўфрасінні Полацкай з Візантыі прывезлі ікону Божай Маці. Прапануе расшыфраваць тэкст і даведацца, як яна называлася.

**АМІЦ_ОБСАК_Я_ДАЗ_І_ІГ_Т_ЫР_Я_ФЭЕ_С_АК_Я**

**Заданне 10.** З дапамогай рэбусаў вучні вызначаюць, пра што ідзе гаворка ў наступным урыўку.

Шасціканцовы, вышыня 51,8 см, аснова з кіпарысавага дрэва, зверху і знізу пакрыты 21 залатой пласцінкай з каштоўнымі камянямі, арнаментам і 20 сярэбранымі пазалочанымі пласцінамі; край пярэдняга боку аздоблены ніткай жэмчугу. У пяці квадратных гнёздах былі змешчаны рэліквіі: кавалкі Крыжа Гасподняга з кроплямі яго крыві, кавалак каменя ад труны Божай Маці, часцінкі мошчаў святых Стэфана, Панцеляймона, Дзімітрыя.






**Заданне 11.** Вучні вызначаюць галоўную думку, якая аб’ядноўвае словы ў воблаку. Складаюць з дапамогай гэтых слоў апавяданне. Даюць назву тэксту.




*Мал. 10.* Воблака слоў

**Заданне 12.** Педагог расказвае, што сучаснікі Аўраамія Смаленскага зашыфравалі яго прозвішча. Але даследчыкам яно вядома. Прапануе дзецям даведацца, як называлі асветніка, падабраўшы шыфр.

| Ы | Т | І | В | А | Ц | Р | П |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| L | X | V | I | Q | U | Z | Y |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Y | Z | Q | U | Q | I | V | X | L |

**Заданне 13.** Творчая работа.

*I варыянт.* Вучням прапануецца падрыхтаваць відэаролік пра ўшанаванне памяці беларускіх асветнікаў у розных відах мастацтва: скульптуры, жывапісе, літаратуры.

*II варыянт.* Вучням прапануецца зрабіць у тэхніцы скрапбукінгу паштоўку «Беларускія асветнікі». Для яе стварэння спатрэбяцца аксамітная і гафрыраваная папера, каляровы кардон і дэкаратыўныя матэрыялы, набор фігурных нажніц, скотч, клей для паперы, выява асветніка.

Змест паштоўкі: імя, прозвішча асветніка, сціслыя звесткі з яго біяграфіі і дзейнасці.

# *Тэма 11*
# *Першыя хрысціянскія храмы на беларускіх землях. Увасабленне духоўных традыцый беларусаў у архітэктуры*

## Метадычныя рэкамендацыі

Каб даведацца пра тэму заняткаў, вучні разгадваюць галаваломку (№ 1). Затым педагог апавядае ім пра Сафійскі сабор у Полацку. Дзеці разгадваюць рэбус (№ 2), расшыфроўваюць імя галоўнага майстра полацкай школы дойлідства (№ 4). Педагог расказвае пра помнікі архітэктуры Віцебска і Гродна. Вучні выконваюць заданне на разважанне (№ 3), разгадваюць рэбус (№ 6). У канцы заняткаў працуюць над міні-чайнвордам або ўдзельнічаюць у віктарыне. Заданне 8 пажадана выконваць перад расказам пра тую або іншую царкву.

Заданне 7 прапануецца зрабіць у вольны час (дома або на канікулах). Падчас канікул можна правесці выставу малюнкаў «Вядомыя святыні Беларусі». Віктарына можа змяшчаць пытанні заданняў 5, 8, 9. Акрамя выставы малюнкаў, у рамках выканання творчай работы можна правесці конкурс лепшых сачыненняў.

## Матэрыялы да заняткаў

З устанаўленнем хрысціянства як афіцыйнай рэлігіі пачынаецца гісторыя манументальнага дойлідства. Першым мураваным храмам на беларускіх землях быў Сафійскі сабор у Полацку, прысвечаны «прамудрасці Божай». Акрамя полацкага храма, такое імя мелі святыні ў Канстанцінопалі, Салуні, Ахрыдзе, Кіеве, Ноўгарадзе. Ад старажытнай пабудовы захаваліся падмуркі і рэшткі сцен, якія ўвайшлі ў барочны сабор XVIII ст. Полацкая Сафія — пяцінефавы трохапсідны крыжова-купальны храм. Яго шырыня — 26,4 м, даўжыня

разам з апсідамі (выступы ў сцяне) — 31,5 м. Над сяродкрыжжам сабора ўзвышаўся барабан галоўнага купала, а вакол яго размяшчаліся чатыры меншыя. Да храма прымыкала квадратная вежа-званіца. Пазней, у XII ст., была прыбудавана каплічка, а з усходу — пахавальня. Храм ствараўся ў змешанай тэхніцы з муроўкай са схаваным радам.

Другая святыня Полацкай зямлі — Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра. Ён вядомы па матэрыялах археалагічных раскопак. Гэта трохнефавы храм з шасцю слупамі і трыма прытворамі. Яго купал быў размешчаны не па цэнтры, а перанесены на адно чляненне на захад. Такая канструкцыя была характэрнай рысай старажытнага полацкага дойлідства да сярэдзіны XII ст.

Да храмаў новага тыпу на ўсходнеславянскіх тэрыторыях адносіцца сусветна вядомая Спаская царква Еўфрасіннеўскага манастыра. Яна пабудавана полацкім дойлідам Іаанам па заказе Еўфрасінні Полацкай. Характэрнай рысай будынка з'яўлялася вежападобная кампазіцыя, завершаная купалам на спецыяльным п'едэстале. Вышыня сабора ў розных частках неаднолькавая: яго алтарная частка была значна ніжэйшая за цэнтральны аб'ём. Да гэтага тыпу будынкаў належыць яшчэ адна з цэркваў Бельчыцкага манастыра — Барысаглебская.

Асобнае месца ў шэрагу помнікаў старажытнага полацкага дойлідства займае храм-трыконх гэтага ж манастыра. Ён меў тры вялікія паўкруглыя апсіды (конхі). Унутры пасярэдзіне будынка размяшчаліся чатыры квадратныя слупы, якія служылі апорай купала.

Да нашых дзён захаваліся толькі два старажытныя помнікі — Сафійскі сабор і Спаская царква Еўфрасіннеўскага манастыра.

Рысы полацкай архітэктуры прасочваюцца ў будынку Дабравешчанскай царквы ў Віцебску. Сцены храма складзены з квадратаў часанага каменю, якія чаргуюцца з двуматрыма радамі плінфы. Лесвіца на хоры змяшчалася ў тоўшчы

заходняга мура. Будынак меў высокі цокаль, што было рэдкай з'явай для ўсходнеславянскай архітэктуры.

Самым раннім помнікам культавай архітэктуры ў Гродне з'яўляецца Ніжняя царква — шасціслуповы храм з адной апсідай. Купал абапіраўся на заходнія пары слупоў. Незвычайным было ўбранне фасадаў царквы: у цагляную муроўку ўстаўляліся шліфавальныя камяні розных памераў і колераў. З маёлікавых плітак (жоўтых, зялёных і карычневых) выкладзены арнаменты ў выглядзе крыжоў, разетак, ромбаў. У сцены ўнутры храма ўмуравана вялікая колькасць галаснікоў; вітая лесвіца вяла на хоры. Выдатна захавалася падлога Ніжняй царквы.

Добра захавалася Барысаглебская (Каложская) царква. Яна мае тры апсіды, паміж усходнімі парамі слупоў размешчаны купал. У храме было тры ўваходы, два ярусы акон. Усе тры апсіды таксама мелі вялікія вокны. Сцены царквы зроблены ў раўнаслойнай тэхніцы. Ад нізу па перыметры будынка праходзяць рады валуноў рознага колеру. З кожным новым ярусам іх памеры памяншаюцца і, нарэшце, саступаюць месца паліхромным маёлікавым пліткам квадратнай, трапецападобнай, круглай формаў. З іх выкладзены ромбы, паўромбы, крыжы, разеткі. Высокая ступень захаванасці Каложскай царквы дае магчымасць вывучыць арыгінальную сістэму ўманціраваных у муры керамічных галаснікоў.

Цікавым помнікам сярэдневяковай архітэктуры можна назваць гродзенскую Прачысценскую царкву — храм з адной прамавугольнай апсідай. Яе план і рэшткі старажытнай маёлікавай падлогі можна пабачыць на тэрыторыі Базіліянскага манастыра. Да помнікаў, якія ствараліся прыкладна ў той жа перыяд, можна аднесці недабудаваны храм у Ваўкавыску, які амаль цалкам паўтарае план гродзенскай Ніжняй царквы.

Асобнае месца ў культавым дойлідстве Беларусі займае тураўская царква XII ст. Арыгінальнай рысай трохапсіднага храма з шасцю слупамі з'яўляюцца мураваныя перагародкі

перад алтаром. У паўднёва-заходнім куце царквы размяшчалася вежа з вітай лесвіцай. Сцены храма збудаваны з плінфы, падмурак — з валуноў. Падлога ўнутры была вымашчана паліванымі пліткамі. Фрэскавага роспісу царква не мела. Яна была разбурана землятрусам 3 мая 1230 г. Тады сярод руін храма знайшлі пахаванні ў каменных саркафагах.

Самабытныя школы мураванага дойлідства, якія склаліся ў Полацку і Гродне, мелі як свае асаблівыя, так і агульныя рысы. Сярод апошніх даследчыкі называюць аднаапсіднасць, шырокае ўжыванне колеру для аздаблення будынкаў, маёлікавыя падлогі з плітак жоўтага, зялёнага і карычневага колераў самай разнастайнай формы, вялікую колькасць клеймаў і знакаў на старажытнай цэгле.

***Цікавыя звесткі.*** Галоўнай небяспекай для адрэстаўрыраванай у XVI ст. Барысаглебскай (Каложскай) царквы была прыродная стыхія. Храм на беразе Нёмана не аднойчы пакутаваў ад апоўзняў і размываў. У ноч на 2 красавіка 1852 г. заходняя сцяна разам з перакрыццем столі зноў абрынулася ў раку. Непрыемнасці прынеслі таксама апоўзні ў 1864-м і 1889-м. Але ўнікальны храм у Гродне не знік. У 1906 г. бераг ракі ўмацавалі, замест цяжкіх каменных сцен пабудавалі лягчэйшыя драўляныя, на адрэстаўрыраваным абноўленым гонтавым даху з'явіўся пазалочаны ажурны крыж. У такім выглядзе храм захаваўся да сённяшняга часу.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць галаваломку. Вызначаюць, пра што пойдзе размова на занятках. Для гэтага складаюць першыя літары адгаданых слоў.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | | | | | | | | |
| 2 | | | | | | | | | | | |
| 3 | | | | | | | | | | | |
| 4 | | | | | | | | | | | |

1. Назва адной з сусветных рэлігій.
2. Светапогляд і паводзіны людзей, якія вызначае вера ў існаванне якой-небудзь звышнатуральнай сілы.
3. Персанаж Старога Запавету, другі сын Адама і Евы.
4. Імя маці Хрыста.

**Заданне 2.** Вучні разгадваюць рэбус і высвятляюць, што азначае грэчаскае слова «сафія».




**Заданне 3.** Вучні разважаюць і адказваюць на пытанне.

У сцены гродзенскіх храмаў умуравана вялікая колькасць гаршкоў-галаснікоў. Як вы лічыце, навошта майстры гэта рабілі?

**Заданне 4.** Дзеці расшыфроўваюць імя майстра полацкай школы дойлідства.

**Н А А І**

**Заданне 5.** Міні-чайнворд «Пазнай».

У цэнтры міні-чайнворда — выявы розных храмаў. Ілюстрацыі дапамогуць вучням адказаць на шэраг пытанняў. Адказы трэба ўпісваць па перыметры. Паміж імі ёсць раздзяляльныя клеткі.

1. У гэтым храме праходзіць міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі».
2. Царква, названая ў гонар беларускай асветніцы.
3. Храм, пабудаваны ў гонар князёў Барыса і Глеба. Другая яго назва звязана з урочышчам Каложань.
4. Храм у Віцебску, у будове якога прасочваюцца рысы полацкай школы дойлідства.

5. **Храм на тэрыторыі адной з самых старажытных праваслаўных епархій.**
6. **Падлога гэтай царквы зроблена з 17 відаў маёлікавай пліткі, якая выдатна захавалася да нашых дзён.**



*Мал. 11.* Міні-чайнворд «Пазнай»

**Заданне 6.** Вядома, што другая назва Барысаглебскай царквы звязана з урочышчам Каложань. Што ў перакладзе са старажытнарускай мовы азначае слова *каложань*? Каб адказаць на гэта пытанне, вучні разгадваюць рэбус.




**Заданне 7.** Вучні малююць самы прыгожы, на свой погляд, храм Беларусі. Прымаюць удзел у выставе малюнкаў «Наша духоўная спадчына».

**Заданне 8.** Дзеці вызначаюць, пра якія храмы ідзе гаворка ў вершах беларускіх паэтаў.

Я думала: калі б застацца зараз
У восені, урачыстай і прыгожай,
Калі ўсё, усё змясціцца можа
І апраўдацца для тваёй душы —
Асветленай, усё пакінуць зараз...
Ды смутак невымоўны
Ў дрэве кожным,
І парк мяне праводзіць ад Каложы.
І варта
Жыць.

Г. Аўчыннікава.

На фоне велічных нябёс —
Прыгожа белае на сінім.
Да храма Спаса-Еўфрасінні
Мяне ізноў прыводзіць лёс.

Г. Ліхтаровіч.

Калі пазалотай кране зараніца
Крыжы на бязважкім Сафійскім саборы,
Узносіць ён стрункія рукі званіцаў
Да першае зоркі з маўклівым дакорам.

А. Мінкін.

**Заданне 9.** Міні-віктарына «Вядомыя помнікі культавай архітэктуры Беларусі перыяду Ранняга сярэдневякоўя».

1. Назавіце вядомы помнік архітэктуры XII ст., які знаходзіцца на плошчы 1000-годдзя г. Віцебска.
2. Пад падмуркам якой царквы на невялікай глыбіні залягаюць падземныя грунтавыя воды? Якую другую назву храма пацвярджае гэты факт?
3. Якая Сафія мае сем купалаў?
4. Назавіце старадаўнія фрэскі, якія захаваліся ў Сафійскім саборы.
5. Які музыкальны інструмент гучыць сёння ў канцэртнай зале Сафійскага сабора?
6. Які помнік XII ст. устаноўлены каля Сафійскага сабора?
7. Яны ствараюць добрую акустыку ўнутры храма і палягчаюць канструкцыю саміх сцен.
8. Які помнік архітэктуры XII ст. лічыўся самым вялікім на ўсёй тэрыторыі Тураўскага княства?
9. Назавіце адну з прычын разбурэння Тураўскага храма.
10. Храм, названы ў гонар князёўны-асветніцы.

**Заданне 10.** Творчая работа.

*I варыянт.* Вучні могуць падрыхтаваць фотавыставу на тэму «Вядомыя помнікі культавай архітэктуры Беларусі перыяду Ранняга сярэдневякоўя». На фатаграфіях неабходна пазначыць назву храма, дату яго стварэння, месца знаходжання. Аўтарская фатаграфія павінна змяшчаць наступныя звесткі: прозвішча і ініцыялы аўтара, год стварэння фота.

*II варыянт.* Вучням прапануецца стварыць фларыстычную карціну «Храмы Беларусі». Для гэтага спатрэбіцца наступны матэрыял: цёмная аксамітная папера, пінцэт, пух раслін — дзьмухаўца, скрыпеню, калючніку, рамка са шклом. Алгарытм стварэння карціны: цёмную аксамітную паперу трэба наклеіць на падкладку рамкі, нанесці на яе контуры царквы, выкарыстоўваючы пінцэт, выкласці малюнак пухам, накрыць шклом.

## *Тэма 12*
## *Уклад полацкіх князёў у фарміраванне духоўнай спадчыны беларускага народа*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапаноўвае вучням разгадаць рэбусы (№ 1), каб вызначыць тэму заняткаў. Далей ён выкарыстоўвае інфармацыю з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Яго расказ суправаджаецца дэманстрацыяй адпаведных ілюстрацый. Вучні прымаюць удзел у віктарыне (№ 2), потым з дапамогай педагога выконваюць творчую работу (№ 4). Занятак таксама можна праводзіць у выглядзе віктарыны «Медыяазбука».

### Матэрыялы да заняткаў

На беларускіх землях першымі прынялі хрысціянства прадстаўнікі вышэйшай знаці. Ізяслаў, сын Уладзіміра і Рагнеды, пасля звяртання да новай веры пачаў княжыць у Полацку. Ён быў вельмі набожны і клапаціўся пра яе распаўсюджванне на сваіх землях. Яго маці таксама прыняла хрысціянства і апошнія гады свайго жыцця правяла ў манастыры пад імем чарніцы Анастасіі. Дзякуючы Рагнедзе гэта рэлігія пачала пашырацца на іншых беларускіх землях.

З імем княгіні звязваюць таксама з'яўленне першага манастыра ў Заслаўі.

Палітычная дзейнасць Брачыслава Ізяславіча паспрыяла аднаўленню незалежнасці і росквіту Полацкага княства. Палачане зноў выйшлі да вярхоўяў Заходняй Дзвіны і Дняпра, узялі пад свой кантроль гарады Віцебск і Усвяты. Брачыслаў пашырыў межы княства на захад і заснаваў там новыя паселішчы. Так узніклі г. Брачыслаўль (сучасны Браслаў), в. Браслаў каля возера Сівер. У той жа час да Полацкага княства была далучана Мінская воласць.

Дзякуючы Усяславу Брачыславічу (Усяславу Чарадзею) на Полацкай зямлі распаўсюдзілася традыцыя шанавання святых Барыса і Глеба. Гэта бачна на прыкладзе помнікаў жывапісу (фрэскі святых Барыса і Глеба ў Барысаглебскім (Бельчыцкім) манастыры). Сярод помнікаў прыкладнога мастацтва можна вылучыць віслую пячатку з выявай св. Глеба і бронзавы абразок. Пры князю Усяславе г. Полацк развіваўся як гандлёвы і культурны цэнтр. У XII ст. там існавала не менш за 10 культавых манументальных збудаванняў, тры манастыры. Падчас княжацкага праўлення быў заснаваны Узнясенскі манастыр, адноўлены Мінск (або, як лічаць гісторыкі, заснаваны новы горад на р. Свіслачы). Усяслаў Брачыславіч увайшоў у гісторыю як адважны воін і мудры правіцель. Шэсць яго сыноў таксама выхоўваліся выдатнымі ваеўнікамі, палітыкамі і шчырымі патрыётамі. Князь Усяслаў унёс уклад у будаўніцтва праваслаўнай святыні Еўропы — полацкага Сафійскага сабора.

Сафійскі сабор узводзілі візантыйскія майстры і гараджане ў 1044—1066 гг. Гэты сімвал незалежнасці і магутнасці Полацкага княства падобны на белы карабель, які плыве па Дзвіне. Пабудаваны па візантыйскіх канонах, але ў традыцыях полацкага дойлідства, храм размяшчаўся ў Верхнім замку паміж палацамі князя і епіскапа. Сабор стаў праваслаўным культурна-асветніцкім цэнтрам. Тут знаходзіліся

найбагацейшая бібліятэка, архіў, казначэйства, магістрат, захоўваліся рэлігійныя святыні і праводзіліся прыёмы паслоў. Пры саборы быў пабудаваны княжацкі магільны склеп, дзе пазней археолагі знайшлі 16 саркафагаў.

Гэта быў чацвёрты ў свеце храм Святой Сафіі. Але ён меў і свае ўнікальныя рысы: напрыклад, дадатковае алтарнае раздзяленне, утворанае двума слупамі, — віму, сем купалаў. Купалы сабора сімвалізавалі сем усяленскіх царкоўных сабораў. У будаўніцтве храма выкарыстоўваліся плінфа і неапрацаваныя валуны. Захаваліся фрагменты муроўкі XI ст., фундамент і фрэскавыя роспісы канца XI ст. Маляўнічую колеравую гаму на сценах стварала муроўка ў тэхніцы схаванага рада.

Вялікі ўплыў на грамадскае жыццё і побыт насельніцтва Полацка аказвала царква. Яна імкнулася выступаць у якасці гаранта пагадненняў паміж князямі. Гэтыя дамовы замацоўваліся распаўсюджаным «крыжовым цалаваннем». Духавенства прымала ўдзел у перагаворах розных узроўняў, адстойвала прагрэсіўную ідэю неабходнасці моцнай княжацкай улады. Напрыклад, акрамя царкоўнага, важнае палітычнае значэнне меў культ князёў Барыса і Глеба. Так у сярэдневяковым грамадстве ўмацоўвалася ідэя радавога старэйшынства ў сістэме княжацкай іерархіі. Барыс і Глеб, якія не паднялі рукі на старэйшага брата нават дзеля абароны свайго жыцця, сталі першымі ўсходнеславянскімі святымі. Палітычная тэндэнцыя іх ушанавання заключалася ў асуджэнні міжкняжацкіх войнаў.

Князь Барыс-Рагвалод (Барыс Усяславіч) заснаваў на р. Бярэзіне горад Барысаў, які стаіць і цяпер. Памяць пра яго захоўваюць таксама Барысавы камяні. Чатыры вялізныя валуны былі знойдзены ў рэчышчы Заходняй Дзвіны, каля в. Каменка недалёка ад Вілейкі і в. Высокі Гарадзец у Талачынскім раёне. На камянях высечаны шасціканцовыя крыжы і надпіс «Господ, помози рабу своему Борису»,

зроблены ў XII ст. па загадзе князя. Сёння ўсе Барысавы камяні з'яўляюцца гістарычнымі помнікамі эпіграфікі. Акрамя таго, Барыс Усяславіч лічыцца заснавальнікам Барысаглебскага манастыра, які стаяў у наваколлі Полацка на р. Бельчыца.

У Мінску — важнейшым эканамічным і стратэгічным цэнтры Полацкай зямлі — княжыў брат Барыса Глеб. Яшчэ ў часы праўлення Усяслава Чарадзея горад адрадзіўся з попелу, вакол яго выраслі высокія крапасныя сцены, якія дапамагалі абараняцца ад ворагаў. Князь Глеб меў багатую казну. Вядома, што ён ахвяраў Кіева-Пячэрскаму манастыру шэсцьсот грывень серабра і пяцьдзясят грывень золата. Глеб распачаў будаўніцтва мураванага храма ў гонар Багародзіцы. Ён захапіў гарады Друцк, Оршу і Копысь. Асабліва важным было авалоданне Копыссю: там размяшчаліся прыбытковыя мытні і корчмы, а таксама пераправа цераз Днепр.

Полацкі князь Рагвалод-Васіль увайшоў у гісторыю дзякуючы не толькі ўчынкам, але і слаўным нашчадкам. Яго сын Глеб нядоўга княжыў у Полацку, а дачка Параскева за сваю хрысціянскую дабрачыннасць пасля смерці была прылічана да святых. Згодна з «Аповесцю пра Полацк» Параскева пастрыглася ў манашкі ў Спаскім манастыры і пражыла там сем гадоў, займаючыся перапісваннем кніг. Затым адправілася ў Рым, дзе пасля служэння Богу на працягу некалькіх гадоў прыняла каталіцтва і атрымала новае імя Пракседа. У Рыме яна пабудавала касцёл імя Параскевы-Пракседзіс, дзе і была пахавана. Так у Полацку сярод мясцовых бернардзінцаў узнік культ першай полацкай каталіцкай святой Параскевы-Пракседзіс. На думку даследчыкаў, складальнік жыція Параскевы-Пракседзіс выкарыстоўваў у якасці ўзору «Жыціе Еўфрасінні Полацкай», а ў канцы прывёў распаўсюджаную легенду пра прападобную Пракседзіс Рымскую, каб надаць твору пракаталіцкі характар.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць рэбусы, каб вызначыць, пра што пойдзе размова на занятках.







**Заданне 2.** Віктарына «Полацкае княства».

1. Назавіце першага вядомага полацкага князя.
2. Назавіце роданачальніка дынастыі полацкіх князёў Ізяславічаў.
3. Чым было адзначана княжанне Брачыслава Ізяславіча?
4. Чым запомнілася княжанне Усяслава Брачыславіча?
5. Назавіце адзінага прадстаўніка полацкай галіны Рурыкавічаў на кіеўскім вялікакняжацкім прастоле.
6. Назавіце апошняга самастойнага полацкага князя.
7. Калі пачалася барацьба за панаванне паміж Віцебскай, Менскай і Друцкай галінамі нашчадкаў Усяслава Брачыславіча?
8. Які полацкі князь загадаў выбіць надпіс «Господ, помози рабу своему Борису»? Што яшчэ, акрамя надпісу, было выбіта і на чым?
9. Які князь увёў на Полацкай зямлі культ шанавання святых Барыса і Глеба?
10. Назавіце князя, які заснаваў на р. Бярэзіне горад Барысаў.

**Заданне 3.** Віктарына «Медыяазбука». Гульня падаецца ў выглядзе прэзентацыі. На кожным слайдзе па парадку размешчаны літара алфавіта і ілюстрацыйны матэрыял.

У віктарыне могуць удзельнічаць як каманды, так і асобныя вучні. За кожны правільны адказ вядучы (педагог або вучань) налічае 1 бал (каляровую фішку).

| Літара алфавіта | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| А | Хрысціянскае імя Рагнеды, якое азначае «ўваскрэсенне» | Анастасія |
| Б | Унук Рагвалода, які заснаваў горад Брачыслаўль і са згоды веча трымаў на службе варажскую дружыну | Брачыслаў |
| В | Пра тое, што Усяслаў Брачыславіч у 15-гадовым узросце стаў вялікім полацкім князем, сведчыць быліна пра... | Волха Усяславіча |
| Г | Полацкую князёўну Рагнеду ў народзе празвалі... | Гарыславай |
| Д | Атрад узброеных і спецыяльна падрыхтаваных да ваеннай справы людзей, дарадчыкаў князя | Дружына |
| Е | Хрысціянская царкоўна-адміністрацыйная адзінка ў межах вызначанай тэрыторыі. Вядзе сваю гісторыю ад 992 г., калі была заснавана першая епіскапская кафедра | Епархія |
| Ж | Апісанне жыцця і подзвігаў людзей, прылічаных хрысціянскай царквой да святых | Жыціе |
| З | Умацаваны цэнтр Полацка ў XI ст. на ўзвышшы плошчай 9,44 га. Быў абкружаны валам з усходу, па краі пляцоўкі ўмацаваны драўлянымі сценамі-гароднямі з вежамі | Замак |
| І | Пячатка гэтага князя з надпісам ад граматы з’яўляецца першым помнікам усходнеславянскага пісьменства | Ізяслаў |

| Літара алфавіта | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| К | Помнікі эпіграфікі, на якіх размешчаны выявы шасціканцовых крыжоў і розныя надпісы. Вядомыя Рагвалодаў і Барысавы... | Камяні |
| Л | У якой пісьмовай крыніцы адзначана, што прыйшоў Рагвалод «и-заморья, имяше свою волость в Полотьске»? | Летапіс |
| М | Полацкі князь Усяслаў пабудаваў «цвержу ў вусці ракі Нямігі ў Свіслач». Які горад ён заснаваў? | Мінск |
| Н | На працягу свайго існавання Полацкае княства заўсёды адстойвала сваю... | Незалежнасць |
| О | Гэта быў самы небяспечны вораг Полацкай зямлі. Кожнаму, хто ўступаў у ..., адрасавалі такія словы: «Наш статут: калі жадаеш снедаць, дык павінен пасціцца, калі хочаш пасціцца, дык павінен снедаць, калі не хочаш спаць, павінен спаць, калі хочаш спаць, павінен забыцца на сон...» | Ордэн мечаносцаў |
| П | Імя Рагнеда паходзіць з нарвежскай мовы і азначае... | Прыгожая |
| Р | Імя першага полацкага князя | Рагвалод |
| С | Гэты храм стаў сімвалам Полацка. З клічам «За святую...!» палачане ішлі ў бітву за свабоду сваёй зямлі | Сафія |
| Т | Ва Усцюжскім летапісе ён названы братам Рагвалода. Падначаліўшы дрыгавіцкія землі, заклаў на Прыпяці горад і назваў яго сваім імем | Тур |

| Літара алфавіта | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| У | Палачане верылі, што гэты князь можа абарачацца ў ваўка, тура, сокала, нібы герой былiннага эпасу волат Вольга | Усяслаў |
| Ф | Княжацкі шацёр упрыгожваў... | Флюгер |
| Х | У Полацку гэту рэлігію прынялі прадстаўнікі вышэйшай знаці. Сярод іх — Ізяслаў, сын Уладзіміра і Рагнеды | Хрысціянства |
| Ц | «... я была, ... і застануся, і нічыёй рабыняй не буду», — адказала Рагнеда на прапанову Уладзіміра выбраць сабе іншага мужа | Царыца |
| Ч | Сучаснікі гэтага князя лічылі яго вешчуном. Так за ім замацавалася прозвішча... | Чарадзей |
| Ш | Спосаб хуткага і нечаканага авалодання крэпасцю або горадам | Штурм |
| Э | Імя варажскага правіцеля, дружына якога знаходзілася на службе ў Брачыслава Ізяславіча | Эймунд |
| Ю | Прадоўжыце фразу: «Яму ў Полацку пазвоняць ... рана» | Ютрань |
| Я | Прадоўжыце фразу Рагнеды: «Не хачу разуць сына рабыні, а хачу за...» | Яраполка |

**Заданне 4.** Творчая работа.

*I варыянт.* Вучням прапануецца скласці генеалагічнае дрэва «Род Ізяславічаў», выкарыстоўваючы QR-код.

*II варыянт.* Вучні могуць падрыхтаваць фотакалаж «Духоўная спадчына полацкіх князёў».

*Тэма 13*

# *Адлюстраванне духоўнага свету беларусаў у казках і былінах*

## Метадычныя рэкамендацыі

Спачатку педагог прапануе вучням выканаць заданні 1, 2. З дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў» расказвае пра казачны эпас. Затым дзеці працуюць над заданнем 3, якое яны атрымалі на папярэдніх занятках. Далей педагог праводзіць літаратурную гульню «Мы — героі казак, адгадайце без падказак» (3—5 казак): зачытвае ўрыўкі з твораў, а вучні вызначаюць іх назву (можна правесці мастацкую гульню: педагог паказвае ілюстрацыі, а вучні называюць, да якой казкі яны адносяцца). Настаўнік апавядае пра быліны і прапануе выканаць заданні 7, 8. Далей расказвае быліну пра Волха Усяславіча, дзеці працуюць над заданнем 9. Заданні 4—6 вучні выконваюць пасля заняткаў або рыхтуюць іх загадзя. Выявы казачных герояў вывешваюцца на дошцы, дзецям прапануецца іх назваць.

Падчас канікул можна правесці «Тыдзень казкі», да якога падрыхтаваць выставу малюнкаў, прэзентацыю вучнёўскіх твораў, інсцэніроўку беларускай казкі. Другі варыянт — правесці гульню «У гасцях у беларускай казкі». Яна можа быць у выглядзе падарожжа з прыпынкамі «Казачны» (трэба адгадаць назву казкі па яе пачатку), «Загадкавы» (адгадаць казачных герояў па іх характарыстыках), «Ствараем разам» (кожная група атрымлівае канверт з пазламі, з якіх трэба сабраць карцінку і адгадаць, фрагмент якой казкі на ёй адлюстраваны), «Чароўны куфэрак» (вучням прапануецца адгадаць казку і назваць прадмет, які згубіў яе герой).

## Матэрыялы да заняткаў

Сярод апавядальных жанраў вуснай народнай творчасці багаццем і разнастайнасцю зместу вылучаюцца чарадзейныя казкі. Галоўнымі героямі ў іх з'яўляюцца асілкі Іванка-прастачок, Іван Падвей, Мікіта Кажамяка, Ілья Мурамец, Івашка Мядзведжае Вушка, Пакацігарошак. Яны валодаюць вялікай сілай, змагаюцца з нечалавечымі істотамі, перамагаюць іх і выратоўваюць людзей. Напрыклад, сын царскай дачкі Іван Падвей нарадзіўся ад ветру (падвею). Юнак-асілак валодае незвычайнай сілай, вялікім розумам і маладзецкай адвагай. Ён самаахвярна змагаецца са Змеем і Кашчэем.

Івашка Мядзведжае Вушка нарадзіўся з мядзведжымі вушамі. Ён расце не па днях, а па гадзінах, набывае незвычайную фізічную моц. Разам з маці хлопчыку даводзіцца ўцякаць ад свайго бацькі — Мядзведзя. Вандруючы па свеце, Івашка сустракае волатаў Дуба-Дубавіка і Гару-Гаравіка. Утраіх асілкі змагаюцца з Кашчэем і перамагаюць ліхадзея.

Пакацігарошак нарадзіўся ад гарошыны, якую з'ела яго маці. Ён таксама вельмі дужы. Разам з асілкамі Вярнідубам і Вярнігорам змагаецца са Змеем, перамагае яго і выратоўвае людзей.

У X—XI стст. пачалі распаўсюджвацца быліны пра волатаў Ілью Мурамца, Дабрыню, князя Уладзіміра Краснае Сонейка і інш. Іх тэксты былі запісаны ў XVIII—XIX стст. ад народных выканаўцаў.

Гістарызм былін пазбаўлены дакладнага датавання і храналагічнай паслядоўнасці. Некаторыя былінныя падзеі адлюстраваны ў летапісах. Спачатку гэты эпічны жанр бытаваў у вузкім коле княжацкіх дружыннікаў. У народным асяроддзі ён распаўсюдзіўся значна пазней. Так, вобраз быліннага героя Волха Усяславіча звязваюць з асобай полацкага князя Усяслава Брачыславіча. Быліна пачынаецца з расказу пра чарадзейнае нараджэнне галоўнага героя, бацькамі якога

былі князёўна і люты Змей. Волх Усяславіч валодаў здольнасцю абарачацца ў шэрага ваўка, вызначаўся спрытнасцю і мудрасцю.

Казкі і быліны аб'ядноўвае тэма барацьбы са злом. Перамога праўды і справядлівасці — асноўная ідэя гэтых эпічных жанраў.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучням трэба прадоўжыць сказ: «Жыў купец багаты, і была ў яго...», паразважаць, пра што пойдзе гаворка на занятках.

**Заданне 2.** Дзецям прапануецца растлумачыць значэнне паняцця «казка» і прывесці прыклады любімых казак.

**Заданне 3.** «Сустрэча з казкай». Вучні папярэдне чытаюць беларускую казку (на выбар) і разважаюць, у чым яе сэнс.

**Заданне 4.** Дзецям даецца заданне намаляваць любімага быліннага (казачнага) героя і падрыхтаваць пра яго расказ.

**Заданне 5.** Вучням прапануецца інсцэніраваць беларускую чарадзейную казку (на выбар).

**Заданне 6.** Вучням прапануецца прыдумаць уласную казку пра Лесуна (гаспадара лесу), Чарадзея, Цмока, трыццаць братоў, сон-траву або быліну пра волата (асілка).

**Заданне 7.** Дзецям прапануецца разгледзець выяву волата і адказаць на пытанні: «Хто ўслаўляўся ў былінах?», «Якія, на ваш погляд, ідэі ўвасабляліся ў былінах?», «Якія мастацка-выразныя сродкі характэрны для быліны?».

**Заданне 8.** Вучні чытаюць урывак з быліны пра Волха Усяславіча і вызначаюць характэрныя рысы героя:

Пачаў сабе Волх дружыну збіраць,
Дружыну збіраў ён сабе тры гады.
Ён набраў дружыну сем тысяч,
Сам ён, Волх, меў пятнаццаць год,
І ўся дружына яго па пятнаццаць гадоў.

**Заданне 9.** Літаратурная гульня «Мы — героі казак, адгадайце без падказак».

**Заданне 10.** Гульня «Пакажы казачнага героя». Удзельнічаюць 1—2 вучні, якія з дапамогай мімікі і жэстаў ствараюць вобраз казачнага героя, а астатнія вучні яго адгадваюць.

**Заданне 11.** Гульня на ўважлівасць «Казачны герой». Гуляюць дзве каманды. Вядучы (педагог) называе казачных герояў. Калі гэта станоўчы персанаж, вучні сцвярджальна ківаюць галавой, калі адмоўны — круцяць галавой з боку ў бок. Калі герой казкі мужчына — ставяць рукі на пояс, калі жанчына — апускаюць уніз. Удзельнікі, якія памыліліся, выбываюць. Каманда атрымлівае столькі балаў, колькі ўважлівых удзельнікаў у ёй засталося.

*Персанажы для гульні:* Кашчэй, Салавей-разбойнік, Пакацігарошак, Вярнідуб, Цмок, Вярнігор, Дуб-Дубавік, Змей, Гара-Гаравік, Івашка Мядзведжае Вушка, Іван удовін сын, Іванка-прастачок.

# *Раздзел II.*
# Духоўнае развіццё на беларускіх землях у часы Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIII ст.—1569 г.)

## *Тэма 14*
## *Паходжанне назвы Белая Русь*

### Метадычныя рэкамендацыі

Спачатку педагог прапануе вучням разгадаць галаваломку (№ 1) і вызначыць тэму заняткаў. Потым з дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў» расказвае пра паходжанне назвы *Белая Русь* або звяртае ўвагу дзяцей на заданне 4. Далей вучні выконваюць наступныя заданні.

### Матэрыялы да заняткаў

Можна вылучыць самыя папулярныя версіі ўзнікнення назвы *Белая Русь*.

1. Гісторыкі мяркуюць, што назва *Белая Русь* звязана са светлым колерам ільнянога адзення тутэйшых жыхароў, а таксама з цэнтральным размяшчэннем рэгіёна.
2. Этнографы адзначаюць уплыў на ўтварэнне назвы антрапалагічных рыс беларусаў — бландзінаў з блакітнымі або светла-шэрымі вачамі.

3. Мовазнаўцы звязваюць паходжанне назвы з вялікай колькасцю рэк і азёр у рэгіёне. Тэрмін «Белая Русь» у сувязі з гэтым перакладаюць як «чыстая вада».
4. Некаторыя гісторыкі сцвярджалі, што слова *белы* абазначае незалежнасць і магутнасць рэгіёна.
5. Лічыцца, што да прыняцця хрысціянства ў Еўропе існавала традыцыя суадносіць колеры з напрамкамі свету. Так, поўнач абазначалася чорным, поўдзень — чырвоным, захад — белым, усход — жоўтым або блакітным. Таму, на думку даследчыкаў, лагічна было б размясціць Белую Русь на захадзе ад іншых старажытнарускіх княстваў.
6. Яшчэ адна версія разглядае беларусаў як «праваслаўных русінаў», якія захавалі чысціню сваёй веры пасля пашырэння ўніяцтва.

Назва *Белая Русь* сустракаецца ў запісах невядомага англійскага місіянера (XIII ст.), перапісцы крыжакоў з еўрапейскімі манархамі (XV ст.), на асобных еўрапейскіх картах (напрыклад, венецыянца Фра Маўра (1459 г.)), у апавяданні пра памесце Бортнікі, захопленае ў 1407 г., Дублінскім рукапісе (створаны паміж 1255 і 1260 гг.), «Хроніцы Польшчы».

Доўгі час дакладнай лакалізацыі назвы *Белая Русь* не існавала. Яна ўжывалася ў дачыненні да розных зямель. У другой палове XVI — пачатку XVII ст. тэрмін *Белая Русь* стаў трывала асацыіравацца спачатку з тэрыторыяй Полаччыны, а пазней — з усімі землямі ВКЛ.

Назва народа — этнонім — з'яўляецца знешняй формай праяўлення самасвядомасці. У XIII—XVI стст. насельніцтва ВКЛ называлася па-рознаму. Але жыхары беларускіх зямель адрознівалі сябе ад іншых народнасцей. Доўгі час яны называлі сябе «рускімі», а сваю мову — «рускай». У значнай ступені гэта было абумоўлена перавагай там праваслаўя, або «рускай веры». Трэба адзначыць, што «рускае» насельніцтва ВКЛ ужо ў той час адрознівала сябе ад жыхароў Маскоўскай дзяржавы, якіх называлі «масквой», «маскавітамі», а іх

мову — «маскоўскай». Этнонім «рускія людзі» меў больш стабільную распаўсюджанасць сярод жыхароў Усходняй Беларусі. У XIV—XV стст. жыхары заходніх зямель Беларусі пераважна называлі сябе «ліцвінамі».

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць галаваломку. Знаходзяць першы кружок. Пераходзячы па злучальных лініях да астатніх, вызначаюць сярэдневяковую назву нашай краіны.




*Мал. 12.* Галаваломка

**Заданне 2.** Дзеці расшыфроўваюць пераклад назвы *Белая Русь*. Пры выкананні задання карыстаюцца беларускім алфавітам.

**26 28 19 20 1 32 3 1 5 1**

**Заданне 3.** Вучням прапануецца суаднесці лісты каляровай паперы з напрамкамі свету або размясціць каляровыя ўмоўныя абазначэнні на карце так, каб яны адпавядалі таму ці іншаму напрамку свету.

**Заданне 4.** На адным лісце сабраны выявы, якія адлюстроўваюць версіі ўзнікнення назвы *Белая Русь* (напрыклад, рака, возера, ільняное адзенне, чалавек у светлай адзежы, крыж, блакітныя або светла-шэрыя вочы). Ліст вывешваецца на бачным месцы. Педагог засякае час, вучні запісваюць

свае версіі, якія потым зачытваюцца. Той, хто дасць найбольш поўныя і разгорнутыя варыянты, атрымлівае 2 балы, астатнія — 1. Падлік балаў выяўляе лепшага знатака беларускай гісторыі.

**Заданне 5.** Творчая работа.

*I варыянт*. Вучням прапануецца падрыхтаваць кішэнны слоўнік «Саманазвы насельніцтва беларускіх зямель».

*II варыянт*. Вучні гуляюць у пазнавальна-інтэлектуальную гульню «Зямля з блакітнымі вачыма».

### Ход гульні

*1-ы этап.* Настаўнік кажа: «Падумайце, пра якую краіну можна сказаць "зямля з блакітнымі вачыма". Абгрунтуйце свае меркаванні. Як яшчэ называюць Беларусь?»

*2-і этап: «Шыфравальшчык».* У кожным слупку трэба вызначыць і выпісаць лішнюю літару. З усіх выпісаных літар неабходна скласці слова.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Б | О | Е | Р | Е | Ё | У | Ж | Х |
| Р | М | Л | К | В | Р | А | С | Р |
| С | Е | Г | Ы | Я | Н | Е | В | М |
| У | В | Р | А | Ч | А | Р | Е | А |
| Ь | А | Б | Ж | А | Л | В | А | Ь |

*3-і этап: «Наша спадчына».* Вучні збіраюць пазлы з выявамі культавых збудаванняў Беларусі і падпісваюць іх.

*4-ы этап: «Саманазвы».* Удзельнікам прапануецца запісаць назвы буйных беларускіх гарадоў і ўтварыць саманазвы іх жыхароў.

*5-ы этап: «Пазнай мяне».* Педагог паказвае партрэты вядомых беларускіх асветнікаў і дзеячаў. Вучні павінны назваць іх імя і прозвішча.

*6-ы этап: «Літаратурная гасцёўня»*. Устаўце прапушчаныя словы ў вершы У. Скарынкіна.

... Русь мая!
Чыстая ты мая!
Родная ты мая!
Белыя гоні бульбы,
Белыя ... дзяўчат.
Воблакаў ... над
Бугам вечны парад.
... грыбоў кашолкі,
Белыя плечы ...,
... россыпы золкіх
Чыстых світальных рос.
Белых туманаў плыні,
Белыя вершы ... .
Ціхая завадзь Бялыніч,
Рык белавежскіх ... .
Вейкі рамонкаў ...,
Белыя грывы завей.
Чыстыя душы смелых,
Простых тваіх людзей.
*(Белая, косы, белых, бяроз, буслоў, зуброў.)*

## *Тэма 15*
## *Старабеларуская мова — дзяржаўная мова Вялікага Княства Літоўскага і складальнік духоўнай спадчыны беларусаў*

### Метадычныя рэкамендацыі

Спачатку з дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў» педагог раскрывае тэму заняткаў. Далей вучні выконваюць заданні 1—6. Можна прапанаваць ім паразважаць на тэму «Родная мова — прыгожая і непаўторная».

## Матэрыялы да заняткаў

У другой палове XIII — першай палове XVI ст. актыўна развівалася старабеларуская літаратурная мова, якая ўвабрала характэрныя асаблівасці гаворкі насельніцтва Беларусі. Пісьмовыя помнікі тых часоў можна падзяліць на тры групы: юрыдычна-дзелавыя, свецка-мастацкія і царкоўна-рэлігійныя. Асноўнымі цэнтрамі юрыдычна-дзелавой пісьменнасці з'яўляліся дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія і магістрацкія канцылярыі. У XIII—XVI стст. шырока распаўсюджвалася царкоўна-рэлігійная літаратура. Яе асноўныя жанры — кнігі Бібліі, жыціі святых, апокрыфы. Творы былі перакладныя і арыгінальныя.

Нягледзячы на саманазву «проста мова», старабеларуская мова з'яўлялася важным сацыякультурным элементам штодзённага жыцця ВКЛ. Праз выкарыстанне дакументаў, складзеных «па старыне», сярэдневяковае грамадства праяўляла свае патрыятычныя настроі.

Істотны ўплыў старабеларуская мова аказала і на культуру іншых народаў, якія пражывалі на тэрыторыі ВКЛ. Яўрэі і цыганы карысталіся ёй у штодзённых зносінах, для татар яна ўвогуле стала роднай. Так, унікальнымі дакументальнымі помнікамі з'яўляюцца кітабы (ад араб. *кніга*) — кнігі, напісаныя арабскім шрыфтам на беларускай народнай мове. Іх стваралі татары, якія засялілі землі ВКЛ у XIV—XV стст. і пастулова прыстасавалі ўласную сістэму пісьма да беларускай фанетыкі.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні ўяўляюць сябе ў ролі перакладчыкаў. Ім неабходна перакласці са старабеларускай мовы на сучасную наступныя назвы месяцаў: *сьнежын, марець, кветень, травень, чирвець, липець, серпень, зарев, вресень, руин, риень, грудзень, прасінець.* Пры выкананні задання варта

карыстацца «Гістарычным слоўнікам беларускай мовы» (вып. 1—21).

**Заданне 2.** Вучні тлумачаць значэнні слоў і словазлучэнняў: *белая голова* (белая галава), гость (госць), ловы, закупы.

**Заданне 3.** Прапанаваныя словы вучням неабходна размеркаваць па групах.

*Віна, абывацель, бурмістр, ваявода, даннікі, кашталян, кроўныя, свірэпа (кабыла), талака, мыта, жаўнер, конь, пісар, удава, сваяк, мачаха, апека, адрубныя землі, сенажаць, воз, вершнік, бортніцтва, лань, рысь, млын, пушкары, маляры, сакольнікі.*

а) юрыдычныя тэрміны (напрыклад, прывілей);
б) назвы службовых асоб (маршалак);
в) бытавая і сельскагаспадарчая лексіка (хамут);
г) назвы жывёл і птушак (вол);
д) назвы людзей паводле сваяцтва (стрый).

**Заданне 4.** Вучні чытаюць урывак з «Прытчы пра душу і цела» К. Тураўскага. Разважаюць, у чым сэнс гэтага твора.

А еже насади виноград — рай глаголет. Того бо есть дело. Пишет бо ся: «И насади Бог рай в Едеме». А иже остени его, рече, оплотом — Своим страхом. Страхом бо Его, — рече пророк, — движится земля, раседается камение, животная трепещет, горы курятся, море и с сущими в нем повинуется, светила раболепно служат, облаци и вся въздушная тварь повелениа творят. Стена бо — закон ся речет. Закон же всему заповедь Божиа есть, предел бо, рече, положи, егоже не прейдут, ни обратятся. Постави же вход — сиречь сведениа разум, вся бо тварь не преступает Божия повелениа, «вся бо, — рече, — от Тебе чают, даси им пищю в время». Пища же не брашноречеться, но слово Божие, имже питается тварь. Глаголет бо Моисий: «Не о хлебе едином жив будет человек, но о всяком глаголе, исходящим из уст Божиих». Незатвореная же врата — дивныя твари Божия устроение и над теми Божиа сущьства познание. О твари бо, рече, Творца разумей: не качьство, но величьство и

силу, славу же и благодать, юже творит, угажая, всем вышним и нижним, видимым же и невидимым.

**Заданне 5.** З прыведзеных слоў дзеці выпісваюць тыя, якія звязаны з рэлігійнай сферай.

*Правдивый, воспети, господаръ, събирати, блаженный, мнихъ, житие, весело, богъ, благоверие, трапеза, думати, Евангелие, писати, ангелъ, латина, исповедникъ, дъяболъ, облако, капище, згинути, последний, архиерей, книга, грешный, идолохваление, балвохвальство, грамота, година, зверь, крестити, мудрий, грецкий, божьство, боголепно.*

**Заданне 6.** Творчая работа.

*I варыянт.* З дзвюх прапанаваных частак вучні складаюць прыказкі на старабеларускай мове, тлумачаць іх сэнс.

| | |
|---|---|
| Опарывшися на молоце, | што чоловекъ — то инъшая вера. |
| Што день — то новина, | и на воду дмухаеть. |
| Баба на торгъ гневалася, | тотъ лепшый. |
| Хто перъшый, | а торгъ о семъ ани ведалъ. |
| Самъ гуду, | а ветръ несетъ. |
| Собака брешетъ, | самъ же и плешу. |

*II варыянт.* Дзеці складаюць слоўнік рэлігійных тэрмінаў на старабеларускай мове. Падчас працы варта карыстацца «Гістарычным слоўнікам беларускай мовы» (вып. 1—21).

# *Тэма 16*
# *Мастацтва сярэдневяковай кнігі*

## Метадычныя рэкамендацыі

З дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў» педагог пачынае раскрываць тэму заняткаў. З паняццем «скрыпторый» вучні знаёмяцца пры выкананні задання 1; працуючы над заданнямі 2, 3, вызначаюць, як аздабляліся рукапісныя кнігі. Педагог працягвае свой расказ. Тлумачыць паняцце «мініяцюра» (ад лац. *minium* — кінавар, сурык — прыродныя фарбы, якімі ў старажытнасці размалёўвалі рукапісныя кнігі) — мастацкі твор малых памераў. Асобнае месца займае кніжная мініяцюра — шматколерныя ілюстрацыі ў рукапісных кнігах. Пры выкананні задання 3 педагог павінен расказаць вучням пра тыпы мініяцюр: ініцыял — дэкарыраваную, аднаколерную або размаляваную першую літару главы, раздзела кнігі; канон — рукапісныя табліцы ў выглядзе паралельных калонак з лічбамі. Для выканання задання 4 патрабуюцца каляровыя алоўкі, ксеракопіі ініцыялаў або заставак. Пакуль вучні размалёўваюць іх, педагог расказвае пра стылі аздаблення рукапісных кніг.

## Матэрыялы да заняткаў

На працягу XV ст. развіццю пісьменнасці на беларускіх землях спрыяла пашырэнне выкарыстання паперы, якую прывозілі з еўрапейскіх краін. Яна была таннейшая за пергамент, і дзякуючы гэтаму айчынныя рукапісныя кнігі сталі даступныя большаму колу пісьменных людзей.

Адным з вядучых цэнтраў асветы ў тагачаснай Беларусі быў Слуцк. У мясцовым скрыпторыі ішла актыўная перапіска кніг. У асноўным гэта былі літургічныя і багаслоўскія творы, якія захоўваліся пры княжацкім двары Алелькавічаў і ў слуцкім Троіцкім манастыры, вядомым буйным кнігазборам.

Акрамя Слуцка, цэнтры па перапісванні кніг дзейнічалі пры манастырах і княжацкіх рэзідэнцыях у Навагрудку, Пінску, Полацку, Супраслі, Жыровічах і Віцебску. На працягу XIII—XV стст. былі створаны новыя шэдэўры айчыннага кнігапісання — Аршанскае, Полацкае, Мсціжскае, Друцкае, Лаўрышаўскае, Жыровіцкае Евангеллі, а таксама Мсціслаўскі Псалтыр.

Адметнае месца ў гэтым спісе належыць Евангеллю XIV ст., якое было створана ў в. Лаўрышава (цяпер Навагрудскі раён). Помнік пісьменнасці напісаны царкоўна-славянскай мовай з асобнымі беларускімі гутарковымі элементамі, аздоблены 18 мініяцюрамі. Яго вокладку ўпрыгожвалі біруза, рубіны і ізумруды, а таксама сярэбраная пласцінка з рэльефнай выявай св. Дзмітрыя Салунскага са шчытом і кап'ём у руках.

У скрыпторыях перапісваліся жыції святых, у якіх расказвалася пра зямное жыццё і здзейсненыя цуды свецкіх асоб, кананізаваных хрысціянскай царквой. Да нас дайшло «Жыціе Еўфрасінні Полацкай». У гэты час узрасла і колькасць свецкіх перакладных твораў. Найбольшай папулярнасцю ў ВКЛ карыстаўся перакладзены на стараславянскую мову твор «Пчала», напісаны ў канцы XII — пачатку XIII ст. Яго выкарыстоўвалі ў якасці вучэбна-дыдактычнага дапаможніка ў пачатковых школах да XVII ст. Асноўныя раздзелы «Пчалы» ўтрымлівалі матэрыял пра праўду і крыўду, дабро і зло, сяброўства і варожасць. Змест дапаможніка дапаўнялі трапныя народныя прымаўкі і прыказкі.

Даволі шырокае распаўсюджванне на беларускіх землях атрымаў такі літаратурны жанр, як мемуарныя апісанні вандраванняў па розных краінах свету. Сюды можна аднесці «Хаджэнне ў Царград і Ерусалім» Ігнацыя Смаляніна (канец XIV ст.), «Хаджэнне ў Палесціну, Сінай і Егіпет» полацкага іераманаха Варсанофія (1462 г.).

Асноўнымі стылямі афармлення рукапісных кніг былі старавізантыйскі, звярыны, балканскі (пляцёнка), гатычны, новавізантыйскі, рэнесансавы (раслінная арнаментыка), старадрукарскі, фальклорны. У XIV ст. развіваўся звярыны стыль, найбольш выразны ў ініцыялах Мсціжскага, Полацкага Евангелляў. У другой палове XIV—XVI стст. для кніжнай мініяцюры былі характэрны свецкія, гістарычныя і побытавыя сюжэты (Лаўрышаўскае, Жыровіцкае Евангеллі). Шырока выкарыстоўваліся выявы евангелістаў (святых), ініцыялы і каноны.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Работа з ілюстрацыяй «Майстэрня па стварэнні кніг» па плане:



*Мал. 13.* Майстэрня па стварэнні кніг

1. Вызначыце сюжэт карціны (пра што расказвае карціна).
2. Апішыце, што намалявана на пярэднім плане.
3. Апішыце, што намалявана на заднім плане карціны.
4. Апішыце асноўных герояў карціны.
5. Вызначыце дэталі карціны.
6. Вызначыце асноўныя колеры (фарбы) карціны.

**Заданне 2.** Вучні вызначаюць, як называліся шматколерныя ілюстрацыі ў рукапісных кнігах. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць на адпаведныя літары беларускага алфавіта.

**14 10 15 10 32 25 31 18 1**

**Заданне 3.** Вучням прапануецца апісаць ілюстрацыю па плане:

1. Назва твора, дата стварэння.
2. Тып мініяцюры: ініцыял, канон.
3. Тэматыка выявы, сюжэт.
4. Сродкі мастацкай выразнасці, колеравае рашэнне, наяўнасць дэкаратыўных матываў.



*Мал. 14.* Св. Лука[8]

**Заданне 4.** Вучням прапануецца стварыць уласныя выяўленча-дэкаратыўныя элементы афармлення рукапісных кніг — ініцыялы, застаўкі. Можна выкарыстоўваць звярыны або рэнесансавы (раслінная арнаментыка) стыль аздаблення, як на малюнку 15.



*Мал. 15.* Ініцыялы

**Заданне 5.** Творчая работа. Вучні ствараюць эскіз уласнай кніжнай вокладкі, арыентуючыся на старадрукаваныя і рэдкія выданні. Можна выкарыстоўваць матэрыялы інтэрнэт-рэсурсаў.

[8] Малюнак 14 прадстаўлены ў выданні «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 тамах. Том 1 / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [ і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1996. — С. 536.

# *Тэма 17*
# *Культура этнічных меншасцей у ВКЛ*

## Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням разгадаць галаваломку (№ 1). Так вызначаецца тэма заняткаў. Яна раскрываецца з дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Перад тым як расказаць пра рэлігійныя кнігі татар, настаўнік прапаноўвае вучням выканаць заданне 2. Затым дзеці пераходзяць да задання 3. Педагог дапаўняе іх адказы. Вучні выконваюць наступныя заданні, а педагог больш падрабязна расказвае пра побыт яўрэйскага насельніцтва на беларускіх землях. Заданне 8 вучням прапаноўваецца падрыхтаваць загадзя. На канікулах можна правесці выставу малюнкаў традыцыйных (нацыянальных) касцюмаў этнічных меншасцей Беларусі.

## Матэрыялы да заняткаў

У XIV—XV стст. на тэрыторыі ВКЛ пражывалі розныя этнічныя групы: татары, яўрэі, цыганы, армяне, караімы. Татары на беларускіх землях з’явіліся ў канцы XIV — XV ст. у выніку ўнутрыпалітычных канфліктаў у Залатой Ардзе. Яны пасяліліся ў раёне Ашмян, Ліды, Мінска, Міра, Койданава, Мсціслава, Клецка і ў іншых месцах.

Татар ВКЛ звычайна падзяляюць на некалькі асноўных груп. Першую складалі гасударавы татары, якія атрымлівалі зямлю за сваю ваенную службу, другую — татары-казакі. У трэцюю, найбольш шматлікую групу ўваходзілі простыя татары. Яны пражывалі ў гарадах, мястэчках і вёсках, гадавалі коней, займаліся агародніцтвам, гарбарствам, іншымі рамёствамі. У гэтай этнічнай групе вылучаліся таксама адукаваныя духоўныя асобы і пісары.

У XV—XVI стст. на беларускіх землях пражывала прыкладна 7—10 тысяч татар. Яны атрымлівалі ва ўладанне зямлю, вызваляліся ад падаткаў, але за гэта абавязаны былі несці земскую службу. Згодна з перапісам 1528 г. у войску ВКЛ служыла прыблізна 4,5 тысячы татар.

Татарам забаранялася выступаць на судзе сведкамі супраць хрысціян, купляць хрысціян у няволю, займаць дзяржаўныя пасады. Цэнтрамі іх духоўнага і штодзённага жыцця былі культавыя будынкі — мячэці. У XVI ст. на беларускіх землях налічвалася каля 8 мячэцей. Мула — знаўца мусульманскіх навук — ажыццяўляў набажэнствы, кіраваў сходамі, вырашаў адміністрацыйныя і судовыя пытанні. Непадалёку ад мячэці звычайна размяшчаліся могілкі. Асноўнымі рэлігійнымі кнігамі татар былі Каран, кітабы. Аднак у культурным і рэлігійным жыцці татар выразна прасочваўся ўплыў старабеларускай мовы. Так, былі створаны кнігі, напісаныя на старабеларускай мове арабскім пісьмом. Пэўнай асіміляцыі татар спрыялі шлюбы з хрысціянамі.

Другая па колькасці этнаканфесіянальная група ў ВКЛ — цыганы. Упершыню яны згадваюцца ў Прывілеі вялікага князя літоўскага Аляксандра 25 мая 1501 г.

У Вялікае Княства Літоўскае цыганы прыйшлі як вольны народ і атрымалі значную дапамогу ў наладжванні самастойнага жыцця ў краіне. Яны славіліся як добрыя кавалі, конюхі, ювеліры, музыкі, спевакі, танцоры, варажбіты. Закон, прыняты ў 1566 г., забараняў забіраць цыганоў у войска. Тыя з іх, якія жабравалі, вызваляліся ад падаткаў.

На Беларусі было вядома некалькі цыганскіх вёсак: Цыганы ў Навагрудскім і Гарадоцкім паветах, Завячэлле, Мяшчэнцы, Лапатнікі. Прадстаўнікі гэтай народнасці аддавалі перавагу вандроўнаму ладу жыцця. Месцам іх збору звычайна былі кірмашы.

Цыганы вызнавалі тую ж рэлігію, што і мясцовыя жыхары. Сяліліся яны пераважна на ўскраіне населеных пунктаў,

дзе былі больш прыдатныя ўмовы для гандлю і промыслаў. Там яны ўтваралі свае абшчыны, выбіралі старэйшын — цыганскіх баронаў. Да любімых страў цыганоў адносяцца сала, яечня і хлеб. Хлеб у іх — сімвал жыцця.

Яўрэі на беларускай зямлі з'явіліся ў XIV ст. Іудзейскія абшчыны (кагалы) узніклі спачатку ў Брэсце і Гродне, а ў XV — першай палове XVI ст. — у Віцебску, Кобрыне, Клецку, Магілёве, Мінску, Навагрудку, Пінску, Полацку, Слоніме, Оршы і іншых населеных пунктах. Кагалы ствараліся па прынцыпах аўтаномнага самакіравання. Іх узначальвалі выбарныя рабіны, суддзі (даяны), якія займаліся ўнутранымі справамі абшчыны. Яны таксама збіралі падаткі, вызначалі расходы на забеспячэнне школ (ешыботаў). Агульныя справы вырашаліся на ваадзе — канфесійным сейме прадстаўнікоў рэгіянальных абшчын.

Важнымі рэлігійнымі, духоўнымі і асветніцкімі цэнтрамі былі малітоўныя храмы — сінагогі. У іх праходзілі ўсе абшчынныя рэлігійныя цырымоніі, пропаведзі. Тут вывучаліся і тлумачыліся Талмуд, іншыя прававыя і свяшчэнныя кнігі іудзеяў. Асноўнай святыняй была Тора ў пергаментных скрутках. Рэлігійныя традыцыі абумоўлівалі даволі высокі ўзровень школьнай адукацыі ў ешыботах, дзе вывучаліся рэлігійныя каноны, стараяўрэйская мова (іўрыт) і гутарковы ідыш, а таксама старабеларуская мова. Амаль усё яўрэйскае (мужчынскае) насельніцтва Беларусі было пісьменным.

Асноўныя нехрысціянскія канфесіі (іудаізм і іслам) існавалі на беларускіх землях афіцыйна, ва ўмовах дзяржаўнай талерантнасці. Яны маглі разлічваць на падтрымку вярхоўнай і мясцовай улады. У гісторыі не зарэгістраваны выпадкі публічнага пакарання іншаверцаў па этнаканфесіянальных абвінавачаннях. На беларускай зямлі прадстаўнікі розных канфесій і нацыянальнасцей жылі ў згодзе.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Галаваломка. Вучням трэба ўпісаць словы так, каб іх першыя літары склалі па вертыкалі тэму заняткаў (этнічныя меншасці).

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | | | | | | | | | | | |
| **2** | | | | | | | | | | | |
| **3** | | | | | | | | | | | |
| **4** | | | | | | | | | | | |
| **5** | | | | | | | | | | | |
| **6** | | | | | | | | | | | |
| **7** | | | | | | | | | | | |
| **8** | | | | | | | | | | | |
| **9** | | | | | | | | | | | |
| **10** | | | | | | | | | | | |
| **11** | | | | | | | | | | | |
| **12** | | | | | | | | | | | |
| **13** | | | | | | | | | | | |
| **14** | | | | | | | | | | | |
| **15** | | | | | | | | | | | |
| **16** | | | | | | | | | | | |

1. Група людзей, якая склалася гістарычна, аб'яднана агульным паходжаннем, тэрыторыяй, самасвядомасцю, мовай, побытам і культурай.
2. Месца гандлю або гандлёвая плошча.
3. Зямля, якая апрацоўвалася сялянамі і замацоўвалася ў іх уладанні.
4. Від жывапісу, прызначаны для стварэння святых выяў.
5. Даніна, якую выплачвалі грашыма.

6. Прадстаўнік вялікага князя, які надзяляўся адміністрацыйна-гаспадарчай, фінансавай, судовай уладай на тэрыторыі былых самастойных княстваў.
7. 29-я літара ў алфавіце.
8. Вера ў існаванне шматлікіх багоў, якія ўвасабляюць сілы прыроды, і глыбокае іх шанаванне.
9. Старажытнае паданне пра легендарных герояў, багоў, паходжанне свету і месца ў ім чалавека.
10. Раннехрысціянскі твор, у якім апавядаецца пра жыццё Ісуса Хрыста.
11. Устойлівая супольнасць людзей, заснаваная на агульнасці мовы, тэрыторыі, гаспадарчага і культурнага жыцця.
12. Прывілеяванае саслоўе ў ВКЛ.
13. Старшы епіскап, адзін з найважнейшых царкоўных чыноў.
14. Галоўная вялікая царква горада.
15. Аб'яднанне гарадскіх рамеснікаў адной або некалькіх блізкіх прафесій для арганізацыі збыту сваёй прадукцыі.
16. Выява бога, якога ўшаноўвалі язычнікі.

**Заданне 2.** Вучні вызначаюць, як называліся татарскія кнігі, напісаныя на старабеларускай мове арабскім пісьмом. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць адпаведнымі літарамі беларускага алфавіта.

**12 10 20 1 2**

**Заданне 3.** Вучням прапануецца ахарактарызаваць ілюстрацыю «Цыганскі табар», выкарыстоўваючы прыём «Літаратурныя ілюстрацыі»:

1. Хто адлюстраваны на малюнку? Па якіх прыметах вы здагадаліся?
2. Як падыходзіць мастак да выявы дзеючых асоб: дае толькі партрэт персанажа або паказвае яго ва ўзаемаадносінах з іншымі асобамі, у бытавой сітуацыі?

3. Якія рысы знешняга выгляду, характару, паводзін героя змог перадаць ілюстратар?
4. Якія графічныя (мастацкія) сродкі мастак выкарыстоўвае для характарыстыкі персанажа?



*Мал. 16.* Цыганскі табар

**Заданне 4.** З дапамогай даведкі дзеці тлумачаць лагічны ланцужок: *штэтл — дом — сінагога — рынак.*

***Даведка.*** Сям'я для яўрэяў з'яўлялася найвялікшай каштоўнасцю. Тут выконваліся рэлігійныя абрады, захоўваліся старажытныя традыцыі. Асаблівае месца ў жыцці яўрэяў займала сінагога — месца засяроджвання духоўнага жыцця, дзе маліліся, вывучалі Талмуд і Тору. Сінагога таксама была сацыяльным цэнтрам штэтла (мястэчка). Сацыяльны статус члена абшчыны вызначаўся па тым, якое месца ён займаў у малітоўным храме. Так, лаўкі каля ўсходняй сцяны (арыентаванай на Іерусалім) прызначаліся для самых багатых і паважаных членаў абшчыны, каля заходняй — для беднякоў. Законы ВКЛ забяспечвалі яўрэям пэўныя прывілеі: свабоду гандлю і прамысловых заняткаў.

**Заданне 5.** З дапамогай паняццяў «дабрачыннасць» і «жабрацкая манета» вучні дапаўняюць сказы ў тэксце:

Заможныя яўрэі нярэдка займаліся ... . Яны шчыра імкнуліся палепшыць жыццё сваіх менш забяспечаных супляменнікаў.

... з’яўляецца адной з запаведзяў іудаізму. Пры кожнай сінагозе мелася свая ... арганізацыя. Яна займалася дапамогай бедным. Бедныя яўрэі свабодна ўваходзілі ў дамы сваіх пабрацімаў і прасілі ... . Адмовіць бедняку было нельга. Мясцовыя яўрэі раздавалі беднякам выразаную з кардону ..., якую яны маглі абмяняць на сапраўдныя грошы.

**Заданне 6.** Дзеці тлумачаць сэнс прыказак, якія ўжывалі на беларускіх землях розныя этнічныя меншасці:

| | |
|---|---|
| Цыганы | У каго кроў халодная, той не цыган.<br>Было ў цыгана дзве нагі, Бог яму чатыры дадаў.<br>У якую б краіну ні прыйшоў, усюды сваю сям’ю знайшоў.<br>Як ні завіся, чалавекам заставайся |
| Яўрэі | Сусед не для таго, каб яго любіць, а для таго, каб мірна жыць.<br>Купляючы хату, спачатку распытай пра сваіх суседзяў.<br>Нікому не зайздросці: зайздрасць есць здароўе.<br>Не будзь мудры на словах — будзь мудры на справе |
| Татары | Што ў лесе крыкнеш, тое ў адказ пачуеш.<br>Да любога замка ключ падабраць можна.<br>Для злога і дзень, і ноч цёмныя.<br>Дзе шмат пастухоў, там усе авечкі перадохнуць |

**Заданне 7.** Вучні расказваюць, як разумеюць сэнс кітаба «Пра маральныя вартасці»[9].

Чэтыры рэчы чалавека здобець, йак дараги камен. Першы: розум, вера, устыдливосьць, учынек добры. А чэтырма рэчами

[9] *Несцяровіч, В. І.* Старажытныя рукапісы беларускіх татар (Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія.) : манаграфія. — Віцебск : Выдавецтва УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2003. — 104 с.

лихими тыйе чэтыры добрыйе запсуйе: йак зазлуйецца — загине розум, йак... блуд учыниць — загине вера, йак на што паквапицца — зьгине у йаго устыдливосьць, ...йак прагавор учыниць — загине учынек добры. Хто ужывайе херам, сем рэчэй злогу сабе шкадоивога майе мець. Першайе: жывот йего чорни будзе, і прозьба йего да Пана Бога не будзе даходна, і моцы мець не будзе, чутасьці у вушах, йаснасьці у вачах не будзе, краскі на твары не будзе мець і спору у даму не будзе.

**Заданне 8.** Творчая работа.

*I варыянт*. У адной з сацыяльных сетак вучні ствараюць пост пра традыцыі, звычаі і заняткі этнічных меншасцей сучаснай Беларусі, выкарыстоўваюць відэа- і фотаматэрыялы.

*II варыянт*. Вучням прапануецца намаляваць традыцыйныя (нацыянальныя) касцюмы этнічных меншасцей Беларусі.

*III варыянт*. Вучні ствараюць лэпбук «Этнічныя меншасці» (на выбар) па плане:

1. Традыцыйная ежа.
2. Рэлігійныя святы.
3. Асноўныя заняткі.
4. Нацыянальная культура.
5. Абрады і звычаі.

## *Тэма 18*
## *Уклад хрысціянскіх вернікаў у духоўную спадчыну беларусаў*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням разгадаць SMS-крыжаванку (№ 1). Затым з дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў» расказвае пра духоўнае жыццё ў ВКЛ. Вучні разгад-

ваюць галаваломку (№ 2), тлумачаць значэнні адгаданых слоў. Далей педагог прапаноўвае дзецям прадоўжыць выразы (№ 3), паўдзельнічаць у гульні «Складзі слова» (№ 4). Ён расказвае пра распаўсюджванне каталіцызму на беларускіх землях, прапануе выканаць заданне 12 (можна выкарыстоўваць іншыя ілюстрацыі, якія будуць сведчыць пра пашырэнне хрысціянства ў ВКЛ). Вучні разгадваюць шарады, тлумачаць значэнні адгаданых слоў. Педагог расказвае пра дзейнасць манаскіх ордэнаў у ВКЛ. Далей вучні працуюць над заданнямі 6, 9, 10, 11. Заданне 7 яны могуць выканаць з дапамогай дадатковага матэрыялу: карцінак з выявамі рэлігійных свят, іх назваў, ключавых слоў для пабудовы свайго расказу.

Выканаць заданні 8, 13 вучням прапануецца загадзя. Вынікі неабходна падвесці ў шосты школьны дзень або на канікулах. Вынікам творчай работы могуць быць расказ або малюнкі на дадзеную тэму, фатаграфіі.

## Матэрыялы да заняткаў

Праваслаўная царква бясспрэчна панавала ў ВКЛ і ў той жа час суіснавала з язычніцтвам і каталіцтвам. У канцы XIII — сярэдзіне XV ст. у дзяржаве існавала некалькі буйных царкоўных арганізацый. Беларускія землі ў гэты перыяд уваходзілі ў склад Навагрудскай, Полацкай, Тураўскай, часткова Уладзімірскай і Смаленскай епархій. Невялікая частка паўднёва-ўсходніх зямель з Гомелем і Чачэрскам адносілася да Чарнігаўскай епархіі.

Сельскія праваслаўныя цэрквы звычайна будаваліся з дрэва і каштавалі нядорага. Яны называліся *клеткі*. Некаторыя цэрквы ставілі на свае абшчынныя грошы самі сяляне. У многіх сем'ях статус царкоўных служак перадаваўся ў спадчыну.

У тыя часы некалькі дзясяткаў праваслаўных манастыроў дзейнічала на Полаччыне, Навагрудчыне, Піншчыне.

Большасць з іх налічвала нязначную колькасць чорнага духавенства (15—20 манахаў). З цягам часу некаторыя з манастыроў ператварыліся ў значныя цэнтры выхавання, адукацыі, пісьменнасці, царкоўных спеваў, рамяства і мастацтва.

У царкоўнай іерархіі вышэйшыя пасады займалі мітрапаліты і епіскапы. Па канонах хрысціянства праваслаўная царква, як і каталіцкая, не магла прэтэндаваць на палітычную ўладу, а кіраўнікі дзяржавы ў сваю чаргу не павінны былі ўмешвацца ў царкоўныя справы. Вярхоўная ўлада часцей за ўсё выступала як абаронца праў праваслаўя, але пры неабходнасці магла назначаць у цэрквы і манастыры пастыраў замежнага паходжання. У асноўным гэта права выкарыстоўвалася для забеспячэння касцёлаў польскім клірам. Праваслаўная царква ВКЛ пашырала і паглыбляла хрысціянізацыю зямель, вызначала нормы грамадскага жыцця і маралі.

Каталіцкая царква ВКЛ атрымала шэраг праў і прывілей: судовы імунітэт, землі, даходы і павіннасці ад падданых. Каталіцкія парафіі ўзніклі на паўночна-заходніх і заходніх беларускіх землях. Там было заснавана Віленскае біскупства. Большасць біскупаў паходзіла з сямей духавенства і шляхты. Некаторыя з іх ведалі літоўскую і беларускую мовы, мелі вышэйшую адукацыю.

З канца XIV ст. у ВКЛ пачынаюць дзейнічаць манаскія ордэны. Так, у Лідзе быў заснаваны францысканскі касцёл, у Полацку — бернардзінскі, у Быстрыцы і Медніках — аўгусцінскі. У Вільню запрасілі дамініканцаў. Усе манаскія ордэны на беларускіх землях адносіліся да катэгорыі жабрацкіх, ім забаранялася мець нерухомую маёмасць. Не дабіліся яны значных поспехаў і ў місіянерскай дзейнасці сярод праваслаўнага насельніцтва. Больш адчувальны ўплыў мела іх дзейнасць на язычнікаў і нехрысціян. Дзейнасць ордэнаў насіла эпізадычны, нерэгулярны характар.

У Вільні ў першай палове XVI ст. дзейнічала 14 касцёлаў, 16 цэркваў, 3 праваслаўныя, 4 каталіцкія манастыры. Навагрудак, Мінск, Полацк былі асноўнымі царкоўна-манастырскімі цэнтрамі праваслаўнай мітраполіі ў межах ВКЛ. Тут фарміравалася вышэйшая царкоўная адміністрацыя, працавалі судовыя і іншыя органы, скрыпторыі, канцыляры.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць SMS-крыжаванку (гл. мал. 5). Вызначаюць ключавыя словы тэмы заняткаў.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | 1 | 6 | 1 | 4 | 3 | 7 | 9 | 3 | 4 |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 6 | 1 | 1 | 1 | 6 | 4 | 1 | 7’ | 2 |

**Заданне 2.** Галаваломка. Дзецям трэба знайсці ў прамавугольніку як мага больш слоў. Літары ў словах павінны быць злучаны лініяй.




*Мал. 17.* Галаваломка

**Заданне 3.** Вучням прапануецца прадоўжыць выразы: «Чалавек не хлебам адзіным жывы, а ўсякім словам, якое зыходзіць з вуснаў…», «Ісус адказаў: “Што немагчыма людзям…”», «Бог не даў нам дух страху і нясмеласці, але сілы, любові і …».

**Заданне 4.** Гульня «Складзі слова». Склаўшы словы, вучні даведаюцца, як называецца ўбранне святароў.

**ТАСУНА; ЯТЫРА; ТРАМІ; УСПІКА; РЭТБЕ**

**Заданне 5.** Разгадайце шарады.

Першае слова — расійскі манарх.
Другое — жаба вымаўляе.
А разам — гэта храм.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | + | | | | = ... . |

Частка першая — галаўны ўбор святароў.
Частка другая — расліна сямейства імхоў.
А разам — царкоўная правінцыя.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | + | | | | | | = ... . |

Мой першы склад — *хор*, але без літары *х*.
Другі мой склад — *до*, але з літарай *э*.
У канцы часціца *не*, але без *е*.
А разам — грамадская арганізацыя.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | – | | | – | | = ... . |

Першае слова — тое, што звышнатуральнай сілай завецца.
Другое — першыя літары Тырэнскага мора.
Паміж словамі прыназоўнік даецца.
А разам — рэлігійнай суполкай завецца.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | – | | – | | | | = ... . |

**Заданне 6.** Вучні разважаюць на тэму «Калі б я ствараў карціну, што б намаляваў на сюжэт выбару веры».

**Заданне 7.** Дзеці складаюць расказ на тэму «Рэлігійныя святы ў хрысціянстве» (адно свята на выбар).

**Заданне 8.** Вучні працуюць над сачыненнем-разважаннем на адну з тэм: «Як я разумею праваслаўе», «Як я разумею каталіцтва», «Роля рэлігіі ў жыцці чалавека і грамадства Сярэдневякоўя», «Помнікі рэлігійнай культуры (у маім горадзе, вёсцы)».

**Алгарытм напісання сачынення-разважання**

- Сачыненне-разважанне мае наступную кампазіцыю: уступ — асноўная частка — заключэнне.
- Ва ўступе выкладаецца асноўная думка — тэзіс.
- Асноўная частка сачынення-разважання — разгортванне тэзіса.
- Заключэнне і ўступ сачынення цесна звязаны паміж сабой па сэнсе.
- Можна выкарыстаць цытаты з твораў пісьменнікаў, выказванні вядомых вучоных.

**Заданне 9.** Вучням прапануецца паглядзець відэафрагмент анімацыйнага фільма «Першаначальнік» і адказаць на пытанне «Ці патрэбна чалавеку вера ў Бога?». Перайсці да прагляду можна з дапамогай QR-кода.

**Заданне 10.** Вучні разгадваюць філфорд: у хаосе літар ім трэба знайсці 7 смяротных грахоў.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Г | А | Ю | І | В | Ц | Ь | Ы |
| А | Н | Р | Л | А | С | З | Н |
| Б | А | Е | Ь | Ц | В | А | П |
| Ж | Р | Ы | Ў | С | К | Й | Н |
| О | А | С | Т | А | Р | Д | А |
| Р | В | Б | Д | З | Ь | Ц | С |
| С | Т | Я | З | Е | Й | Н | А |

**Заданне 11.** Вучні разважаюць і адказваюць на пытанне.

У каталіцтве падчас працэдуры кананізацыі праводзіцца суд. Яго мэта — вызначыць, ці з'яўляецца чалавек святым. Адпаведныя факты з яго біяграфіі правярае спецыяльная камісія. На працэдуры прысутнічае афіцыйны прадстаўнік Ватыкана, якога называюць *адвакатам д'ябла*. Як вы лічыце, якая яго роля на судзе?

**Заданне 12.** Вучні высвятляюць, што адлюстравана на малюнках, пра распаўсюджванне якой рэлігіі яны сведчаць.



*Мал. 18.* Храм 1



*Мал. 19.* Храм 2

**Заданне 13.** Творчая работа.

*I варыянт*. Вучні малююць храм, выкарыстоўваючы колеравую палітру, характэрную для XI ст.

*II варыянт.* Вучні праводзяць мерапрыемства «Чароўны свет рэлігійных свят» або прапаноўваюць свой варыянт сцэнарыя.

*III варыянт.* Дзеці ствараюць флаеры (плакаты) пра каталіцкі або праваслаўны храм XI ст. на беларускіх землях з кароткай інфармацыяй пра яго і ілюстрацыямі (фотаздымкі, малюнкі).

# *Тэма 19*
# *Раманскі стыль у замкавым будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі*

## Метадычныя рэкамендацыі

Педагог пачынае заняткі, выкарыстоўваючы інфармацыю з рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Калі ён падыходзіць да расказу пра вежы-данжоны, вучням прапануецца выканаць заданне 1. Затым дзеці пераходзяць да задання 3, педагог працягвае апавядаць пра замкі-кастэлі. У канцы заняткаў вучням прапануецца адказаць на пытанне задання 2 і разгадаць крыжаванку. Таксама яны могуць падрыхтаваць малюнак замка: педагог загадзя рыхтуе шаблоны сярэдневяковых збудаванняў, каляровыя алоўкі. Вучні малююць, а педагог расказвае пра замкі, якія існавалі на беларускіх землях.

Другі варыянт правядзення заняткаў — педагог прапануе вучням разгадаць крыжаванку. Перад кожным пытаннем ён дае кароткую даведку, якая дапаможа дзецям знайсці правільны адказ. Затым вучні працуюць над заданнямі 2, 5, 6. Загадзя яны выконваюць творчую работу (№ 7).

Трэці варыянт — вучні разам з педагогам ствараюць макет замка. У працэсе работы настаўнік расказвае пра абарончую архітэктуру Беларусі.

*Матэрыялы для стварэння макета:* кардон або каляровая папера, нажніцы, клей, скотч, канцылярскі нож, утулкі ад папяровых ручнікоў або туалетнай паперы, каляровыя алоўкі, фламастары, фарбы. На кардоне (паперы) з дапамогай шаблона малююцца контуры замка. Затым выразаюцца асноўныя дэталі. Ад іх краёў важна прадугледзець водступы на 5—10 мм, каб было зручна склейваць. Пры вялікай колькасці дэталі нумаруюць, калі трэба — афарбоўваюць. Вялікія элементы замка збіраюць на клей або скотч, прымацоўваюць сярэднія і дробныя (дзверы, вежы, лесвіцы, балконы). Гатовы

замак ставяць на цвёрдую аснову — пенапласт, кардон, фанеру. Можна выкарыстоўваць стэплер, двухбаковы скотч або клей моцнай фіксацыі. Замак дадаткова ўпрыгожваюць дэкаратыўнымі элементамі, сцяжкамі, гербамі, замочкамі, фігуркамі людзей, мадэлямі зброі.

## Матэрыялы да заняткаў

З'яўленне першых мураваных абарончых збудаванняў на тэрыторыі ВКЛ датуецца другой паловай XIII ст. Імі сталі магутныя данжоны (ад французскага *donjon* — замкавая вежа). Яны ўяўлялі сабой шмат'ярусныя вежы, абкружаныя магутнымі сценамі. На іх канструкцыю моцна паўплывалі заходнееўрапейскія архітэктурна-мастацкія стылі. Так, раманскі стыль праявіўся ў выкарыстанні буйнапамернай брусковай цэглы і балтыйскай сістэмы муроўкі (таўшчыня сцен 2,5—3 м). Гатычныя рысы перадаліся байніцам стральчатай формы. Яскравы ўзор данжона на беларускіх землях — Камянецкая вежа. Пяціяруснае круглае збудаванне было ўзведзена паміж 1276 і 1288 гг. Яно стаіць на каменным падмурку вышынёй каля 2,3 м і дыяметрам 16 м. Вышыня сцен — каля 30 м, таўшчыня — 2,5 м, дыяметр — 13,6 м. Вежа складзена з цэглы цёмна-чырвонага і жоўтага колераў. Яна была абарончай, таму характарызуецца вузкімі байніцамі, 4 плоскімі нішамі з паўцыркульнымі завяршэннямі. Верхнюю пляцоўку вежы завяршаюць 14 прамавугольных зубцоў з адтулінамі для дазору.

Паступова будаўніцтва вежаў-данжонаў распаўсюдзілася па ўсёй тэрыторыі ВКЛ. Яны з'явіліся ў Брэсце, Гродне, Навагрудку, Тураве, Полацку.

У XIV—XV стст. замкі на беларускіх землях мелі масіўны і суровы выгляд. Называліся яны кастэлямі (ад лацінскага *castellum* — умацаванне) і ўяўлялі сабой чатырохвугольныя збудаванні з магутнымі сценамі. Замкі-кастэлі мелі 1—2 мураваныя вежы ў процілеглых вуглах. На ўнутраных пляцоў-

ках узводзіліся разнастайныя драўляныя збудаванні — памяшканні ваеннага, жылога і гаспадарчага прызначэння.

У пачатку XIV ст. замак-кастэль у форме няправільнай трапецыі быў пабудаваны ў Крэве (цяпер вёска ў Смаргонскім раёне). Ён размясціўся на штучна створаным насыпе. Замкавыя сцены таўшчынёй да 3 м і вышынёй 13 м мелі каменную аснову і цагляную баявую галерэю ўверсе. У замку было дзве вежы, размешчаныя па дыяганалі. Адна з іх называлася Княжаскай. Пабудаваная з каменю вежа стаяла на трохметровым фундаменце, і ў ёй сапраўды размяшчаліся княжаскія пакоі. Трапіць туды можна было толькі з баявой галерэі. Другая вежа — Малая — была чатырохпавярховая.

Яшчэ адзін замак-кастэль у 1320-я гг. узвялі ў Лідзе. Ён таксама размяшчаўся на штучным насыпе са жвіру, пяску і камянёў на балоцістых берагах рэк Лідзея і Каменка. Лідскі замак нагадваў няправільны чатырохвугольнік. Яго сцены, складзеныя з валуноў, мелі вышыню 12 м і таўшчыню да 2 м. У верхняй частцы знаходзілася цагляная баявая галерэя з байніцамі праз кожныя 2,4 м. Замак меў два ўваходы. Галоўны ўваход быў выкананы ў выглядзе штодзённай Малой брамы і парадной Вялікай брамы. Шырыня першай дасягала 2,5 м, вышыня — 3 м, другой — адпаведна 4,5 і 6 м. З боку двара да малога ўвахода пазней прыладзілі абарончае збудаванне ў форме падковы: калі б вораг здолеў выламаць вароты, то трапіў бы ў каменны мяшок, з якога не было паратунку. З поўначы, на адлегласці 7—10 метраў ад замкавых муроў, праходзіў глыбокі роў шырынёй каля 2 метраў. Ён злучаў дзве ракі і абараняў замак з боку горада. Дэкаратыўны пояс, які праходзіў па перыметры ўсіх сцен, выкананы ў тэхніцы балтыйскай муроўкі.

Старажытныя дойліды ўжывалі цэглу двух тыпаў. З той, што мела таўшчыню да 0,1 м, складзены арка малога ўвахода, байніцы, дэкаратыўныя паясы замкавых муроў. Баявая галерэя пабудавана з танчэйшай цэглы. Большасць цаглін мае роўную паверхню, але сустракаюцца і са слабымі адбіткамі пальцаў.

У 1398—1402 гг. узнік Гродзенскі замак. Ён меў форму няправільнага трохвугольніка і налічваў пяць веж. Замкавыя сцены дасягалі таўшчыні да 3 м і заканчваліся баявой галерэяй. На тэрыторыі замка размяшчаўся двухпавярховы мураваны палац. З вонкавага боку вежы, сцены і палац былі ўмацаваны контрфорсамі — каменнымі падпоркамі. Ад горада замак аддзяляўся 50-метровым ровам, праз які быў перакінуты пад’ёмны мост. За межамі горада ўзнік так званы акольны горад — гандлёва-рамесны пасад, які згадваецца пад назвай Ніжні замак.

Да 1410 г. ішло аднаўленне Навагрудскага замка. Драўляныя ўмацаванні замяняліся на мураваныя. Да нашых дзён захавалася вежа-брама Шчытоўка. Спачатку яна мела квадратную форму, пяць паверхаў вышынёй 25 метраў, сцены таўшчынёй каля 2,7 м. Вежу праразалі вузкія байніцы, унізе знаходзілася вялікая ўязная брама. На ўсходзе ад Шчытоўкі былі ўзведзены трохпавярховыя Касцёльная, Пасадская вежы і Малая брама. Чатыры будыніны злучаліся паміж сабой цаглянай сцяной агульнай працягласцю больш за 180 м. Пазней каля падножжа каменнай гары была пабудавана Калодзежная вежа, звязаная з замкам сцяной у 21 м. Частка веж і сцен умацоўвалася контрфорсамі. Паўночна-заходні бок замка ўсё яшчэ захоўваў драўляныя ўмацаванні. У канцы XV ст. замест іх узвялі пяціпавярховую вежу — Дазорац. Са Шчытоўкай і Пасадскай вежай яе звязвалі мураваныя сцены. Меская брама з’явілася каля Калодзежнай вежы і злучалася з ёй, а таксама з Малой брамай тоўстымі перакрыццямі. З паўночнага і паўночна-заходняга боку падступы да замка прыкрываў вал вышынёй да 30 м з драўлянымі ўмацаваннямі наверсе. Невыпадкова Навагрудскі замак лічыўся ў тыя часы адным з найбольш магутных.

Манументальныя мураваныя цытадэлі ў XIV—XV стст. былі ўзведзены ў Віцебску і Оршы. Новыя ўмацаванні будаваліся вакол пасадаў беларускіх гарадоў. Так, Мядзельскі замак XV—XVI стст. меў тры цыліндрычныя вежы. Самая

вялікая з іх была дыяметрам 17,5 м, а таўшчыня яе сцен — 3,5 м. У канцы XV — XVI ст. замак быў пабудаваны ў Гераненах. Па яго вуглах стаялі цыліндрычныя вежы дыяметрам 8 м, пабудаваныя ў тэхніцы лусковай муроўкі.

***Цікавыя звесткі.*** Лідскі замак мае сцены 12-метровай вышыні і агульнай даўжынёй 341 м. Ён лічыцца адным з самых вялікіх на тэрыторыі Беларусі. У 2005 г. у Лідскім замку прайшоў I Міжнародны рыцарскі турнір «Замак Гедыміна», у маі 2007 г. — бугуртныя баі «Меч Лідскага замка». У мерапрыемствах удзельнічалі рыцарскія клубы Польшчы, Расіі, краін Балтыі, Беларусі.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні расшыфроўваюць, што ў перакладзе з французскай мовы азначае слова «данжон».

**9 1 14 12 1 3 1 32 3 6 8 1**

**Заданне 2.** Дзецям прапануецца назваць помнікі раманскага стылю, якія да нашага часу захаваліся ў нязменным выглядзе.

**Заданне 3.** Вучні расшыфроўваюць, як на беларускіх землях у XIV—XV стст. называўся замак.

**К А Л Ь С Т Э**

**Заданне 4.** Вучні разгадваюць крыжаванку «Абарончая архітэктура».

1. Ад якога слова паходзіць назва раманскага стылю?
2. Адна з характэрных рыс раманскага стылю — балтыйская ... .
3. Замак, які меў масіўны і суровы выгляд.
4. Дадатковае ўмацаванне вакол замка.
5. Асноўны матэрыял, які выкарыстоўваўся пры будаўніцтве замкаў.
6. Назва першых мураваных абарончых збудаванняў у ВКЛ.

7. Матэрыял, які выкарыстоўваўся пры збудаванні бакавых сцен замка.
8. Другая назва замкавай вежы.



**Заданне 5.** Міні-чайнворд «Пазнай».

У цэнтры чайнворда — выявы розных замкаў і іх элементаў. Ілюстрацыі дапамогуць вучням адказаць на шэраг пытанняў. Адказы трэба ўпісваць па перыметры. Паміж імі ёсць раздзяляльныя клеткі.

1. Гэты замак меў і драўляныя, і мураваныя ўмацаванні.
2. Самая высокая абарончая вежа на беларускіх землях.
3. Адтуліна ў сцяне абарончага збудавання для вядзення агню са стралковай зброі.
4. Абарончае ўмацаванне ў выглядзе штучна створанага канала.
5. Першы каменны замак-кастэль у ВКЛ.
6. Гарадскія, крапасныя, цвінтарныя вароты. Могуць быць у выглядзе аркі.
7. Помнік абарончага дойлідства XIV ст., дзе і цяпер праводзяцца рыцарскія турніры.
8. Абарончы будынак, складаная частка агароджы (сцен) цытадэлі.

9. Тып перасоўнага збудавання каля ўвахода ў замак або вежу.
10. Баявы ход наверсе сцяны замка.




*Мал. 20*. Міні-чайнворд «Пазнай»

**Заданне 6.** З дапамогай QR-кода дзеці пераходзяць на інтэрнэт-рэсурс «Вырабы з паперы (кардону) замкаў». Ствараюць макет замка або вежы-данжона.

**Заданне 7.** Творчая работа.

*I варыянт.* Вучням прапануецца падрыхтаваць лэпбук пра раманскія помнікі дойлідства на тэрыторыі Беларусі (адзін помнік на выбар).

Лэпбук павінен змяшчаць наступныя раздзелы (рубрыкі):

1) дата ўзнікнення помніка;
2) яго ўладальнікі;
3) знешні і ўнутраны выгляд (фотаздымкі, ілюстрацыі, малюнкі);
4) цікавыя звесткі з гісторыі існавання помніка;
5) архітэктурныя асаблівасці помніка.

*II варыянт.* Вучні ствараюць 3D-мадэль рэканструкцыі помніка (на выбар) у спецыяльнай праграме, да якой можна перайсці з дапамогай QR-кода. З інструкцыяй, як працаваць у праграме, можна пазнаёміцца тут.

## *Тэма 20*
## *Гатычны стыль у царкоўным будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі*

### Метадычныя рэкамендацыі

Заняткі пачынаюцца з выканання задання 1. Затым вучні працуюць з табліцай (№ 2), а педагог, выкарыстоўваючы інфармацыю рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў», расказвае пра храмы. Дзеці пераходзяць да наступных заданняў. Для выканання задання 3 спатрэбяцца адміністрацыйная карта сучаснай Беларусі і каляровыя выявы гатычных храмаў памерам 4 × 4 см. Заданне 5 выконваецца з дапамогай шабло-

наў, педагог можа больш падрабязна расказаць пра архітэктурныя помнікі.

Заданне 6 выконваецца двума спосабамі.

1. Вучні падбіраюць ілюстрацыі гатычных храмаў і з дапамогай анлайн-праграмы (пераход па QR-кодзе) ствараюць і збіраюць пазл. Для выканання патрэбны мабільны тэлефон і доступ да сеткі інтэрнэт.
   - Вучні заходзяць на сайт.
   - Выбіраюць функцыю «Стварыць пазл са сваёй фатаграфіі або карціны».
   - Загружаюць выяву.
   - Выбіраюць колькасць пазлаў (6 або 42, можна і болей).
   - Націскаюць кнопку «Пачаць гульню».
2. Педагог раздрукоўвае выявы храмаў, з дапамогай шаблону дзеліць іх на пазлы, перамешвае і прапануе вучням іх сабраць.

*Матэрыял:* выявы храмаў, шаблон фармату А4, капірка, нажніцы.

Вучні могуць выканаць усе этапы задання самастойна, а потым прапанаваць аднакласнікам сабраць пазлы.

## Матэрыялы да заняткаў

На мяжы XIII—XIV стст. візантыйскія традыцыі ў храмавым дойлідстве пачалі саступаць месца заходнееўрапейскім. Так, у XIV—XV стст. на беларускіх землях распаўсюджваецца готыка. Для гэтага стылю характэрны востраканцовыя вежы, вузкія вокны, стральчатыя аркі. У культавай архітэктуры ВКЛ часцей прасочваецца спалучэнне гатычных і раманскіх прынцыпаў (стральчатыя вокны і масіўныя сцены, магутныя вежы, просты скульптурны дэкор).

У 1380-я гг. у Гродне на Рыначнай плошчы быў узведзены Марыінскі касцёл, больш вядомы як Фара Вітаўта. Храм уяўляў сабой буйную трохнефавую базіліку. На галоўным фасадзе яна мела вялікую чатырох’ярусную вежу-званіцу.

Трохнефавы касцёл без веж у в. Ішкалдзь (Баранавіцкі раён) быў пабудаваны ў 1470-я гг. Яго вузкія бакавыя нефы больш нагадвалі абходную галерэю. Галоўны фасад храма завяршаўся завостраным шчытом з плоскімі нішамі. Сцены былі ўмацаваны контрфорсамі, якія на бакавых фасадах чаргаваліся са стральчатымі вокнамі.

Аналагічнае кампазіцыйнае рашэнне меў спачатку і пабудаваны ў першай палове XV ст. касцёл у в. Уселюб пад Навагрудкам. Потым гэты храм быў істотна перабудаваны. Да квадратнай малітоўнай залы дадаліся апсіда (прамавугольны выступ у сцяне) і трох’ярусная вежа-званіца.

У пачатку XVI ст. мураваны касцёл быў узведзены ў Гнезна (цяпер вёска ў Ваўкавыскім раёне). У цэнтры яго галоўнага фасада знаходзілася васьміграннная чатырох’ярусная вежа вышынёй 31 м. Памеры храма былі невялікімі — 21,5 × 13,7 м, а таўшчыня сцен складала каля 1 м. Храм меў контрфорсы, стральчатыя аконныя праёмы і акно-ружу над галоўным уваходам.

Пастаянныя знешнія пагрозы паўплывалі на з’яўленне ў Беларусі цэркваў-крэпасцей. Да нашага часу такі храм амаль у нязменным выглядзе захаваўся ў в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна. Ён уключаны ў каталог помнікаў сусветнай архітэктуры. Пабудаваная з цэглы ў пачатку XVI ст. царква вылучаецца манументальнасцю і адносіцца да тыпу трохнефавых базілік з трыма апсідамі. Памеры храма — 17,5 × 13 м, таўшчыня сцен — 1,5 м. Ён меў высока размешчаныя стральчатыя вокны, па вуглах былі ўзведзены чатыры абарончыя вежы, у якіх знаходзіліся байніцы дальняга і бліжняга бою. Фасады храма ўпрыгожвалі нішы.

Яшчэ адна царква-крэпасць была пабудавана ў 1516—1542 гг. каля в. Мураванка (цяпер Шчучынскі раён). Яе памеры складалі 21,7 × 14,8 м, а таўшчыня сцен дасягала 2 м. Гэта была трохнефавая базіліка з адной буйной апсідай. Цэнтр галоўнага фасада ўпрыгожвае гатычнае акно-ружа. Усе чатыры абарончыя вежы храма мелі цыліндрычную форму.

Такім чынам, адметнай рысай айчыннай архітэктуры стала змяшэнне розных архітэктурна-мастацкіх стыляў.

***Цікавыя звесткі.*** Касцёл у в. Ішкалдзь, як і многія культавыя збудаванні Беларусі, за час свайго існавання належаў розным канфесіям. Так, у 1515 г. пры князю Мікалаі Радзівіле Чорным ён быў перабудаваны ў кальвініскі збор. У XVII ст. храм ізноў вярнулі каталікам. У XIX і XX стст. там была Свята-Троіцкая царква. У 70-х гг. XX ст. Троіцкі касцёл быў рэканструяваны і вернуты каталіцкім вернікам.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Расшыфруйце словы і вызначыце, пра які архітэктурны стыль пойдзе гаворка на занятках.

**Т Ы Г А Н Ы Ч**

**Заданне 2.** Запоўніце табліцу «Гатычныя храмы на тэрыторыі Беларусі». Даведайцеся, дзе яны былі пабудаваны і ці захаваліся да нашага часу. Пры запаўненні табліцы карыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі.

*Табліца 1*

**Гатычныя храмы на тэрыторыі Беларусі**

| Назва храма | Месца знаходжання | Статус |
|---|---|---|
| Троіцкі касцёл, XV ст. | | |
| Фара Вітаўта, XIV ст. | | |
| Касцёл Св. Яна Хрысціцеля (Св. Казіміра), XV ст. | | |
| Царква Св. Архангела Міхаіла, 1320—1407 гг. | | |
| Царква Раства Багародзіцы, пабудаваная паміж 1516 і 1542 гг. | | |

**Заданне 3.** Вучні ствараюць інтэрактыўную карту Беларусі пры дапамозе Google-формы. Адзначаюць на ёй населеныя пункты, на тэрыторыі якіх знаходзяцца вядомыя гатычныя храмы: Ішкалдзь, Сынкавічы, Зэльву, Гнезна, Мураванку. Прымацоўваюць каля геаграфічнай назвы выяву адпаведнага будынка.

**Алгарытм стварэння інтэрактыўнай карты**

1. Адкрыйце Google на камп'ютары.
2. Увайдзіце ў меню, выберыце «Мае карты».
3. Націсніце кнопку «Стварыць новую карту».
4. У левым верхнім вугле націсніце кнопку «Карта без назвы».
5. Увядзіце назву і апісанне карты.

**Заданне 4.** З прапанаваных выяў храмаў вучням неабходна адабраць каталіцкія і праваслаўныя.




*Мал. 21.* Храмавае дойлідства Беларусі

**Заданне 5.** Вучням прапануецца намаляваць праваслаўны або каталіцкі храм, а таксама прыняць удзел у выставе малюнкаў «Гатычныя храмы Беларусі».

**Заданне 6.** *I варыянт.* З дапамогай інтэрнэт-рэсурсаў вучні выбіраюць выяву гатычнага храма, які найбольш падабаецца, робяць з яе пазл. Прапануюць сваім аднакласнікам сабраць пазл, назваць храм, дату яго заснавання, месца знаходжання.

*II варыянт.* З дапамогай QR-кода (глядзі «Метадычныя рэкамендацыі») вучні пераходзяць да анлайн-рэсурсу «Пазлы». Ствараюць анлайн-пазлы гатычных храмаў. Спаборнічаюць у тым, хто хутчэй збярэ пазлы, правільна назаве храм, дату яго пабудовы і месца знаходжання.

## *Тэма 21*
## *Беларускі народны касцюм*

### Метадычныя рэкамендацыі

Заняткі пачынаюцца з выканання задання 1. Педагог карыстаецца інфармацыяй рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Заданні 2, 3 вучні выконваюць да пачатку расказу пра мужчынскія кашулі. Педагог апавядае пра мужчынскі касцюм. Затым вучні выконваюць заданні 4—8, слухаюць звесткі пра жаночы касцюм і пераходзяць да заданняў 9, 11. Падчас расказу пра колеравую гаму адзення вучням прапануецца выканаць заданне 10. Пасля знаёмства з матэрыялам пра галаўныя ўборы і абутак дзеці працуюць над заданнямі 12, 13. Далей пераходзяць да заданняў 14, 15. Педагог дапаўняе адказы вучняў пра аксесуары. Творчае заданне 16 вучням прапануецца выканаць дома. Таксама на занятку можна падрыхтаваць эскізы, выкарыстоўваючы наступныя шаблоны.



*Мал. 22.* Каліта, шаблон



*Мал. 23.* Чаравікі, шаблон

## Матэрыялы да заняткаў

Адзенне з’яўляецца важным этнічным і сацыяльным паказчыкам, выконвае не толькі практычныя, але этнакультурныя і эстэтычныя функцыі: адлюстроўвае дух эпохі, стыль і моду, фізічны стан чалавека, яго ўзрост, сямейнае становішча. Касцюм дэманструе сацыяльную і прафесійную прыналежнасць яго ўладальніка. Слова «касцюм» было запазычана з французскай мовы і перакладалася як «звычай, традыцыя, манера». З гісторыі вядома, што людзі ў выбары адзення не заўсёды кіраваліся паняццямі камфорту і зручнасці. Так, напрыклад, вельмі доўгай і непрактычнай у эпоху Сярэднявякоўя была жаночая вопратка.

Зрэшты касцюм вышэйшага саслоўя меў агульнаеўрапейскія рысы. Ён прыметна адрозніваўся ад адзення сялян, мяшчан і дробнай шляхты.

У шырокім сэнсе адзенне — гэта яшчэ галаўныя ўборы, абутак, упрыгажэнні. Яно падзяляецца на мужчынскае і жаночае, летняе і зімняе, штодзённае і святочнае. Колеравая гама адзення несла ідэйную функцыю: белы колер лічыўся сімвалам чысціні, чырвоны — жыцця. Матэрыялам для адзення служыла мясцовая сыравіна: лён, пянька, воўна,

аўчына, футра, скура і інш. У якасці фарбавальнікаў выкарыстоўвалі настоі кветак і траў, лісце, кару, балотную руду, гліну. Колеравую гаму народнага адзення складалі чырвоная, сіняя, чорная, бурая фарбы.

Самы старажытны і ўстойлівы элемент у традыцыйным народным касцюме — кашуля. Яна мела тунікападобны крой, доўгія рукавы і прамы разрэз каўняра. Кашулю насілі з поясам — падпяразваліся ім на таліі або ніжэй. Штаны з вузкімі калашынамі шылі з грубага палатна.

Важным элементам беларускага строя былі паясы, якія выдзяляліся вялікай разнастайнасцю, адрозніваліся памерам, спосабам вырабу. Па спосабах вырабу яны падзяляліся на скураныя і плеценыя. Шырыня апошніх складала 3—7 см, даўжыня дасягала да 2—3 м.

Да шляхецкага адзення адносяцца капот, жупан, кунтуш, дэлія. Капот — прыталены кафтан на гузіках — шылі з тонкага шэрага сукна. Жупан — доўгі, крыху прыталены кафтан са стаячым каўняром — звычайна быў са светлага або шэрага сукна, радзей — з атласу і аксаміту. Ён падпяразваўся поясам. Паверх жупана насілася доўгая цёмная накідка — кунтуш, які зашпільваўся ўверсе па каўняры. Кунтуш меў доўгія разразныя рукавы, каб яго ўладальніку было зручна валодаць шабляй. Дэлія па сваіх функцыях адпавядала футру, пакрытаму дарагімі тканінамі. Яна мела свабодны крой, кароткія шырокія рукавы.

Сярод хатняга і вулічнага кароткага адзення насельніцтва ВКЛ можна вылучыць жупіцы, казыянкі, кабаты, сукенкі, камізэлі. Усё гэта разнавіднасці кароткага лёгкага кафтана, які шыўся з рукавамі або без іх.

У адзенні шляхты самымі папулярнымі колерамі былі чырвоны, сіні, зялёны. З XIII ст. у якасці вопраткі шляхціцы выбіралі охабень — кафтан з доўгімі рукавамі, засцежкай на фібулу або завязкай. Яго доўгія рукавы закідваліся за плечы.

Штодзённыя охабні шыліся з сукна, воўны, святочныя — з парчы, аксаміту, шоўку.

Вопраткай вялікага князя і яго прыдворных былі кабат, плашч, плашч-мантыя. Яны шыліся з дарагой тканіны, падбіваліся футрам, мелі вялікі футравы каўнер і гузікі з каштоўных камянёў і металаў. Сімвалам улады вялікага князя была вялікакняжацкая мітра (карона ў караля).

Жаночая кашуля мела просты свабодны крой. Яе шылі з кужалю (тонкага льнянога палатна). Прамы разрэз каўняра замацоўваўся завязкамі або фібуламі. Крой кашулі, яе даўжыня павінны былі пасаваць да астатніх кампанентаў жаночага касцюма. Спадніца лічылася элементам штодзённага адзення, шылася з ільняной аднатоннай тканіны. Каўнер быў самастойнай накладной дэталлю. У жаночым гардэробе часцей сустракалася вопратка з футра.

Да XIII ст. для ўпрыгажэння жаночага адзення выкарыстоўвалі металічныя пласціны, дрот, спіралькі. Потым яго крой змяніўся на больш складаны.

Шляхта і мяшчане ВКЛ насілі шапку конусападобнай формы — шлык. Былі распаўсюджаны галаўныя ўборы з футра або сукна — каўпакі, каптуры. Жанчыны рознымі спосабамі абкручвалі галаву адрэзам тканіны. Для большага аб'ёму пад такія наміткі часта падкладалі капялюшык, каптур, укладвалі косы.

Важную частку касцюма складаў абутак. Сярод гараджан шырока ўжываліся розныя віды скуранога абутку: чаравікі, боты, пасталы. Чаравікі мелі доўгі нос, які набіваўся конскім воласам або мохам. Яны часта ўпрыгожваліся ромбападобнымі і кветкавымі малюнкамі, каштоўнымі камянямі і жэмчугам, арнаментам з каляровых шарсцяных нітак. Пасталы былі найбольш распаўсюджаным відам абутку.

Разнастайныя аксесуары (пальчаткі, сумкі, фурнітура, шпількі, паясы, ювелірныя вырабы) дадаткова ўпрыгожвалі сярэдневяковы касцюм. Жанчыны насілі завушніцы, пацер-

кі (шкляныя, янтарныя, каралавыя), брошкі, бранзалеты, пярсцёнкі. У шляхецкім саслоўі былі распаўсюджаны ўпрыгажэнні з золата, серабра, жэмчугу, рубінаў і іншых каштоўных матэрыялаў.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні расшыфроўваюць тэму заняткаў. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць на адпаведныя літары беларускага алфавіта.

**12 1 19 25 31 14**

**Заданне 2.** Вучні адгадваюць, пра які прадмет адзення ідзе гаворка.

У ёй уваход адзін,
Затое тры выхады.
Каўнерык жорсткі,
І на шэраг гузікаў зашпілена.

**Заданне 3.** Вучні разважаюць над тым, што з'яўляецца самым старажытным прадметам мужчынскага адзення беларусаў.

**Заданне 4.** З дапамогай матэрыялу хрэстаматыі «Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.» (с. 77—79) дзеці складаюць расказ пра стварэнне і выкарыстанне ў штодзённым жыцці кашуль (сарочак).

**Заданне 5.** Вучням прапануецца ахарактарызаваць мужчынскі касцюм, апісаць тыпы кашуль, матэрыял, з якога іх шылі. Падумаць, які элемент мужчынскага адзення абавязкова выкарыстоўваўся разам з кашуляй.

**Заданне 6.** Вучні разважаюць над тым, што адлюстроўваў мужчынскі касцюм; што ўвасабляў сабой строй вялікіх князёў; што з элементаў княжацкага адзення можна аднесці да сістэмы сімвалаў.

**Заданне 7.** Вучні высвятляюць, з якога футра шылася дэлія.

**Заданне 8.** Дзеці вызначаюць, якога колеру было адзенне сялян.

**Заданне 9.** Вучні разважаюць і адказваюць на пытанне. Пры выкананні задання карыстаюцца дадатковымі крыніцамі інфармацыі.

Вядома, што да XIII ст. адзенне дэкарыравалі металічнымі нашыўкамі. Як змяніўся яго дэкор у наступных стагоддзях? Назавіце два вядомыя спосабы вышыўкі.

**Заданне 10.** З дапамогай схемы «Колеры адзення шляхты ВКЛ» вучні вызначаюць, што сімвалізаваў кожны колер.

- чырвоны — сімвал агню, веры і Боскага полымя, пакуты і ўлады, прэстыжу, мужнасці;
- белы — колер манарха, Боскага святла;
- зялёны — сімвал юнацтва, жыцця і надзеі, прыроды;
- залаты — колер манарха, сімвал Боскай энергіі, чысціні, багацця, сілы, адданасці;
- пурпурны — колер манарха;
- чорны — колер сціпласці, адукаванасці, смутку, гора, небыцця;
- жоўты — колер сонца;
- блакітны — сімвал раю і нябёс.

*Схема 1.* Колеры адзення шляхты ВКЛ

**Заданне 11.** Дзецям прапануецца назваць адну з найбольш важных дэталей жаночага касцюма, адказаць, якую функцыю выконваў пояс.

**Заданне 12.** Вучні разважаюць над пытаннямі: «Як успрымалі чалавека, які знаходзіўся на вуліцы без галаўнога ўбору?», «У якіх выпадках здымалася шапка?».

**Заданне 13.** Вучням прапануецца падумаць, які від абутку прадстаўлены на ілюстрацыі (мал. 24), сярод якой катэгорыі насельніцтва ВКЛ ён быў распаўсюджаны, які матэрыял выкарыстоўваўся для яго вырабу. Потым яны апісваюць, як выглядалі чаравікі.



*Мал. 24.* Від абутку, Мінск, XV ст.

**Заданне 14.** Вучні вызначаюць, якая рэч паказана на ілюстрацыі (мал. 25) і як яна дапасоўвалася да касцюма жыхароў ВКЛ.



*Мал. 25.* Від аксесуара жыхароў ВКЛ

**Заданне 15.** Вучні разважаюць і адказваюць на пытанні.

- Як вы лічыце, што паказана на ілюстрацыі (мал. 26)? Вызначыце прызначэнне гэтай рэчы.
- Як яна дапасоўвалася да касцюма жыхароў ВКЛ?
- Якія яшчэ аксесуары служылі ўпрыгажэннямі касцюмаў жыхароў беларускіх зямель?



*Мал. 26.* Від аксесуара жыхароў ВКЛ

**Заданне 16.** Вучням прапануецца падрыхтаваць малюнак (эскіз) асобных элементаў жаночага або мужчынскага строя часоў ВКЛ (пояса, каліты, кашулі, чаравікаў, пярсцёнкаў, бранзалетаў) для конкурсу «Аксесуары і адзенне часоў Сярэдневякоўя і Ранняга Новага часу».

**Правілы ўдзелу ў конкурсе**

1. У конкурсе ўдзельнічаюць эскізы адзення, абутку, галаўных убораў, аксесуараў.

2. На конкурс падаюцца афармленыя малюнкі (на ватмане, палатне або любой цвёрдай аснове, з магчымасцю падвесіць іх на вертыкальныя пано-кручкі, пяцелькі, люверсы). Стацыянарныя аб'ёмныя кампазіцыі і аб'екты павінны мець падстаўкі.
3. Конкурсныя работы ацэньваюцца па крытэрыях цэласнасці, эстэтычнай каштоўнасці, адпаведнасці гістарычнай эпосе.

## *Тэма 22*
## *Геральдыка беларускіх гарадоў*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням выканаць заданне 1, з дапамогай якога будзе вызначана тэма заняткаў. Затым працуе са зместам рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Пасля расказу пра герб г. Віцебска дае выканаць заданне 3. Вучні, калі даведаюцца пра гісторыю ўзнікнення гербоў Нясвіжа і Слоніма, пераходзяць да задання 6. Затым выконваюць заданні 2, 4. Педагог расказвае пра дзве вялікія групы гербоў, выкарыстоўваючы ілюстрацыі. Потым вучням прапануецца разгадаць галаваломку (№ 5) і адгадаць загадку (№ 7).

Працаваць над заданнем 8 вучні могуць у малых групах (па 4 чалавекі) у кабінеце інфарматыкі пасля заняткаў або дома.

**Інструкцыя па выкананні творчага задання**

1. Перайдзіце па QR-кодзе на спецыяльны сайт.
2. Выберыце дызайнерскі шаблон у бібліятэцы.
3. Загрузіце ілюстрацыі з камп'ютара.
4. Работа з ілюстрацыямі ў рэдактары.
5. Вызначыце колеравую гаму.
6. Захавайце эмблему або націсніце кнопку «Падзяліцца».

## Матэрыялы да заняткаў

Свет чалавека — гэта адначасова і свет сімвалаў. Сімвал уяўляе сабой мастацкае ўвасабленне той або іншай ідэі. Такое азначэнне можна даць і гербам — сапраўдным творам мастацтва. У перыяд Сярэдневякоўя з'явіліся герольды (вяшчальнікі, цырымоніймайстры) — людзі, якія разбіраліся да тонкасцей у гэтых сімвалах, вызначалі, у каго ёсць права на іх. Як знаўцаў ваенных звычаяў і традыцый, герольдаў запрашалі на рыцарскія турніры ў якасці ганаровых гасцей. Яны сачылі за правіламі іх правядзення, а таксама за выкарыстаннем гербоў. Герольда можна было пазнаць па адзежы — далматыцы, упрыгожанай гербам гаспадара.

Герольды старанна збіралі гербы ў зборнікі — гербавыя слупкі (скруткі), гербоўнікі. Звычайна яны складаліся з малюнкаў, але сустракаюцца гербоўнікі без ілюстрацый — у іх ёсць толькі падрабязнае слоўнае апісанне гербоў.

Да XIV ст. ужо вылучалася асобная навука пра гербы і гербавае мастацтва — геральдыка (ад лацінскага *heraldus* — вяшчальнік). Гісторыя гербаў на Беларусі пачынаецца прыкладна з XIV–XV стст.

Першым вядомым дзяржаўным актам аб замацаванні за беларускім горадам афіцыйнага герба стаў Прывілей 1451 г. Князь літоўскі і кароль польскі Казімір IV Ягелончык падарыў гэта права г. Полацку. Акрамя саміх манархаў, прысвойваць гербы маглі іх жонкі. Так, дзякуючы ўдаве Стэфана Баторыя Ганне Ягелонцы ў канцы XVI ст. адметны знак з'явіўся ў г. Пружаны.

У Беларусі вельмі даўно існуе гарадская геральдыка. Хоць шмат яе помнікаў незваротна страчана, ёсць яскравыя прыклады адраджэння геральдычных сімвалаў. Так, напрыклад, быў адноўлены старажытны герб г. Віцебска: на блакітным полі іспанскага шчыта — выява Збавіцеля ў профіль, пад ім — голы барвовы меч, у якасці шчытатрымальнікаў — анёлы. Гэтым сімвалам надорваў горад Прывілей вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта III Вазы ад 17 сакавіка 1597 г.

Каралеўскі прыклад прысвойваць гербы гарадам перанялі магнацкія роды. У 1586 г. палова чорнага радзівілаўскага арла стала сімвалам г. Нясвіжа. А з 1652 г. ствараецца цэлая серыя гербоў з элементамі радавой геральдыкі Радзівілаў. Так, г. Капыль «набыў» радзівілаўскі паляўнічы ражок, г. Клецк — такі ж ражок і княжацкую карону, г. Слуцк — княжацкую карону з манаграмай «Князь Радзівіл». У 1591 г. герб-аўтограф ад вялікага канцлера літоўскага Льва Сапегі атрымаў г. Слонім. Гэта быў залаты геральдычны леў — сімвалічнае адлюстраванне ўласнага імя дзеяча.

Па змесце гарадскія гербы можна падзяліць на дзве вялікія групы: функцыянальныя і штучныя. Функцыянальныя гербы акцэнтуюць увагу на адметным геаграфічным становішчы горада, яго эканамічным, гандлёвым, ваенным патэнцыяле. Напрыклад, большасць прыгранічных населеных пунктаў у якасці сімвалаў выкарыстоўваюць выявы зброі. Гэта гарады Брэст, Пінск, Мсціслаў, Крычаў, Віцебск і інш. Да групы гербоў з абарончай сімволікай адносяцца адлюстраванні веж, муроў, брам (Магілёў, Камянец, Барысаў і інш.).

Гандлёва-гаспадарчыя матывы прасочваюцца ў гербах гарадоў Полацк, Дзісна, Шклоў, Гродна. Першыя тры змяшчаюць выявы трохмачтавага карабля з парусамі, ладдзі, бязмена і падкрэсліваюць ролю гарадоў у эканоміцы ўсёй дзяржавы. Апошні прадстаўляе вобраз бягучага аленя з залатым крыжам паміж рагамі і з'яўляецца водгаласам паляўнічай сімволікі.

Другая група гарадскіх гербоў — штучных — складаецца з выявы якога-небудзь святога, заступніка горада. Таксама гэта можа быць апазнавальны знак (яго частка) гаспадара горада.

Інстытут гарадскога герба на Беларусі пачынае фарміравацца з набыццём гарадамі права на самакіраванне, атрыманнем неабходнага атрыбута ўлады — гарадской пячаткі і герба на яе.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні расшыфроўваюць ключавыя словы тэмы заняткаў. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць на адпаведныя літары беларускага алфавіта.

**4 6 18 2**
**Г 6 18 15 13 29 Д**
**Г 6 18 1 13 29 5 28 12 А**

**Заданне 2.** Вучням прапануецца разгледзець выявы злiткаў золата і серабра і адказаць на пытанні: «Як вы лічыце, якія колеры ў геральдыцы называюцца “золатам” і “серабром”?», «Як па-іншаму ў геральдыцы называюць жоўты і белы колеры?».

**Заданне 3.** Вучні разглядваюць гербы наступных беларускіх гарадоў: Мінска, Віцебска, Кобрына, Барысава, Узды, Навагрудка і адказваюць, чые вобразы адлюстраваны на гербах і што яны сімвалізуюць.

**Заданне 4.** З дапамогай схемы «Сімволіка герба» дзецям прапануецца даведацца пра значэнні колераў, папулярных у геральдыцы.

- чырвоны — адвага, мужнасць, каханне;
- зялёны — надзея, багацце, свабода, радасць;
- жоўты — велікадушнасць, сумленнасць, вернасць;
- пурпурны — набожнасць, умеранасць, шчодрасць, вярхоўнае панаванне;
- чорны — мудрасць, асцярожнасць, смутак, жалоба;
- залаты — сіла, багацце;
- сярэбраны — нявіннасць, чысціня.

Схема 2. Сімволіка герба

**Заданне 5.** Галаваломка. Вядома, што найбольш старажытнымі геральдычнымі сюжэтамі лічацца выявы жывёл, а не людзей. Каб даведацца, выявы якіх жывёл папалі на гербы беларускіх гарадоў, трэба скласці ўсе літары спачатку ў верхняй частцы кружкоў, а потым у ніжняй.




*Мал. 27.* Галаваломка

**Заданне 6.** Настаўнік расказвае, што геральдычныя выявы арла і льва маюць манархаў статус. Пытаецца: «Як вы лічыце, за якія якасці чалавек асацыіраваўся з гэтымі істотамі?»

**Заданне 7.** Педагог нагадвае, што на гербе г. Пружаны адлюстравана рэптылія. Прапануе вучням адгадаць загадку і вызначыць, пра якую рэптылію ідзе гаворка.

Чорны шнурок
Па траўцы паўзе.
Два жоўтыя ліхтарыкі
Гарацт на галаве.

**Заданне 8.** З дапамогай QR-кода (глядзі «Метадычныя рэкамендацыі») вучні пераходзяць на анлайн-рэсурс «Стварыць эмблему або герб», тэзісна запісваюць у сшытку правілы геральдыкі. Заданне «стварыць герб горада» дзеці выконваюць калектыўна ў малых групах.

**Заданне 9.** Творчая работа. Вучням прапануецца стварыць лэпбук «Геральдычная спадчына».

Лэпбук павінен змяшчаць наступныя раздзелы (рубрыкі):

- паходжанне гербаў;
- формы геральдычнага шчыта;
- геральдычныя мастацкія асаблівасці;
- геральдычныя сімвалы (геаметрычныя фігуры);
- негеральдычныя фігуры;
- гербавы дэвіз.

*Тэма 23*

# *Беларускае народнае дойлідства як адлюстраванне духоўнага свету беларусаў*

## Метадычныя рэкамендацыі

Спачатку педагог прапануе вучням выканаць заданне 1. Затым расказвае пра асаблівасці народнага дойлідства. Вучні працуюць над заданнем 4. Педагог з дапамогай рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў» знаёміць іх з драўлянай архітэктурай беларускіх зямель. Дзеці пераходзяць да задання 3. Пасля таго як педагог раскажа пра хатняе ўбранне, вучні выконваюць заданне 5. Настаўнік загадзя рыхтуе ілюстрацыі інтэр’ераў жылых будынкаў, дзеліць вучняў на тры групы. Затым дзеці спрабуюць выканаць заданне 2, педагог расказвае пра гродзенскі лямус.

Заданне 6 выконваецца калектыўна ў малых групах (пасля заняткаў або на канікулах). *Матэрыялы:* кардон або тоўстая каляровая папера, нажніцы, клей ПВА, шаблон для выразання.

## Матэрыялы да заняткаў

Народнае дойлідства — паняцце, якое ўмоўна аб’ядноўвае ў сабе дзве формы архітэктурнай творчасці: традыцыйную і

самаробную (непрафесійную). Традыцыйнай для беларускіх зямель з’яўляецца драўляная архітэктура.

У эпоху Сярэдневякоўя апрацоўка драўніны займала вядучае месца сярод рамёстваў. Драўніна была ўніверсальным і шырокараспаўсюджаным матэрыялам. З яе выраблялі бандарны і сталовы посуд, дэталі простых механізмаў, транспартныя сродкі. У працы з драўнінай майстры ўжывалі разьбярства, дзяўбанне, такарную апрацоўку, трохгранна-выемчатае выразанне, прапілоўку. Разьбой упрыгожваліся будынкі, мэбля і посуд.

Жыллё тагачасных беларусаў таксама прадстаўляе інтарэс для даследчыкаў матэрыяльнай культуры. Асноўным тыпам беларускага жытла былі невялікія зрубавыя аднакамерныя будынкі з печчу без коміна. З развіццём таварна-грашовых адносін з’явіліся двух- і трохкамерныя дамы з сенцамі і гаспадарчай каморай. Традыцыйна ўваход у жыллё размяшчаўся з поўдня. Вокны рубіліся толькі ў дзвюх сценах. У куце каля дзвярэй знаходзілася печ, па дыяганалі ад яе — покуць з абразамі. Суседні з ёй кут лічыўся гаспадарчым: там у вольны час займаліся рамёствамі. Кут насупраць печы, дзе гатавалася ежа, называўся «бабіным». Падлога ў хаце звычайна была глінабітнай і толькі ў нізінных балоцістых месцах — з дошак.

Хатняе ўбранне складалася з мэблі прысценнага тыпу. У жылой частцы дома звычайна было дзве лавы — плоскія дошкі на ножках або калодах. Лавы ставілі ўздоўж сцен, перад імі — стол, над якім згодна са старадаўняй традыцыяй вешаўся саламяны павук. Мелася ў хаце пераносная лаўка — услон. Яго рабілі з расколатага ствала дрэва, сукі-ножкі роўна падпілоўвалі. Паменшаны варыянт услона — табурэт-зэдлік на трох ножках. У жытле тагачасных беларусаў абавязкова прадугледжваліся палаткі, увесь скарб захоўваўся ў куфрах. Да столі падвешвалі дзіцячую калыску, якую плялі з лазы. Пазней калыскі рабілі з дрэва і ўстанаўлівалі на дугападобныя калодкі. Над імі прымацоўвалі драўляную птушку.

Самыя багатыя дамы знойдзены падчас раскопак у Навагрудку. Яны былі драўляна-глінабітныя, вялікія, двухкамерныя, плошчай 70—75 кв. м і нават 120 кв. м. Вокны мелі акруглыя шкляныя шыбы дыяметрам 20—22 см. Падчас будаўніцтва дамоў, акрамя дрэва, выкарыстоўвалі вапняк і цэглу. У кутах будынкаў або каля сцен стаялі печы.

У сучаснай Беларусі захавалася вельмі мала драўляных будынкаў, якія маглі б даць уяўленне пра ўзровень дойлідства ў ВКЛ эпохі Позняга сярэдневякоўя. Унікальны помнік драўлянай архітэктуры — знакаміты гродзенскі лямус (XVII ст.) Брыгіцкага манастыра, у якім жылі манашкі. Двухпавярховы будынак складзены з масіўных бярвён, галоўны фасад упрыгожвае двух'ярусная арачная галерэя.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні расшыфроўваюць тэму заняткаў. Для гэтага лічбы ў шыфроўцы замяняюць адпаведнымі літарамі беларускага алфавіта.

**Д 16 11 13 10 5 19 20 3 а**

**Заданне 2.** З дапамогай ілюстрацыі вучні вызначаюць прызначэнне будынка, з якога матэрыялу ён зроблены. Апісваюць знешні выгляд будынка.



*Мал. 28.* Драўляны лямус, XVII ст., г. Гродна

**Заданне 3.** Вучням прапануецца паразважаць, чаму ў жылой забудове гарадоў ВКЛ паступова перасталі выкарыстоўваць драўніну.

**Заданне 4.** Дзеці тлумачаць сэнс прыказак У. І. Даля: «Без сякеры — не цясляр, без іголкі — не кравец», «З сякерай увесь свет пройдзеш», «Сякера ўсяму галава».

**Заданне 5.** Вучням прапануецца разгледзець ілюстрацыі. Вызначыць, якога хатняга ўбрання на іх не хапае. Дзеці могуць прыдумаць уласны інтэр'ер жылля і адлюстраваць свае ўяўленні ў малюнках.



*Мал. 29.* Унутраны выгляд жылля

**Заданне 6.** Вучням прапануецца зрабіць з паперы (кардону) макет беларускага жылля эпохі Сярэдневякоўя і прыняць удзел у выстаўцы.

# Абагульняючыя заняткі

*Тэма 24*

## *Захаванне гістарычнай памяці аб асобах і падзеях беларускай мінуўшчыны*

### Метадычныя рэкамендацыі

Педагог прапануе вучням выканаць заданне 1. Затым дзеліцца інфармацыяй рубрыкі «Матэрыялы да заняткаў». Вучні працуюць над заданнямі 2, 3, 4, 7. Заданні 5, 6 выконваюцца пасля заняткаў. Дзеці дзеляцца на 2 групы і выбіраюць праект. Да выканання задання 6 трэба прыцягнуць вучняў з мастацкімі здольнасцямі.

### Матэрыялы да заняткаў

Устанаўленне помнікаў на плошчах і вуліцах гарадоў сучаснай Беларусі — праяўленне гістарычнай памяці народа. Памятныя аб'екты ствараюцца ў гонар сапраўдных нацыянальных герояў, адлюстроўваюць знакавыя для краіны падзеі. Акрамя таго, у нашай рэспубліцы рэалізуецца дзяржаўная праграма «Замкі Беларусі», спецыяльна распрацаваная для стварэння ўмоў па захаванні, аднаўленні і рацыянальным выкарыстанні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця ўнутранага і ўязнога турызму. У рамках дзяржпраграмы прадугледжана правядзенне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на тэрыторыі 38 замкаў краіны (на тэрыторыі Беларусі

налічвалася каля сотні замкаў, а захавалася толькі некалькі дзясяткаў).

Па праектах беларускіх скульптараў створаны шэраг помнікаў гістарычным асобам і дзеячам культуры: Рагнедзе і Ізяславу (г. Заслаўе); Еўфрасінні Полацкай, Сімяону Полацкаму і Усяславу Чарадзею (г. Полацк); Кірыле Тураўскаму (г. Тураў і г. Гомель); Давыду Гарадзенскаму (г. Давыд-Гарадок); Анастасіі Слуцкай (г. Слуцк); Альгерду (г. Віцебск); Вітаўту (г. Гродна і в. Пеляса ў Воранаўскім раёне на Гродзеншчыне).

Скульптуры знакамітых асветнікаў Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, аўтара паэмы «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага і іншых упрыгожылі ўнутраны дворык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Прыёмы і формы пазнавальнай, творчай і праектнай дзейнасці вучняў**

**Заданне 1.** Вучні разгадваюць загадкі і вызначаюць тэму заняткаў.

Стварае розныя скульптуры.
Калі ад каменю адсякае, —
бязлікі граніт ажывае.

Непрыступна, адзінока
На скале высокай, стромкай
Змрочнай грудаю на выгляд
Ён ля возера стаіць.
Скрозь байніцы старадаўнія
Ў азёрную роўнядзь глядзіць.

**Заданне 2.** З дапамогай картак-характарыстык (глядзі прыклад) і ілюстрацый вучні знаёмяцца са звесткамі пра гістарычнае мінулае помніка архітэктуры: Навагрудскага замка (XI—XVI стст.), Старога замка ў г. Гродне (XI—XIX стст.), Свіслацкага замка, Барысаўскага замка (XII—XIV стст.), Лідскага замка, Мірскага замка, Крэўскага замка (XIV ст.), Гальшанскага замка (XVI—XX стст.), Быхаўскага замка (XVII ст.), Любчанскага замка (XVI—XIX стст.).

### *Прыклад карткі-характарыстыкі*

**Картка № 1.** *Лідскі замак.* Быў пабудаваны ў XIV ст. па даручэнні князя Гедыміна. Замак узвялі за 5 гадоў, каб перакрыць прасоўванне крыжакоў на цэнтральныя землі ВКЛ. Ён неаднаразова вытрымліваў крыжацкія напады, выкарыстоўваўся як магутнае абарончае збудаванне ў час пазнейшых ваенных падзей.

Замак мае сцены вышынёй 12 м і агульнай працягласцю 341 м, лічыцца адным з самых вялікіх у Беларусі. На яго тэрыторыі размяшчаліся царква, суд, астрог, архіў, жылыя будынкі. Варта адзначыць, што менавіта там пабраліся шлюбам 71-гадовы Ягайла і 17-гадовая Соф'я Гальшанская.

У 2005 г. у Лідзе прайшоў І Міжнародны рыцарскі турнір «Замак Гедыміна», у маі 2007 г. — бугуртныя баі «Меч Лідскага замка», у якіх удзельнічалі рыцарскія клубы Беларусі, Польшчы, Расіі, краін Балтыі.

**Заданне 3.** З дапамогай ілюстрацый вучні вызначаюць, да якой катэгорыі адносяцца замкі:

а) замкі, якія падлягаюць рэканструкцыі і далейшаму скарыстанню;

б) замкі, якія падлягаюць кансервацыі;

в) помнікі археалогіі, замчышчы, на якіх не захавалася ніякіх збудаванняў.



*Мал. 30.* Навагрудскі замак (рэшткі)



*Мал. 31.* Быхаўскі замак



*Мал. 32*. Стары замак у Гродне



*Мал. 33*. Гальшанскі замак



*Мал. 34*. Лідскі замак



*Мал. 35*. Крэўскі замак



*Мал. 36*. Любчанскі замак



*Мал. 37*. Свіслацкі замак (рэшткі)



*Мал. 38*. Барысаўскі замак (рэшткі)



*Мал. 39*. Мірскі замак

**Заданне 4.** З дапамогай картак-характарыстык (картка № 2) і ілюстрацый вучні прыводзяць звесткі пра помнікі гістарычным дзеячам, даюць ім характарыстыку па плане:

1. Каму з гістарычных дзеячаў устаноўлены помнік?
2. Пра што сведчыць помнік?
3. Вызначыце асобныя дэталі помніка. Як вы лічыце, што яны могуць сімвалізаваць?

Другі варыянт выканання задання — здымкі помнікаў і карткі-характарыстыкі раздаюцца вучням, якія працуюць у групах. Яны суадносяць выяву з прапанаванай характарыстыкай.

**Картка № 2.** Помнік *Давыду Гарадзенскаму* ў г. Гродне (2018 г.). Давыд Гарадзенскі (1283—1326 гг.) быў зяцем князя Гедыміна, абараняў землі ВКЛ ад крыжакоў. Вядомы як воін, які не прайграў ніводнай бітвы. Помнік стаіць на падыходзе да Старога і Новага замкаў на вуліцы Давыда Гарадзенскага. Князь сядзіць на кані, у левай руцэ трымае крыж Еўфрасінні Полацкай, у правай — меч. Унізе — выява гродзенскага замка часоў Вялікага Княства Літоўскага. Вышыня каменнага помніка больш за 3,5 метра. Яго аўтар — Сяргей Аганаў.



*Мал. 40.* Анастасія Слуцкая, г. Слуцк, 2016 г., С. Аганаў



*Мал. 41.* Вітаўт, в. Пеляса, 2010 г., дрэва, А. Сакалаўскас



*Мал. 42.* Усяслаў Чарадзей, г. Полацк, 2007 г., А. Прохараў, С. Ігнацьеў, Л. Мінкевіч



*Мал. 43.* Кірыла Тураўскі, г. Гомель, 2004 г., Леў і Мікалай Гумілеўскія




*Мал. 44.* Давыд Гарадзенскі, г. Гродна, 2018 г., С. Аганаў



*Мал. 45.* Альгерд, г. Віцебск, 2014 г., С. Бандарэнка



*Мал. 46.* Ізяслаў, г. Заслаўль, 2014 г., А. Прохараў

**Заданне 5.** *I варыянт.* Вучням прапануецца падрыхтаваць праект «Пазнай Беларусь», прымеркаваны да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін, які адзначаецца 18 красавіка. Падчас працы варта выкарыстоўваць мясцовы краязнаўчы матэрыял. Вынікі праекта могуць быць аформлены ў выглядзе даведніка або карты (інтэрактыўнай карты) аб’ектаў культурнай спадчыны і помнікаў архітэктуры.

Апісанне аб’екта павінна ўключаць наступныя звесткі:

- назва помніка;
- дата стварэння;
- уладальнікі (для замкаў і палацаў);
- аўтар (для помнікаў);
- вядомыя падзеі, звязаныя з гэтым месцам;
- легенды, звязаныя з гэтым месцам;
- сучасны выгляд (фотаздымак).

*II варыянт.* Творчая работа «Фэст экскурсаводаў». Вучні распрацоўваюць маршрут экскурсіі па памятных мясцінах сваёй малой радзімы.

**Заданне 6.** Удзельнікам факультатыўных заняткаў прапануецца распрацаваць план стварэння гісторыка-культурных аб’ектаў «Помнікі гістарычным дзеячам». Пры гэтым рэкамендуецца прадставіць наступную інфармацыю:

- імя дзеяча, у гонар якога ўстаноўлены помнік;
- месца, дзе помнік можа быць устаноўлены;
- заслугі дзеяча, вартыя ўвекавечання;
- эскіз помніка.

**Заданне 7.** Гульня «Вядомыя помнікі архітэктуры і скульптуры». На ліст паперы ўпярэмешку наклейваюцца ілюстрацыі помнікаў. Копіі гэтага ліста раздаюцца ўдзельнікам гульні, якія працуюць у групах. У абумоўлены час яны павінны разгледзець выявы, даць ім пісьмовую характарыстыку па плане:

1. Назва помніка.
2. Дата і месца яго стварэння.
3. Што адлюстроўвае помнік.

За поўныя і дакладныя адказы на тры пытанні залічаецца 1 бал. За адказ толькі на першае пытанне балы не залічаюцца, за адказы на першае і другое пытанні даецца 0,5 бала.

**Заданне 8.** Гульня-віктарына «Ці ведаеце вы гісторыка-культурную спадчыну свайго краю?». Удзельнічаюць 2 каманды. За кожны правільны адказ на 1-м этапе залічаецца 1 бал, на 2-м этапе — 2 балы, на 3-м этапе — 3 балы і г. д. Перамагае каманда, якая набярэ большую колькасць балаў.

## Ход гульні

*1-ы этап: «Народныя святы»*

- Гэта старажытнае свята было прымеркавана да дня зімовага сонцастаяння, потым яго сталі звязваць з Нараджэннем Ісуса Хрыста. Удзельнікі свята вадзілі казу, мядзведзя, насілі зорку.
- Падчас гэтага свята водзяць карагоды, скачуць праз вогнішча і шукаюць чароўную кветку шчасця.
- Гэта свята прысвечана сустрэчы вясны і провадам зімы. Другая яго назва — Сырны тыдзень. Абрадавымі стравамі былі масла, тварог, сыр, бліны без мяса. Таксама гэты тыдзень называўся мясапусным — пустым ад мяса.
- Як называецца дзень ушанавання памяці памерлых продкаў?
- Гэта свята нагадвае пра ўваскрэсенне Хрыста і з'яўляецца рухомым. Адзначаюць яго і праваслаўныя, і каталікі.
- Як называецца свята ў гонар святога Георгія Перамаганосца — заступніка свойскай жывёлы і сялянскай нівы?

*2-і этап: «Звычаі і традыцыі этнічных меншасцей»*

- Як называецца традыцыйны польскі суп на заквасцы з грыбамі або каўбасой?
- Любімы кісламалочны напітак татар з кабылінага малака.
- Як называецца свяшчэнны хлеб у яўрэяў?
- З татарскай мовы гэта слова перакладаецца як «чорны камень».
- Кнігі, напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом.
- Што азначае фразеалагізм «цыганскае сонца»?

*3-і этап: «Хто ёсць хто?»*

- Першая жанчына-манашка ў Старажытнай Русі.
- Вядомы прапаведнік XII ст., манах-пустэльнік, прылічаны да святых.

- Святая апякунка Беларусі, першая жанчына, кананізаваная Рускай праваслаўнай царквой.
- Майстар, які зрабіў каштоўны крыж па загадзе вядомай полацкай асветніцы.
- Дойлід другой паловы XIII ст., які пабудаваў вядомую на беларускіх землях абарончую вежу.
- Царкоўна-палітычны і літаратурны дзеяч, пісьменнік і мысліцель сярэдзіны XII ст. Як сцвярджае Іпацьеўскі летапіс, «быў кніжнік і філосаф, якіх у Рускай зямлі не бывала».

*4-ы этап: «Пазнай помнік»*

Вучням прапануюцца фатаграфіі (ілюстрацыі) помнікаў: Сафійскага сабора, Спаса-Праабражэнскай царквы, Барысаглебскай царквы, Камянецкай вежы, касцёла ў в. Ішкалдзь, царквы-крэпасці ў в. Сынкавічы і інш. Трэба назваць помнікі і прывесці кароткія звесткі пра іх. Для выканання задання можна выкарыстоўваць графічныя работы Паўла Татарнікава.

*5-ы этап: гульня «Так або не»*

Вучні павінны вызначыць правільныя і няправільныя сцвярджэнні.

- Біблія Францыска Скарыны — пяты па ліку надрукаваны пераклад Святога Пісання.
- Псалтыр — адзіная кніга, якую Францыск Скарына выдаў двойчы.
- Першая заснаваная на беларускіх землях епархія — Тураўская.
- Асноўная крыніца біяграфічных звестак пра Еўфрасінню Полацкую — твор «Прадслава», помнік старажытнай беларускай літаратуры.
- Галоўным матэрыялам для стварэння кніг, які выкарыстоўваўся на беларускіх землях да сярэдзіны XVI ст., быў пергамент.
- Самым старажытным помнікам беларускай рукапіснай кнігі з'яўляецца Аршанскае Евангелле.

# Ключы (адказы)

## Тэма 1

№ 6 Дуда, Радзівілы, Альгерд.

№ 7 1468 + 98 = 1566 г.

№ 8 Гуслі крылападобныя.

№ 9 Дударыкі.

## Тэма 2

№ 4 Крыж Еўфрасінні Полацкай, Камянецкая вежа, самшытавы грэбень, Сафійскі сабор, Спаса-Праабражэнская царква, Кірыла Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая, берасцяная грамата, Тураўскае Евангелле, Каложская царква.

№ 6 Царкоўная музыка, крукавы спеў, знак, від пісьма.

№ 7 Дуда, гуслі, варган, бубен, рог, жалейка.

## Тэма 3

№ 1 Летапіс, пергамент, эпіграфіка, агіяграфія, бяроста.

№ 3 Евангелле.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| У | Т | А | Р | П | Е |
| Р | А | А | Ш | О | А |
| С | Ў | Н | С | Л | К |
| К | А | Е | К | А | Ц |
| Д | Р | К | А | Е | К |
| Т | У | Ц | У | Л | С |

№ 4 Пячатка, графіці, эпіграфіка, помнік, сфрагістыка.

№ 5 Валун.

№ 6 Крыж.

**Тэма 4**

№ 1 Чалавек, прырода.

№ 2

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| К | А | Ц | Н | О | С |
| Я | М | Я | І | А | Р |
| Н | Е | С | А | Г | А |
| І | К | Э | Р | Ё | З |
| К | Р | Ы | Ц | Р | Ы |
| З | О | Н | І | Ц | А |

**Тэма 5**

№ 1 Гаспадарка.

№ 2 Жыта, ячмень, пшаніца, авёс, проса.

№ 3

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Б | Ж | Ы | Т | К | А | Я |
| Я | У | С | А | Т | В | Б |
| Г | Л | Р | С | І | Б | Р |
| І | Э | У | Ш | О | Ы | О |
| В | П | Б | П | Н | Б | С |
| С | Ы | А | Р | А | Я | О |
| Ц | Л | Ё | В | У | К | Р |
| А | С | І | Л | А | С | П |

№ 5 Так, не, так, не, так, не, так.

№ 6 Сом, шчупак, акунь, ёрш, ласось, карась, жэрах, галавень, плотка, судак.

## Тэма 7

**№ 1 Тапаніміка, тапонім.**

**№ 6**

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | **[5]Г** | | |
| | | | | | | | | | | **о** | | |
| | | | | | | | | | | **м** | | |
| | | | | | | | | | | **е** | | |
| | | | | | | **[1]М** | **[6]а** | **г** | **і** | **л** | **ё** | **ў** |
| | | | | | | **і** | | | | **ь** | | |
| | | **[2]Г** | **р** | **о** | **д** | **н** | **а** | | | | | |
| | | | **[3]Б** | **р** | **э** | **с** | **т** | | | | | |
| **[4]В** | **і** | **ц** | **е** | **б** | **с** | **к** | | | | | | |

**№ 8 Барсукі, Ганнаўка, Ігнатаўка.**

## Тэма 8

**№ 1**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| [1]**Х** | р | а | м | | | | | | | | |
| [2]Е | **Р** | а | с | ь | | | | | | | |
| [3]К | р | **Ы** | ж | о | в | ы | | | | | |
| [4]Х | р | ы | **С** | т | о | с | | | | | |
| [5]Т | р | о | й | **Ц** | ы | н | | | | | |
| [6]Х | е | р | у | в | **І** | м | | | | | |
| [7]Е | п | а | р | х | і | **Я** | | | | | |
| [8]Х | р | ы | ш | ч | э | н | **Н** | е | | | |
| [9]І | к | а | н | а | с | т | а | **С** | | | |
| [10]П | а | т | р | ы | я | р | х | а | **Т** | | |
| [11]А | д | с | т | у | п | н | і | ц | т | **В** | а |
| [12]П | р | а | в | а | д | а | ў | с | т | в | **А** |

№ 2 Тураўскі крыж.

№ 3 Хрысціянская вера = адзіны Бог + адзінаўладдзе князя.

№ 5 Язычніцтва.

№ 10 (II варыянт) арган; харавое песнапенне; знаменнага; васьмі; аднагалосага; тропы; Трыдэнцкі сабор; трапар; кандак; псалмы; канты; Богагласнікі.

## Тэма 9

№ 1 Народныя разныя календары.

№ 2 1) 354 + 11 = 365 сутак,

2) 30 × 8 = 240; 31 × 3 = 93; 240 + 93 + 28 = 361,

3) цотныя — з 30 дзён (акрамя лютага, у ім было 29 дзён), няцотныя — з 31 дня;

№ 3 Філатаймія: *philo* і *time* — любоў да часу.

## Тэма 10

№ 1

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 **А** | н | ё | л | | | | | | | |
| 2 **С** | а | н | | | | | | | | |
| 3 **В** | ы | р | а | т | а | в | а | н | н | е |
| 4 **Е** | в | а | н | г | е | л | л | е | | |
| 5 **Т** | р | а | п | е | з | н | а | я | | |
| 6 **Н** | а | б | а | т | | | | | | |
| 7 **І** | к | о | н | а | | | | | | |
| 8 **К** | а | п | л | і | ц | а | | | | |
| 9 **І** | к | а | н | а | п | і | с | | | |

№ 3 Кірыла.

№ 4 Малітвы, словы, павучэнні.

№ 7 Стоўпнік.

№ 9 Маці Боская Адзігітрыя Эфеская.

№ 10 Крыж Еўфрасінні.

№ 12 Працавіты.

### Тэма 11

№ 1

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1Х** | р | ы | с | ц | і | я | н | с | т | в | а |
| **2Р** | э | л | і | г | і | я | | | | | |
| **3А** | в | е | л | ь | | | | | | | |
| **4М** | а | р | ы | я | | | | | | | |

№ 2 Мудрасць.

№ 3 Для ўзмацнення і змякчэння гуку, паляпшэння акустыкі.

№ 4 Іаан.

№ 5 1) Сафійскі,
2) Спаса-Еўфрасіннеўская,
3) Каложская,
4) Благавешчанскі,
5) Тураўскі,
6) Ніжняя.

№ 6 Крыніца (источник).

№ 8 Каложская царква, Спаса-Еўфрасіннеўская царква, Сафійскі сабор.

№ 9 1) Благавешчанская царква,
2) Каложская царква,
3) Полацкая Сафія,
4) Спас Нерукатворны,

5) «Тайная вячэра»,
6) арган,
7) Барысаў камень,
7) збаны-галаснікі,
8) Тураўскі храм,
9) землятрус,
10) Спаса-Еўфрасіннеўская царква.

### Тэма 12

№ 1 Князь, Полацк.
№ 2 1) Рагвалод,
2) Ізяслаў,
3) пабудаваны ў г. Браславе,
4) пабудаваны Сафійскі сабор,
5) Усяслаў,
6) Андрэй Альгердавіч,
7) 1101 г.,
8) Барыс Усяславіч, шасціканцовы крыж, Барысавы камяні,
9) Усяслаў,
10) Барыс Усяславіч.

### Тэма 13

№ 7 Асілкі-волаты, абаронцы ўсходнеславянскіх зямель ад нашэсця ворагаў, ідэі патрыятызму і абароны Бацькаўшчыны, эпітэты, паўторы, кампазіцыя, рытміка.

### Тэма 14

№ 1 Белая Русь.
№ 2 Чыстая вада.

### Тэма 15

№ 2 Асоба жаночага полу (жаночы звычай павязваць на галаву белую хустку); купец, а таксама любы чужаземец; паляванне, у якім удзельнічае шмат людзей; маральныя і матэрыяльныя страты, пагроза жыццю і здароўю, іншая шкода асобе; даўжнікі феадалаў (ад слова купа — пазыка).

### Тэма 16

№ 2 Мініяцюра.

### Тэма 17

№ 1 1) Этнас,
2) торг,
3) надзел,
4) іканапіс,
5) чынш,
6) намеснік,
7) ы,
8) язычніцтва,
9) міф,
10) Евангелле,
11) народнасць,
12) шляхта,
13) архіепіскап,
14) сабор,
15) цэх,
16) ідал.

№ 2 Кітаб.

### Тэма 18

№ 1 Каталіцызм, праваслаўе.

№ 2 Царква, храм, епархія, суд.

№ 3 Божых, магчымае Богу, самадысцыпліны.

№ 4 Сутана, тыяра, мітра, піуска, берэт.

№ 5 Царква; мітраполія; ордэн; манастыр.

№ 10

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Г | А | Ю | І | В | Ц | Ь | Ы |
| А | Н | Р | Л | А | С | З | Н |
| Б | А | Е | Ь | Ц | В | А | П |
| Ж | Р | Ы | Ў | С | К | Й | Н |
| О | А | С | Т | А | Р | Д | А |
| Р | В | Б | Д | З | Ь | Ц | С |
| С | Т | Я | З | Е | Й | Н | А |

№ 11 Аспрэчвае факты пра святасць кандыдата на кананізацыю.

### Тэма 19

№ 1 Замкавая вежа.

№ 3 Кастэль.

№ 4

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| [1]Р | ы | [2]м | | | | | | | |
| | | у | | | | | [5]к | | |
| | | р | | [6]в | е | ж | а | | |
| | | о | | | | | м | | |
| [4]р | о | ў | | | | | е | | |
| | | к | | | [7]ц | | н | | |
| | [3]к | а | с | т | э | л | ь | | |
| | | | | | г | | | | |
| | | | | | л | | | | |
| | | | | [8]д | а | н | ж | о | н |

№ 5 1) Навагрудскі,
2) Камянецкая,
3) байніца,
4) роў,
5) Крэўскі,
6) брама,
7) Лідскі,
8) вежа,
9) мост,
10) галерэя.

### Тэма 20

№ 1 Гатычны.

### Тэма 21

№ 1 Касцюм.

№ 2 Кашуля.

№ 3 Кашуля.

№ 5 Тунікападобная льняная кашуля без швоў на плячах, якая не мела каўняра, але мела разрэз пасярэдзіне грудзіны, на шыі зашпільвалася на гузік або завязвалася стужкай, тасьмой; скураны, тканы, плецены або шаўковы пояс, да якога прымацоўваліся падвескі-амулеты.

№ 6 Прыналежнасць да пэўнага саслоўя; моц і багацце дзяржавы; колер тканіны, галаўны ўбор, каштоўныя ўпрыгажэнні.

№ 7 Футра гарнастаяў, рысей, куніц, лісіц, баброў, выдраў, собаляў і вавёрак.

№ 8 Белага, шэрага, чорнага, карычневага, рудога, жоўтага колераў.

№ 9 Вышыўка з выкарыстаннем чырвоных і чорных нітак; гладдзю і пятлёй у прыкрэп.

№ 11 Пояс, на які маглі падвешвацца ключы, невялікія нажы і амулеты.

№ 12 Бедны, хворы, пагарэлец; трэба было здымаць перад знатнымі людзьмі, духоўнымі асобамі, а таксама ўваходзячы ў дом, храм, залу суда.

№ 13 Чаравікі, мяшчане.

№ 14 У ВКЛ гараджане і сяляне насілі на поясе каліту — скураную сумачку, у якой захоўвалі грошы, розныя дробязі.

## Тэма 22

№ 1 Герб, герольд, геральдыка.

№ 2 Жоўты і белы колеры.

№ 3 Багародзіца, Ісус Хрыстос, святая Ганна з Маці Божай і Ісусам, святы апостал Пётр, святыя апосталы Пётр і Павел, святы архангел Міхаіл.

№ 5 Леў, воўк, алень, рысь.

№ 6 Улада, празорлівасць, мудрасць, сіла і адвага.

№ 7 Вуж.

## Тэма 23

№ 1 Дойлідства.

№ 3 Прымусілі пажары.

## Тэма 24

№ 1 Скульптар, замак.

№ 8 1-ы этап: Каляды; Купалле; Масленіца; Дзяды; Вялікдзень; Юр’я;
2-і этап: жур; кумыс; маца; аловак; кітабы; месяц;
3-і этап: Рагнеда; Кірыла Тураўскі; Еўфрасіння Полацкая; Лазар Богша; Алекса; Клімент Смаляціч;
5-ы этап: так; так; не; не; так; не.

# Спіс літаратуры

## Літаратура для педагога


**Тэмы 1, 2**

*Марзалюк, І. А.* Вобраз полацкай дзяржаўнасці ў беларускім гістарычным наратыве XIX — пачатку XX ст. / І. А. Марзалюк // Полацк у святле станаўлення гістарычных і нацыянальных форм беларускай дзяржаўнасці (IX—XX стст.) / Д. У. Дук [і інш.]. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2019. — С. 74—77.

*Марзалюк, І. А.* Магілёў у XII—XVIII стагоддзях : людзі і рэчы / І. А. Марзалюк. — Мінск : Веды, 1998. — 260 с.

*Марзалюк, І. А.* Людзі даўняй Беларусі : этнаканфесіянальныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X—XVII стст.) / І. А. Марзалюк. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. — 324 с.

*Марзалюк, І. А.* Міфы «адраджэнскай» гістарыяграфіі Беларусі / І. А. Марзалюк. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. — 172 с.

**Тэма 3**

Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. 6 клас. Хрэстаматыя : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / склад. С. М. Цемушаў. — Мінск : Народная асвета, 2012. — 200 с.

Легенды і паданні / склад. : М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэд. А. С. Фядосік. — 2-е выд., дап. і дапрац. — Мінск : Беларуская навука, 2005. — 552 с.

*Пашуто, В. Т.* Послания Гедимина / В. Т. Пашуто, И. В. Шталь. — Вильнюс : Минтис, 1966. — 197 с.

Полоцкие грамоты XIII — начала XVI в. / сост. А. Л. Хорошкевич. — М. : Институт истории АН СССР, 1977. — 226 с.

Хрестоматия по истории Беларуси : в 2 ч. / сост. Я. И. Трещенок [и др.] ; под науч. ред. К. М. Бондаренко. — Минск : БГУ, 2008. — Ч. 1 : С древнейших времен до 1917 г. — 623 с.

Хрестоматия по истории Белоруссии с древнейших времен до 1917 г. / сост. : А. П. Игнатенко, В. Н. Сидорцов. — Минск : БГУ, 1977. — 472 с.

Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст. / склад. А. І. Філімонаў. — Мінск : БДУ, 2004. — 122 с.

**Тэмы 4, 5**

Беларусь. Песня вереска древней земли (исторический путеводитель) / сост. С. М. Бурыгин. — М. : Вече, 2011. — 319 с.

Белоруссия в эпоху феодализма: в 3 т. / сост. З. Ю. Копысский. — Минск : Академия наук БССР, 1959. — Т. 1 : С древнейших времен до середины XVII в. — 515 с.

**Тэма 6**

*Караткевіч, У.* Хрыстос прызямліўся ў Гародні / У. Караткевіч. — Мінск : Ураджай, 1998. — 479 с.

*Кузняцоў, М. В.* Гартаванне спадчыны / М. В. Кузняцоў. — Мінск : Права і эканоміка, 2012. — 432 с.

*Ракава, Л. В.* Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава. — Мінск : Ураджай, 2000. — 111 с.

**Тэма 7**

*Чантурия, В. А.* Памятники и памятные места Беларуси / В. А. Чантурия, Ю. В. Чантурия. — Смоленск : Русич, 2010. — 416 с.

**Тэмы 8—10, 18**

Малітвы свяціцеля Кірыла, епіскапа Тураўскага. Помнік літаратуры XII стагоддзя / уклад., паслясл. М. А. Саскевіча ; грамад. аб'яд-не «Тураўскае навук.-даслед. т-ва». — Тураў, Мінск : Вучэб.-даслед. рэсп. унітар. прадпрыемства інтэлектуал. уласнасці, 2008. — 97 с.

*Марціновіч, А. А.* Зерне да зерня : гісторыя ў асобах / А. А. Марціновіч. — Мінск : Харвест, 2008. — 447 с.

*Марціновіч, А.* Святая Еўфрасіння / А. Марціновіч. — Мінск : Юнацтва, 1999. — 62 с.

*Яскевіч, А.* Падзвіжнікі і іх святыні. Духоўная культура старажытнай Беларусі / А. Яскевіч ; навук. рэд. : У. П. Вялічка, М. П. Касцюк. — Мінск : Полымя, 2001. — 368 с.

**Тэмы 11, 12**

Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2007. — Т. 2. — 792 с.

*Лабынцаў, Ю. А.* Старая казка Палесся : (Турава-Пінская зямля) / Ю. А. Лабынцаў ; прадм. Г. Каханоўскага. — Мінск : Полымя, 1993. — 144 с.

*Лысенко, П. Ф.* Материальная культура городов Туровской земли (X—XIII вв.) / П. Ф. Лысенко. — Минск : Беларуская навука, 2020. — 179 с.

*Черёмин, А. А.* Полоцкое княжество (IX—XIV вв.) / А. А. Черёмин. — Минск : Белорусский Дом печати, 2013. — 290 с.

*Чигринов, П. Г.* Белорусская история : научно-популярный очерк / П. Г. Чигринов. — Минск : Современная школа, 2010. — 919 с.

**Тэма 14**

*Дзмітрачкоў, П. Ф.* Аб паходжанні беларусаў, фарміраванні і развіцці беларускай народнасці / П. Ф. Дзмітрачкоў. — Магілёў : МДУ імя А. Куляшова, 1992. — 112 с.

*Загорульский, Э. М.* Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века / Э. М. Загорульский. — 2-е изд., доп. — Минск : Четыре четверти, 2014. — 529 с.

**Тэмы 15, 16**

Анталогія даўняй беларускай літаратуры : XI — першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; падрыхт. А. І. Богдан [і інш.] ; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. — 2-е выд., выпр. — Мінск : Беларуская навука, 2005. — 1015 с.

Беларуская літаратура X—XV стст. / уклад., прадм., камент., пераклад на беларус. мову і адаптацыя І. В. Саверчанкі. — Мінск : Беларуская навука, 2010. — 410 с.

*Лойка, А.* Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае / А. Лойка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. — 382 с.

Старажытная беларуская літаратура (XII—XVII стст.) / уклад., прадм., камент. І. Саверчанкі. — Мінск : Кнігазбор, 2007. — 608 с.

**Тэма 17**

*Ярмусік, Э. С.* Канфесіянальная гісторыя Беларусі / Э. С. Ярмусік. — Мінск : РІВШ, 2016. — 200 с.

**Тэмы 19, 20**

*Гладыщук, А. А.* Замок Берестейский / А. А. Гладыщук. — Гродно : ЮрСаПрынт, 2017. — Книга 1 : Русь. — 288 с.

*Ткачев, М. А.* Замки Беларуси / М. А. Ткачев. — Минск : Беларусь, 2002. — 200 с.

**Тэма 21**

*Бялявіна, В. М.* Жаночы касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007. — 351 с.

*Бялявіна, В. М.* Мужчынскі касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007. — 303 с.

**Тэма 22**

*Цітоў, А. К.* Геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. — Мінск : МФЦП, 2010. — 144 с.

**Тэма 23**

*Сергачев, С. А.* Народное зодчество Беларуси : история и современность / С. А. Сергачев. — Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2015. — 559 с.

*Цітоў, А.* Злотніцтва Беларусі. XII — пачатак XX ст. / А. Цітоў. — Мінск : Беларусь, 2020. — 271 с.

**Тэма 24**

*Масляніцына, І. А.* Беларусь далетапісная : гістарычныя нарысы / І. А. Масляніцына, М. К. Багадзяж. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 223 с.

*Масляніцына І. А.* Слава і няслаўе / І. А. Масляніцына, М. К. Багадзяж. — Мінск : Народная асвета, 1995. — 225 с.

*Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 7 т. / І. П. Шамякін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — Т. 7 : Вялікая княгіня. — С. 7—173.

**Літаратура для вучняў**

**Тэмы 1, 2**

*Буткевіч, В. У.* Мая Айчына : хрэстаматыя / В. У. Буткевіч, Н. Г. Вашна, А. У. Талкачова. — 2-е выд. — Мінск : Пачатковая школа, 2007. — 175 с.

Кніга для чытання па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI—XV стст.) / склад. Н. Я. Новік. — Мінск : ПаліБіг, 1999. — 175 с.

**Тэма 3**

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI—XV стст.) : дапам. для вучняў і педагогаў / склад.

С. К. Ганцова [і інш.] ; пад рэд. Г. В. Штыхава. — Мінск : Народная асвета, 1998. — 191 с.

**Тэма 6**

*Лаптев, Ю. П.* Рассказы о полезных растениях / Ю. П. Лаптев. — М. : Просвещение, 1982. — 80 с.

**Тэма 7**

*Жучкевич, В. А.* Происхождение географических названий Белоруссии / В. А. Жучкевич. — Минск : Белорусский государственный университет, 1961. — 80 с.

*Пракопчык, Л. Ц.* Адкуль у вёскі імя / Л. Ц. Пракопчык. — Мінск : Юнацтва, 1981. — 110 с.

**Тэмы 10, 12**

Асветнікі зямлі беларускай. X — пач. XX ст. : энцыкл. давед. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. — 490 с.

*Велько, А. В.* Рогнеда Рогволодовна : полоцкая княжна (Имя в истории Беларуси) / А. В. Велько. — Минск : Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2020. — 32 с.

*Тарасаў, С. В.* Еўфрасіння — Офрасіння — Афрасіння Полацкая. Яе час, яе крыж / С. В. Тарасаў. — Мінск : Цымбераў Р. М., 2021. — 368 с.

**Тэма 16**

*Агіевіч, У. У.* Імя і справа Скарыны : у чыіх руках спадчына / У. У. Агіевіч. — Мінск : Беларуская навука, 2002. — 319 с.

**Тэмы 19, 20**

Крепости Беларуси : для сред. и ст. шк. возраста / сост. : М. Г. Никитин, О. А. Черепковская, Л. В. Языкович. — Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2015. — 207 с.

**Тэма 23**

*Сахута, Я. М.* Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. — Мінск : Беларусь, 2011. — 367 с.

**Тэма 24**

*Жыгман, В.* Міндоўг : гістарычная хроніка / В. Жыгман. — Мінск, 2021. — 256 с.

*Малишевский, Н. Н.* Давыд Городенский. Герой и легенда / Н. Н. Малишевский. — Гродно : ЮрСаПринт, 2019. — 200 с.

*Татаринов, Ю. А.* По некоторым замечательным уголкам Беларуси / Ю. А. Татаринов. — Минск : Освея, 1995. — 200 с.

*Юрэвіч, В.* Горад-прывід на Палессі, або Абрысы старажытнага Турава / В. Юрэвіч. — Мінск : Кнігазбор, 2021. — 84 с.

## Змест

**Слова да педагагічных работнікаў** ........................ 3
Метады і прыёмы арганізацыі факультатыўных заняткаў ........................ 4

УВОДЗІНЫ

*Тэма 1.* Духоўная спадчына нашых продкаў — падмурак сучаснай Беларусі ........................ 20
*Тэма 2.* Чалавек — творца і носьбіт духоўнасці ........................ 31

*Раздзел I.*
ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ у IX — сярэдзіне XIII ст.

*Тэма 3.* Гістарычныя крыніцы аб духоўным жыцці насельніцтва Беларусі ў IX — сярэдзіне XIII ст. ... 38
*Тэма 4.* Чалавек і прырода ў духоўнай культуры насельніцтва беларускіх зямель ........................ 44
*Тэма 5.* Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва беларускіх зямель скрозь прызму духоўных традыцый ..... 51
*Тэма 6.* Правілы жыцця ў побыце беларусаў як адлюстраванне іх духоўных традыцый ........ 57

*Тэма 7.* Загадкі геаграфічных назваў Беларусі. Тапанімічная спадчына .................................... 66

*Тэма 8.* Хрысціянства — аснова духоўнай спадчыны Беларусі .................................... 74

*Тэма 9.* Чалавек і свет у хрысціянскай духоўнай спадчыне насельніцтва беларускіх зямель ....... 81

*Тэма 10.* Духоўны подзвіг першых беларускіх асветнікаў .................................... 87

*Тэма 11.* Першыя хрысціянскія храмы на беларускіх землях. Увасабленне духоўных традыцый беларусаў у архітэктуры .................................... 97

*Тэма 12.* Уклад полацкіх князёў у фарміраванне духоўнай спадчыны беларускага народа .......... 105

*Тэма 13.* Адлюстраванне духоўнага свету беларусаў у казках і былінах .................................... 113

*Раздзел II.*

ДУХОЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ
НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ
У ЧАСЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА
(сярэдзіна XIII ст. — 1569 г.)

*Тэма 14.* Паходжанне назвы Белая Русь ...................... 117

*Тэма 15.* Старабеларуская мова — дзяржаўная мова Вялікага Княства Літоўскага і складальнік духоўнай спадчыны беларусаў.................................... 121

*Тэма 16.* Мастацтва сярэдневяковай кнігі.................................... 125

*Тэма 17.* Культура этнічных меншасцей у ВКЛ ............ 129

*Тэма 18.* Уклад хрысціянскіх вернікаў у духоўную спадчыну беларусаў .................................... 136

*Тэма 19.* Раманскі стыль у замкавым будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі.............................. 143

*Тэма 20.* Гатычны стыль у царкоўным будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі.............................. 150

*Тэма 21.* Беларускі народны касцюм.............................. 155

*Тэма 22.* Геральдыка беларускіх гарадоў.............................. 162

*Тэма 23.* Беларускае народнае дойлідства як адлюстраванне духоўнага свету беларусаў..... 167

АБАГУЛЬНЯЮЧЫЯ ЗАНЯТКІ

*Тэма 24.* Захаванне гістарычнай памяці аб асобах і падзеях беларускай мінуўшчыны.................. 171

Ключы (адказы).............................................. 180

*Спіс літаратуры* .............................................. 190

Вучэбнае выданне

**Гаўрылавец** Людміла Уладзіміраўна
**Мязга** Мікалай Мікалаевіч
**Сымановіч** Таццяна Мікалаеўна

# ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ (IX ст. — 1569 г.)

Дапаможнік для педагагічных работнікаў
установ адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *І. М. Дабрыдзень*
Вокладка мастака *В. М. Горбач*
Мастацкі рэдактар *К. А. Тарасевіч*
Мастакі *Я. І. Архіпава, В. М. Горбач*
Камп’ютарная вёрстка *Я. І. Архіпавай*
Карэктары *Г. М. Мазіна, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 13.10.2023. Фармат 60×84 1/16.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,63.
Ул.-выд. арк. 8,5. Тыраж 2025 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Унітарнае паліграфічнае прадпрыемства «Віцебская абласная друкарня».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/19 ад 26.11.2013.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, 210015, г. Віцебск